[61] С. Некрасов, «*Мечты, мечты, где ваша сладость?*»..., с. 70.

[62] И. Берхин, *Прогулки с Котовским или из мениппеи снов не выкинешь*, http://pelevin.nov.ru/stati/o-cotovsky/1.html.

S T R E S Z C Z E N I E

Artykuł stanowi próbę analizy motywu poszukiwania wolności, sensu życia, pojawiającego się w wybranych utworach Wiktora Pielewina. Temat ten, zajmujący jedno z najistotniejszych miejsc w twórczości rosyjskiego pisarza, wiąże się bezpośrednio z charakterystyczną dla prozy postmodernistycznej zasadą negowania rzeczywistości, która przybiera formę duchowego eskapizmu, ucieczki od realności. Ten specyficzny duchowy eskapizm przyjmuje u Pielewina rozmaite postacie: ucieczki z jedynego znanego świata w nieznane, by zrozumieć sens życia w opowieści *Затворник и Шестипалый*; mistyczno-fantastycznego stanu bohatera-wilkołaka w opowiadaniu *Проблема верволка в Средней полосе*; ucieczki w kosmos jako symbol wewnętrznej wolności w powieści *Омон Ра*; czy ucieczki w chorobę umysłową w powieści *Чапаев и Пустота*. Bohaterowie wymienionych utworów dążą do uwolnienia się od skostniałych mechanizmów myślenia, do osiągnięcia stanu oświecenia. W. Pielewin przedstawia ich jako jednostki poszukujące swej tożsamości w nowej dla nich sytuacji polityczno-ekonomicznej.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Ала Петрушкевіч
Гродна

Шляхі ў паэзію Наталлі Арсенневай і Максіма Танка

Першы месяц восені – час іх прыходу ў гэты свет: Наталля Арсеннева нарадзілася 20-га верасня (1903), Максім Танк – 17-га (1912). Праз многія дзесяцігоддзі на Беларусі традыцыйна ўшаноўваецца ў гэтым месяцы толькі адно імя – Максіма Танка. А гэта азначае, што айчынная літаратура ўздымаецца да вяршыняў з дапамогай ўсяго аднаго крыла: творчасці беларускіх савецкіх пісьменнікаў. Тое ж магутнае, няхай нават параненае крыло – літаратурнае замежжа – усё ніяк не набярэ належнага ўзлёту на Бацькаўшчыне.

Постаці Наталлі Арсенневай і Максіма Танка пастаўлены поруч невыпадкова. Яшчэ з 30-ых гадоў гэтыя паэты сталі *паэтычнымі важакамі*[1] заходнебеларускай літаратуры. Максім Танк стаяў на чале яе актыўнай, дзейнай, змагарнай плыні, Наталля Арсеннева апявала высокую красу, *Багдановіча «ціхае каханьне»*, *пералучанае з рамансавага кантэксту ў патрыятычна-настальгічны*[2].

Ужо ад самага пачатку сваёй творчасці Наталля Арсеннева і Максім Танк па-рознаму асэнсоўвалі свой шлях. Так, запеўны верш да зборніка паэткі «Пад сінім небам» – гэта шлях-накірунак яе слова *Ад злых, няветлых песняў гора // ад змогаў шэрае зямлі // у неба сіню,*

---

[1] У. Калеснік, *Наталля Арсеннева: Віленскія гады*, "Літаратура і мастацтва", 1997, 9 снежня, с. 14.

[2] А. Адамовіч, *Натальля Арсеньнева "Між берагамі"*, (у:) *Арсеньнева Наталля, Між берагамі*. Выбар паэзіі. 1920–1970, Нью-Ёрк 1979, с. XXV.

у неба мора[3]. А Максім Танк у адным з першых вершаў «Песня» (1931) заклікае сваю паэзію: *Ляці ты туды, дзе звіняць яшчэ путы, ... // Дзе гора панує з няволяю лютай.*

Збліжае вершы матыў руху, лёту, палёту. Раз'ядноўваюць – накірунак (у Н. Арсенневай – да нябесных высяў, *у край бязь сьценяў*, у М. Танка – да зямных сцежак) і мэты (у М. Танка: *І ў сэрцах будзі ты надзеі жывыя; Змагацца за волю вядзі ўсіх бяздольных*; у Н. Арсенневай – да жыцця нязнанага, дзіўнага, жыцця-натхнення без слёз, турбот).

Асэнсаванне, чым ёсць іх творчасць, і надалей разводзіла паэтаў па розных шляхах:

Сонца вясьнянае ў золаце косаў,
срэбныя вербы на плёсах бялёсых,
восені зырка-чырвонай пажары,
ночныя зводы і ночныя чары... –
вершы мае[4].

У такіх вершах Наталлі Арсенневай даследчыкі адзначаюць *зменлівасць, складанасць колеравай палітры, лёгкую плыткасць або драматычную напружанасць святла*[5].

Вершы М. Танка "Мы яшчэ ўсіх шляхоў не апелі", "Эх вы, песні", "У маршы" – гэта песні гневу, болю, што гартуюць свае сілы да змагання:

Мы яшчэ ўсіх шляхоў не апелі,
Не змаглі з жыцця нашага плесняў,
І не ўсе навальніцы, мяцелі
Адзвінелі на струнах песняў[6].

Дарогі Наталлі Арсенневай і Максіма Танка перасякліся не толькі ў паэзіі, але і ў жыцці. Яны не маглі не сустрэцца. Упершыню гэта адбылося 21 снежня 1937 года на вечарыне, што ладзіла Беларускае навуковае таварыства. Гэтую дату падае Максім Танк у апублікаваным

[3] Н. Арсеньнева, *Між берагамі*, с. 27.

[4] Н. Арсеньнева, *Між берагамі*, с. 7.

[5] Л. Тарасюк, *Пад небам паэзіі: творчасць Н. Арсенневай 20–30-ых гг.*, "Полымя" 1995, № 6, с. 251.

[6] М. Танк, *Збор твораў у шасці тамах. Вершы. Паэмы 1930–1945*, Мінск 1978, т. 1, с. 50.

дзённіку “Лісткі календара”. Наталля Арсеннева ва ўспамінах сцвярджае, што была зіма 1935 года. Відавочна, што паэтка памылілася. Бо гэты ж год, 1937, падае і А. Адамовіч у прадмове ды выбранага “Між берагамі”. Ды і часопіс “Беларускі летапіс” азваўся на тую падзею, змясціў фотаздымак. Было гэта ў 1937 годзе.

Месца сустрэчы невыпадковае, знакавае – Вільня. Цэнтр заходнебеларускай культуры. Для Наталлі Арсенневай – улюбёны горад, калыска яе маленства, шляхі юнацтва, найсвятлейшая мроя ў далёкім заакіянскім жыцці. Для Максіма Танка Вільня гэтак жа блізкая, але – інакш: тут ён шукае і знаходзіць сваё, вясковае:

> Неяк хутка прывык я да Вільні. Можа таму, што вуліцы акраін, дзе я туляюся, мала чым адрозніваюцца ад вясковых. Летам тут можна сустрэць коней, кароў, коз, пачуць, як голасна пераклікаюцца пеўні, восенню гэтыя вуліцы пахнуць сенам, гароднінай, садавінай, зімой – бярозавым ды сасновым дымам з комінаў, а вясной – верхаводкай, капяжамі, балотам[7].

Сустрэча была не шэраговай. Пакінула след у душы і Наталлі Арсенневай, і Максіма Танка. У згаданых вышэй успамінах на эміграцыі паэтка пісала: *Чытала тут свае вершы. Ізноў цесна сутыкнулася з усімі старымі знаёмымі, пазнала новых. Максім Танк і ягоная творчасць зрабілі на мяне вялікае ўражанне*[8]. Лаканічна, але – не хаваючы пачуццяў.

Запіс, зроблены ў дзённіку Максіма Танка, даволі вялікі. Высока ацэньваючы творчасць Наталлі Арсенневай, паэт робіць гэта надта абачліва, з самага пачатку заяўляючы: *Агулам, я – не прыхільнік яе паэзіі...* Але мастак у змагарным Танку на нейкі момант бярэ верх, на задні план адыходзяць агаворкі і перад намі паўстае вельмі трапная характарыстыка творчасці паэткі: *...Некаторыя яе вершы, прачытаныя на гэтым вечары, мне спадабаліся сваім лірызмам, вобразнасцю. Трэба прызнаць, што са сваіх інтымных пачуццяў яна ўмее вязаць прыгожыя карункі. Зараз пасля доўгага маўчання яна перажывае нейкі стан прабуджэння*[9]. Заканчваецца ж запіс зусім іншым настроем. Малады паэт адназначна адмяжоўваецца ад Наталлі Арсенневай з-за ідэйных пераканняў. Стрыманасць пераходзіць у непрыязнасць, а то і варожасць: *Я заўважыў, што сярод прысутных было*

[7] М. Танк, *Лісткі календара*, Мінск 1970, с. 15.

[8] Н. Арсеннева, *Выбраныя творы*, Мінск 2002, с. 473.

[9] М. Танк, *Лісткі календара*, с. 123.

шмат сватоў, якім хацелася, каб паміж намі завязалася нейкая творчая дружба. Няўжо яны не бачаць, што мы – людзі рознага складу, розных поглядаў? Выпадкова сустрэліся і не ведаю, ці сустрэнемся больш калі[10].

Ніхто сёння пэўна не можа сказаць, ці не давялося Максіму Танку, рыхтуючы да друку свае дзённікі ў 1970 годзе, рэдагаваць запіс, пазначаны той датай. Бясспрэчна наступнае: калі б тут была толькі станоўчая ацэнка творчасці Наталлі Арсенневай, асобы, якую згадваць на той час наогул было небяспечна, то ці застаўся б гэты запіс у кнізе, выдадзенай на пачатку сямідзесятых?

Пра тое, што насамрэч прыхільнасць да Наталлі Арсенневай у паэта засталася, сведчыць многае. Неаднойчы ён будзе пазней апекавацца апальнай паэткай. Так, перад ейнай ссылкай у Казахстан менавіта Максім Танк дапамог ёй уладкавацца на працу ў Вялейцы ў рэдакцыю мясцовай "Сялянскай газеты", дзе колішняе знаёмства перарасло ў сяброўства: *Мы вельмі пасябравалі з Танкам і ягонай Любай*[11].

Разам з Максімам Танкам і Міхасём Машарам на пачатку сакавіка 1940 г. Наталля Арсеннева была запрошана ў Мінск на сустрэчу з сябрамі Саюза беларускіх пісьменнікаў. Самае запамінальнае ўражанне было і самым балючым: *Кучар зрабіў Танку цікавую заўвагу, калі мы раз ішлі Савецкай вуліцай*[12]. Слова "цікавую" тут відавочны эўфемізм. Хутчэй – недарэчную, незразумелую. Далей жа падаецца вельмі трапная, крыху з гумарам характарыстыка М. Танка: *Танк, вядома, як Танк, ішоў, смяяўся, голасна гаварыў па-беларуску, бо па-іншаму ён ці ўмеў*. Тут маецца на ўвазе не іншая мова, а звонкагалоссе, якога ў горадзе няпроста пазбыцца ўраджэнцу шырокіх лугоў і ніў. Пра тое Максім Танк таксама пісаў у "Лістках календара": *Вярнуўшыся ў Вільню, і я доўга не магу прывыкнуць да гарадской сцішанай гамонкі, якой толькі можна запоўніць невялічкі пакой, а не поле або гэты лес*[13].

Вось тое "цікавае" Кучарава: *"Не гаварыце так голасна па-беларуску, у нас гэта не прынята". І гэта ў сэрцы Беларусі – Менску!*[14] Заўвага ўспрынята Наталляй Арсенневай, беларускай паэткай, як абраза. А як гэта ўспрыняў Максім Танк? Хутчэй гэтак жа, але ў "Ліст-

[10] Тамсама.

[11] Н. Арсеннева, *Выбраныя творы*, с. 475.

[12] Тамсама.

[13] М. Танк, *Лісткі календара*, с. 19.

[14] Н. Арсеннева, *Выбраныя творы*, с. 475.

ках календара", тых, што выдадзены за савецкім часам, мы пра гэта не прачытаем.

Максім Танк быў адзіным, хто даслаў ссыльнай паэтцы ліст у Казахстан. Гэта быў надзвычай смелы ўчынак. Не адвярнуўся ад яе і па вяртанні: дапамог уладкавацца на працу ў рэдакцыі газеты ў Беластоку, знайсці кватэру. Ды і клопат пра вызваленне Наталлі Арсенневай з боку Максіма Танка, пэўна, быў не апошняй прычынай дзеля яе вяртання.

У сваім архіве паэт бярог фотаздымкі з той памятнай сустрэчы. Адзін з іх, дзе Максім Танк разам з Наталляй Арсенневай і Янкам Шутовічам на віленскай вуліцы, быў надрукаваны толькі ў 1993 годзе ў часопісе "Роднае слова". Іншаму фотаздымку, на якім толькі Наталля Арсеннева і Максім Танк (*Увесь вечар мы сядзелі побач. Гаспадар нават нас сфатаграфаваў*[15]), пашанцавала больш: ён быў надрукаваны ў часопісе "Беларускі летапіс". Якія шчырыя, адкрытыя ўсмешкі на іх дасканала прыгожых тварах. Усмешкі – не проста поза перад аб'ектывам. Відаць, нейкі дасціпны жарт рассмяшыў паэтаў.

Сустрэча стала працягам той дыскусіі, што ўжо пачалася між Наталляй Арсенневай і маладымі паэтамі. Пачатак ёй паклаў вядомы верш паэткі, які так і называўся "Маладым паэтам" і быў надрукаваны ў тым жа "Беларускім летапісе" (№ 1 за 1936 г.). Упершыню ў гэтым вершы сустракаем надзвычай натуральнае для лірыкі Наталлі Арсенневай параўнанне-пераўвасабленне лірычнай гераіні і восені – яе ўлюбёнай пары. Але не гэта тут галоўнае. Аўтарцы, відаць, патрэбна было (і сабе самой) вытлумачыць, чым ёсць яе паэзія, яе шлях. Нельга згадзіцца, што тут *прызнанне нейкай сваёй нявартасці*[16]. Хутчэй – сцверджанне, што краса – усюды, у кожнай найдрабнейшай, кволай былінцы, у кожнай праяве свету, што яшчэ не была ўбачана іншымі. Ідэя *стаю над жыццём* і сапраўды не ёсць *ключ да разуменя творчасці паэткі*[17]. Гэта, магчыма, погляд з пэўнай адлегласці на тых, што ішлі іншай дарогай. Як погляд восені на веснавое разводдзе. Але – не сыход са свайго шляху:

Нібы жоўтая восень,
стаю над жыццём
і гляджу на яго,
хоць навокал – змаганне.

[15] М. Танк, *Лісткі календара*, с. 123.

[16] Л. Тарасюк, *Пад небам паэзіі: творчасць Н. Арсенневай 20–30-ых гг.*, с. 257.

[17] Тамсама.

Мае вершы –
над сонным балотам трысьцё,
ймгла сівая асеньняга раньня[18].

Як справядліва адзначыў літаратуразнаўца Мікалай Мішчанчук, *Наталля Арсеннева вызначаецца найперш уменнем спаборнічаць у сваіх творах з іншымі творцамі, шукаць свае варыянты мастацкага рашэння праблемаў…*[19]. Можна дапоўніць: весці дыскусію шляхетна, ненавязліва сцвярджаючы сваё, але прымаючы і іншае.

Ужо ў той дзень, мяркуючы па запісу, Максім Танк вырашыў і сваю пазіцыю выказаць вершам: *Дарогі нашы разыходзяцца ў процілеглых напрамках. Відаць, калі буду нешта пісаць, і выкажу гэтую сваю думку*[20]. Верш быў напісаны даволі хутка, праз чатыры дні, 5 студзеня і пад назвай "Нашы шляхі", з прысвячэннем Наталлі Арсенневай быў змешчаны ў часопісе "Калоссе" (№ 1 (10) за 1937 г.). За савецкім часам гэты твор не друкаваўся. Нават у шасцітомны збор не ўвайшоў з-за крамольнага прысвячэння.

У цэнтры верша – вобраз шляхоў, дарогаў. Гэта лейтматыў не толькі многіх твораў паэта, але і дзённіка М. Танка. Аўтар неаднойчы раздумваў над сэнсам свайго шляху і ў жыцці, і ў творчасці. Да прыкладу, 29.07.1935 Максім Танк пісаў пра сваю неабыякавасць да розных літаратурных школаў. Надзвычай метафарычна характарызаваў паэзію Заходняй Беларусі: *Паэзія наша – цяжкая, як камень, вырваны з бруку пад час вулічных баёў, немілагучная – як стогн ці крык, чырвоная – як пралітая кроў. Іншай яна на сёння і не можа быць*[21].

Малады паэт быў надта катэгарычным. Да "нашай" ён, зразумела, ніяк не далучаў паэзію Наталлі Арсенневай, пяшчотную і далікатную, як лёгкія воблакі, прыгожую, як вытканыя рукою майстра карункі, мілагучную, як літанне да Творцы, сінюю, як бяздоннае неба, што адбіваецца ў вачах вясновых красак.

Максім Танк быў пэўны: ад уплыву розных літаратурных школаў яго ратуе *адчуванне галоўнага напрамку – дарогі*[22]. Што ляжала ў аснове гэтага шляху? На чым грунтавалася ўпэўненасць паэта ў сваёй

---

[18] Н. Арсеньнева, *Між берагамі*, с. 77–78.

[19] М. Мішчанчук, *"Між берагамі": Лёс і творчасць Наталлі Арсенневай*, "Роднае слова", 1993, № 1, с. 24.

[20] М. Танк, *Лісткі календара*, с. 123.

[21] Тамсама, с. 32.

[22] Тамсама.

перавазе? Як слушна сцвярджае Уладзімір Калеснік, гэта – *ідэал духоўнай перавагі ўдзельнікаў рэвалюцыйна-вызваленчага руху, ...якая давала пафас усёй яго творчасці*[23]. Эстэтычная вартасць паэзіі, бясспрэчна, прызнавалася, але ставілася не на пярэдні план. У іншай сваёй працы літаратуразнаўца пацвярджае тую ж думку: *Паэт верыць у сваю дарогу таму, што яна цяжкая, сумленная дарога пакут і барацьбы*[24].

Верш "Нашы шляхі" пачынаецца не па-танкаўску плаўнай, цягучай мелодыяй, ва ўлонні якое, аднак, пульсуюць непрымірымыя супярэчнасці: баявітае, імклівае, маршавае – "крок" і павольнае, расцягнутае, аморфнае, нежыццёвае – "шум трысьця":

> Нашы дарогі расходзяцца здаўна пад зорамі.
> На адной чуем крок, на другой – шум трысьця...[25]

Праз увесь верш – адмежаванне ад *сіратлівых сузор'яў* паэзіі Наталлі Арсенневай, сцверджанне сваёй праўды, сілы, дарогі. Часам паэт дазваляе сабе выпады не зусім справядлівыя:

> Любіш край за бярозы, за месяц, за восені дзіўныя,
> а тым больш яго нам як, скажы, ня любіць?
> калі нівы і рэкі, палотны азёр пераліўныя,
> калі песні, што б'юць жывой сілай крыніц, –
> нам гавораць аб долі сярмяжнай аратага...[26]

Праз гэтае "нам" Максім Танк як бы адлучае Наталлю Арсенневу не толькі ад ідэйных, але і духоўных арыенціраў, ад "натуральнай" беларушчыны з яе бедамі і трываннямі. Так, паэтка, узгадаваная ў гарадскім асяроддзі, у інтэлігентнай, матэрыяльна забяспечанай сям'і рускага вайскоўца, з дзяцінства і сапраўды была далёкай ад *долі сярмяжнай аратага*. Але ўсё гэта мінула з пачаткам вайны, бежанствам, беспрытульнасцю, сіроцтвам. На гэтым шляху спазнала сям'я будучай паэткі шмат пакутаў, стратаў. Праз гэта ўпершыню была далучана да жыцця беларускага сялянства: *Месяцы, пражытыя ў голадзе і холадзе, выйшлі мне на вялікую карысць. Справа ў тым, што тут я*

---

[23] У. Калеснік, *Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці*, Мінск 1981, с. 27.

[24] У. Калеснік, *Паэзія змагання: Максім Танк і заходнебеларуская літаратура*, Мінск, 1959, с. 219.

[25] Н. Арсеньнева, *Між берагамі*, с. XVII.

[26] Тамсама.

ўпершыню сутыкнулася... з беларускаю вёскаю і найчысцейшаю беларускаю моваю[27]. Сутыкнулася, каб стаць у будучым не проста паэткай, а паэткай беларускай. Таму зусім невыпадковым бачыцца ў яе творчасці вобраз беларускага селяніна з верша "Стары Сымон", створаны ў лепшых традыцыях нашаніўскай літаратуры. Згадаем вобразы з твораў Алаізы Пашкевіч: Мацея з апавядання "Прысяга над крывавымі разорамі", Сымона і Сцяпана з апавядання "Асеннія лісты".

Вобраз старога Сымона надзвычай блізкі і да вобразаў беларускіх сялян з вершаў Максіма Танка "Песня кулікоў" і "Спатканне". Той жа спакутаваны стары бацька, сын якога, *хоць нічога не зрабіў благога*, – у няволі. Але калі сыны ў вершах Максіма Танка у астрогах польскіх, то ў Наталлі Арсенневай – у савецкім ГУЛАГу: *у тайзе сьсякае з хвоямі жыцьцё*. Герой балюча перажывае новую (ужо каторую за немалы век!) акупацыю. Веры, што нямецкія ўлады здольны зрабіць шчаслівым гэты край, у старога Сымона няма. Ягоны клопат – клопат бацькі, земляроба: дачакацца сыноў, засеяць зямлю:

Ды дасі ж ты веры, каб штыхом ці куляй
хтось прынесьці шчасцьце або й волю мог?
Дось крыві старому,
і зямля-матуля
ня штыхоў чакае... Ёй карціць нарог[28].

Наталля Арсеннева і сама разумела, што ідзе па зусім іншым шляху. Гэтак пісала пра створаныя ў 30-ых гадах паэмы: *Злашчасная "Князёўна", якая столькі крыві папсавала Танку*[29]. На жаль, паэму гэту сёння прачытаць немагчыма: няма ні ў выдадзеным у Амерыцы выбары паэзіі, ні ў кнігазбораўскім выданні. Відавочна, ужо сама гераіня твора была недаспадобы маладому змагару Танку. Згадваючы пра іншыя дзве паэмы "Вяселле" і "Лілейкі", што зніклі без следу, паэтка адзначае: *Здаецца, што рэчы гэтыя не былі такія ўжо благія", і адзіны грэх за імі быў, што яны не ішлі крок у крок, маршам па халодным бетоне із сучаснасцю*[30]. Гэта разуменне можна аднесці і да ўсёй творчасці паэткі: не ішла маршам.

Поруч з змагарнымі матывамі, маршавымі інтанацыямі ў лірыцы Максіма Танка даверaснёўскай пары сустракаем радкі, напоўненыя

[27] Н. Арсеннева, *Выбраныя творы*, с. 467.
[28] Н. Арсеньнева, *Між берагамі*, с. 88.
[29] Н. Арсеннева, *Выбраныя творы*, с. 473.
[30] Тамсама.

глыбокім лірызмам. Ствараецца ўражанне, што ягоны герой, стомлены сваёй змагарнай дарогай, прыпыняецца на момант, каб заглыбіцца ў суладдзе прыроды, перадаць таямніцу спрадвечнай цішыні:

Ціха, так ціха – ні ветру, ні шуму...
Быццам лес белую думае думу[31].

Але ягоная дарога прымушае ўсё ж ісці далей і наперад:

Цяжка ісці, прыстаюць ужо ногі, –
Толькі мне нельга спачыць ля дарогі,
Нельга спыніцца ў дрымотным бары...
Трэба няспынна ісці да зары![32]

Гераіня Наталлі Арсенневай, наадварот, імкнецца да прыроднай гармоніі, здольна бясконца слухаць цішыню. Яе ўлюбёная пара сутак – *час маўклівы змяркання*. Пад знакам цішыні, маўчання адбываюцца несупынныя змены ў прыродзе, у настроі:

Сыплюцца з клёнаў лісты,
сыплюцца ціха, маўкліва,
крыюць зямлю і кусты
пражаю жоўтай, шасьцівай[33].

Адметны шлях Наталлі Арсенневай выбраны свядома, у яе – свая мэта: дакрануцца да суладдзя вечнай красы, адчуць і зразумець яе, растварыць у ёй свае душэўныя пакуты:

Я ішла... Ціхі месяц глядзеў з вышыны,
Рассыпаючы ласкі і сны.
І хоць прыкра ў той вечар балела душа,
Я глядзела у неба і йшла...[34]

Ёсць яшчэ адзін значны момант, які збліжае творчасць паэтаў: любоў да беларускага фальклору, наследаванне народнапесенных матываў, выкарыстанне фальклорных сюжэтаў. Творы часам нараджаліся ад запалых у душу гукаў народнай песні: *Аднекуль з'явілася мелодыя. Яна кужэльнай ніткай пацягнула за сабой вобразы, вобразы – рыфмы,*

[31] М. Танк, *Збор твораў у шасці тамах*, т. 1, с. 71.
[32] Тамсама.
[33] Н. Арсеньнева, *Між берагамі*, с. 19.
[34] Н. Арсеннева, *Выбраныя творы*, с. 45.

апошнія ляглі ў верш. А ўвесь гэты абвал выклікала мелодыя забытай матчынай песні...[35]. Вобраз кужэльнай ніткі, што сплывае з прасніцы разам з матчынай песняй – як жа сугучна гэта вершу Наталлі Арсенневай "Маці":

> Маці!
> За кужэльную нітку даўжэйшы твой смутак па нас,
> За кужэльную шэрую нітку з твайго калаўроту[36].

Шляхі Наталлі Арсенневай і Максіма Танка разышліся назаўсёды ў гады вайны. Тут будзе дарэчы слова Валянціна Тараса, мудрае, мужнае і шчырае:

> З таго часу прайшло шэсць з гакам дзесяцігоддзяў, і нельга, немагчыма для нармальнага чалавека жыць колішняй нянавісьцю, зацятай непрымірымасьцю да ўсіх тых суайчыньнікаў, якія ў гады вайны апынуліся на нямецкім баку, асабліва да паэтаў, пісьменьнікаў, мастакоў. Творы не нясуць адказнасьці за тыя ці іншыя ўчынкі аўтараў, творчасьць паэта, пісьменьніка, мастака ня можа быць закрэсьлена нейкім фактам ягонай біяграфіі ці нейкім адным творам. Літаратура, мастацтва, наагул культура непадзельная на "чыстыя" і "нячыстыя", на "наскія" і "нянаскія" – усе сапраўдныя творцы наскія! І Аркадзь Куляшоў, і Натальля Арсеньнева, і Максім Танк, і Ларыса Геніюш дзеці адной маці – Беларусі, усе любілі яе кожны па-свойму, усе, ідучы рознымі дарогамі, сышліся ў адным Доме – у Доме беларускай паэзіі. А сапраўдная паэзія не бывае ні савецкай, ні антысавецкай – яна проста Паэзія"[37].

Так, лёс развёў іх па розных дарогах. На розных кантынентах знайшлі свой прытулак Наталля Арсеннева і Максім Танк. Але свяціла ім адна і тая ж зорка – Паэзія, слугавалі яны аднаму Краю – Беларусі.

SUMMARY

In the article the creative and personal relations two most known Westbelorussian poets Natalla Arsiennieva and Maxim Tank are considered. The representatives of various directions in the literature which has been brought up in various social cultural conditions they by the creativity served one purposes – future of Belarus.

[35] М. Танк, *Лісткі календара*, с. 9.

[36] Н. Арсеньнева, *Між берагамі*, с. 180.

[37] В. Тарас, *Хлапчук са старога здымку*, "Дзеяслоў", 2005, № 15, с. 183.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Руслан Казлоўскі
Гродна

Празаічная мініяцюра ў творчасці Барыса Сачанкі

На сучасным этапе ўзрастае цікавасць беларускіх пісьменнікаў да такой формы мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, як мініяцюра ў прозе. Шырокія магчымасці ў скарыстанні мастацка-выяўленчых сродкаў эпасу і лірыкі, дапушчальнасць сумяшчэння прыёмаў празаічнага і вершаванага пісьма надаюць мініяцюры якасці рухомай жанравай формы, з дапамогаю якой мастаку слова ўдаецца адпаведна перадаць уласны ўнутраны свет, падаць погляд на рэчаіснасць, выявіць сваё разуменне харaства, гармоніі; мініяцюра з'яўляецца такой формай прозы, якая пакідае пісьменніку прастору для эксперыменту. Як вядома, жанравыя прыкметы пэўнага твора знаходзяцца ў шчыльнай лучнасці з ідэйна-сэнсавым зместам і крэатыўнымі магчымасцямі творцы. Нярэдка ідэя выражаецца нягледзячы на агульнапрынятыя формы, утварае новую сюжэтна-кампазіцыйную структуру, якой адшукаць адпаведнае месца ў тыпалогіі дастаткова складана. Творчасць таленавітага пісьменніка не заўсёды падпадае пад агульнапрынятую сістэму літаратурных "узораў", хаця творца і мае іх на ўвазе. Да такіх твораў і належаць разнастайныя мініяцюры і іх мадыфікацыі на жанравых сумежжах, а сумяшчэнне ў іх публіцыстычнага, філасофскага, дакументальнага, мастацкага, падкрэсленая суб'ектыўнасць, вольная кампазіцыя ўказваюць на эсэістычнасць твораў. Беларускія пісьменнікі тварылі ў той час, калі сама беларускасць як грамадска-культурная і гістарычная з'ява (а гэта было амаль заўсёды) вымушана была змагацца за сваё існаванне, і гэта патрабавала адкрытай размовы з чытачом, публіцыстычнасці, апелявання да фактаў гісторыі і грамадскай

думкі, літаратуры. Акрамя таго, лёгкасць эсэістыкі ў падачы матэрыялу, нярэдка размоўны стыль, магчымасць цытавання і вольнага разважання давалі магчымасць у творах выяўляць свабодна ўласную аўтарскую канцэпцыю. Цыклы і нізкі мініяцюр становяцца своеасаблівай формай эсэ (Янка Брыль, Барыс Сачанка і інш.).

Мініяцюра ў беларускай прозе з'явілася на пачатку XX стагоддзя на старонках "Нашай Нівы". Паступова цікавасць да празаічнай мініяцюры ў беларускай літаратуры ўзрастае, спробы ў гэтым жанры робіць Максім Багдановіч, у ім працуюць Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі, пазней (з другой паловы XX стагоддзя) Янка Брыль, Барыс Сачанка, Яўген Пархута, Фёдар Янкоўскі і многія іншыя; адбываецца зварот да твораў малой прозы і ў маладога пакалення пісьменнікаў, а таксама пачаткоўцаў. Празаічная мініяцюра – асобны жанр у беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзяў, які характарызуецца наступным комплексам устойлівых прыкмет, што з'яўляюцца дамінуючымі і вызначаюць фармальна-сутнасную арганізацыю мастацкіх твораў: невялікі аб'ём, свабодная кампазіцыя, бессюжэтнасць, суб'ектыўнасць, выразнасць мастацка-выяўленчых сродкаў пры моцнай насычанасці ідэйна-філасофскім зместам, а таксама спалучэнне асаблівасцяў эсэістычнага стылю. Паводле сэнсавых уласцівасцей у сваім змесце яна ўтрымлівае імгненны фрагмент (малюнак) рэчаіснасці, думкі. На працягу XX стагоддзя быў перыяд заняпаду жанру мініяцюры ў беларускай прозе (40–50-я гады), што тлумачыцца сацыяльным заказам на больш аб'ёмныя эпічныя формы. Толькі ў 60-я гады мініяцюра пачынае распаўсюджвацца і набываць моц у творчасці Б. Сачанкі і Я. Брыля.

Барыс Сачанка ў беларускай літаратуры сцвердзіў сябе менавіта ў гэты перыяд. Неардынарная асоба, у творах – свой, адрозны ад іншых погляд на рэчаіснасць. Жыццё не песціла пісьменніка. Дзяцінства прыпала на ваенныя гады, была спалена карнікамі родная вёска, высялена сям'я з родных мясцін на прымусовую працу ў Нямеччыну. Пастаянная пагроза жыццю, жахі вайны пакінулі глыбокі след у душы хлопчыка, стварылі падмурак для фармавання свайго светапогляду, глыбока гуманістычнага, калі жыццё нярэдка асэнсоўваецца як поле змагання дабра і зла і пазіцыя мастака слова павінна быць дакладна акрэсленай у дачыненні да таго, на чыім баку "змагацца". Ды і пасляваенныя гады не былі лёгкімі, нічога не давалася без вялікіх намаганняў. І вынікам роздуму, назіранняў стала проза пісьменніка, з'ява цікавая і шматгранная. У ёй прадстаўлены не толькі эсэ, аповесці, апавяданні ў традыцыйным разуменні, але і разнастайныя па сваіх

жанравых асаблівасцях мініяцюры, таксама абразкі і маленькія апавяданні, якія па форме набліжаюцца да мініяцюр, невялікія гумарыстычныя творы. Увага да малых празаічных жанраў можа быць у чымсьці звязана і з тым, што ў малых формах лягчэй "выліць" хуткаплыннае перажыванне ад успаміну, перадаць асобнае ўражанне, падаць пейзажную замалёўку, пранізаную лірычным пачуццём. Толькі ў Б. Сачанкі пачуццё гэтае нярэдка шчыльна яднаецца з трагічным.

Юры Бораў у кнізе "Эстэтыка" паказвае, што трагічнае як эстэтычная катэгорыя *раскрывае, па-першае, пагібель ці цяжкія пакуты індывідуальнасці; па-другое, неаднаўляльнасць для людзей яе страты; па-трэцяе, бессмяротныя грамадска цэлыя пачаткі, закладзеныя ў гэтай непаўторнай індывідуальнасці, і яе працяг у жыцці чалавецтва і, па-чацвёртае, грамадскі сэнс жыцця чалавека*[1]. У эстэтычнай канцэпцыі мініяцюр, ды і ў многім увогуле прозы Б. Сачанкі, катэгорыя трагічнага адлюстроўвае ўсе вышэй прыведзеныя пункты.

У сваіх творах Барыс Сачанка, мала сказаць, даследуе вайну, якая сваімі звышцяжкімі абставінамі вымушае чалавека дзейнічаць "з душы", без "падману", у адпаведнасці з уласным светапоглядам. Пісьменнік яшчэ раз даследуе самога сябе, праз уласную свядомасць прапускае падзеі мінуўшчыны. Нездарма яго "пісьмо" даследчыкі называюць суб'ектыўным, хаця адразу ж трэба заўважыць, што пры гэтым аўтар не губляе аб'ектыўнасці ў перадачы фактаў рэальнага жыцця. Прыгадаем меркаванне Валянціны Локун:

> Разнастайная "малая" проза Б. Сачанкі ў жанравых адносінах. Гэта – кароценькія апавяданні-сцэнкі ("Качалка", "Апошні раз"), у аснову іншых пакладзена канкрэтная бытавая замалёўка, выпадак з жыцця ці ўспаміны дзяцінства ("Сон", "Адведкі"). Можна знайсці мініяцюрныя навелы, пранізаныя светлым пачуццём смутку аб чымсьці нявыказаным і назаўсёды страчаным ("Букет бэзу", "Няўжо"), паданні ці былі, якія па сваёй пабудове, складу, сюжэтнаму дзеянню блізкія да былін ("Варэйка золата"), сямейныя хронікі, дзе ў сканцэнтраваным выглядзе адлюстравана жыццё сям'і на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў ("Новая хата"), псіхалагічныя мініяцюры ("Нарцысы", "Фашыст"), філасофскія замалёўкі ("Дарогі")[2].

І менавіта ў мініяцюрах найбольш выяўляецца асоба пісьменніка і тое трагічнае, што ў выглядзе цяжкіх малюнкаў-абразкоў "мільга-

[1] Ю. Б. Борев, *Эстетика*, Москва 1969, с. 75.

[2] В. І. Локун, *Да новых вышынь: Літаратурна-крытычныя артыкулы*, Мінск 1991, с. 135–136.

ціць" перад вачыма чытача, раскрываючы шырокую панараму жыцця, прапушчанага праз свядомасць аўтара.

Творам пра вайну, у прыватнасці мініяцюрам, характэрны некалькі скразных вобразаў, якія праходзяць праз усю Сачанкаву творчасць: лірычны герой-пакутнік, вораг-захопнік, партызан (салдат)-вызваляльнік і іншыя. Але вобразы гэтыя раскрываюцца не толькі ў пэўнай "сітуацыі", гэтаму дапамагае і аўтарскае разважанне, якое нярэдка ў канцы твора гучыць як мараль. Кампазіцыйная будова некаторых мініяцюр уяўляе сабою структуру з двух кампанентаў: сітуацыі (апісання) і разважання аўтара (лірычнага героя). Так, у псіхалагічнай мініяцюры "Фашыст" (1964) аўтар падзяляе твор на дзве часткі: у першай падае вобраз нямецкага салдата, які піша, як добры сын, сваёй маці кожны тыдзень лісты, гаворыць пра сваю любоў да яе. У другой частцы Б. Сачанка быццам "станоўчы" вобраз салдата дапаўняе зусім іншай інфармацыяй, пасля чаго той набывае пачварныя рысы: *Расстрэльваючы кожны дзень жанчын у партызанскім краі, куды ён быў камандзіраваны сваім вышэйшым начальствам, ён ні разу нават не падумаў, што гэтыя жанчыны – таксама маці...*[3] Яшчэ ў першай частцы сярод уяўнай станоўчасці вобраза фашыста аўтар у двукоссі прыводзіць словы з яго ліста "швайнэ русішэ" і "лібэ муці", якія гучаць эстэтычнымі антаганізмамі, падкрэсліваючы жорсткасць натуры з паказною дабрынёю і прыстойнасцю. Абодва выразы з лістоў стаяць на розных эстэтычных узроўнях, адпаведна нізкім і высокім, і ў выніку збліжэння высокае становіцца нізкім, яшчэ больш узмацняючы цынізм нямецкага салдата, які ўвабраў фашысцкую ідэалогію.

Падобную кампазіцыйную будову, з двух кампанентаў, маюць і іншыя малыя празаічныя творы Б. Сачанкі. Толькі кампаненты могуць уяўляць сабою яшчэ і розныя "пласты" катэгорыі часу, напрыклад: да вайны і пасля вайны. Так, у псіхалагічнай мініяцюры "Нарцысы" (1970) спачатку гаворыцца пра кветкі, падараныя "ёй" перад вайною на дзень нараджэння, іх незвычайна прыемны пах. І пасля вайны: *І хаця потым у яе было многа-многа дзён нараджэння – ужо без яго (ён так і не вярнуўся з вайны, загінуў смерцю храбрых пад Варшавай) – і ёй дарылі кветкі, сярод іх часта і нарцысы, яна заўсёды на сваіх імянінах адчувала пах тых, падараных некалі ім, кветак...*[4] Кветкі з іх пахам становяцца меркай вечнага, кахання, а значыць, меркай

[3] Б. Сачанка, *Дарогі: Выбранае*, Мінск 1971, с. 35.

[4] Тамсама, с. 39.

эстэтычнай катэгорыі прыгожага. Альбо, для прыкладу, кампазіцыйная будова мініяцюры "Конікі" (1969), якая адрозніваецца ад папярэдніх. Змест твора грунтуецца на перадачы гуку-звону конікаў, які застаўся на доўгія гады ў памяці, душы лірычнага героя пасля таго, як у час вайны бомба з нямецкага самалёта ўпала вельмі блізка каля яго і... не ўзарвалася. Але кошт жыцця вымяраецца некалькімі тымі імгненнямі пасля яе падзення, калі час прыпыніўся і толькі звінелі конікі. І звон гэты стаіць увушшу лірычнага героя заўсёды. У канцы твора, у якасці другога кампанента, кароткі абзац: *Каб вы толькі ведалі, як надакучыў, як абрыд мне гэты звон!..*[5] Заўважым, другі кампанент (частка) – гэта споведзь-выснова, які ўзмацняе эфект трагічнасці ў першым. Праз узважванне каштоўнасці жыцця пасродкам апісання надакучлівага гуку вымалёўваюцца абрысы асацыятыўнага вобразу вайны – са смерцю, бамбаваннем, і звычайнага чалавека на ёй, якому характэрна прага да жыцця, яго праяўленняў у прыродзе. Апасродкавана аўтар перадаў гэтым "гукам" штосьці тое, што пакідаецца нярэдка за "кадрам" батальных сцэнаў у мастацкіх творах, але яно застаецца ў душах і мучыць. Трагічнае і тэма вайны ў творах Б. Сачанкі становяцца непадзельным мастацка-эстэтычным комплексам.

Чалавек і вайна – гэта як жывая істота і трагедыя, у якой чалавеку давядзецца стаць дзейнай асобай. Адным з крытэрыяў вызначэння трагічнага ў Б. Сачанкі з'яўляецца немагчымасць героя паўплываць на абставіны, якія нясуць яму непамерныя страты, альбо немагчымасць асобы змяніць рэчаіснасць, паўплываць на падзеі, якія ўжо адбыліся праз ўласны недагляд. Так, у абразку "Мінутная слабасць" (1962) герой, узброены партызан, бачыць з дрэва ў лесе (гэта яго пост), як фашысты знішчаюць яго родную вёску з сям'ёю. Адчуванне немагчымасці паўплываць на падзеі, моцны стрэс, крайні душэўны пратэст прыводзяць да страты прытомнасці. *Увачу ў яго пацямнела... Болей ён нічога не помніць: як пакінула яго сіла волі, як апынуўся ён на зямлі з выкручанымі рукамі і зламанай нагой, як падабралі яго і занеслі ў лагер...*[6] У абразку "Качалка" (1962) у героя гіне дачушка. І трагізм сітуацыі заключаецца ў недальнабачнасці бацькі, які з лесу прынёс "блішчастую жалезную качалку" – хутчэй, нейкі боепрыпас, ад якога пасля загінула яго ж дзіця, усунуўшы гэты боепрыпас у печку, каб паварушыць дровы. Памылка бацькі выступае як нейкае злачынства,

[5] Тамсама, с. 40.

[6] Б. Сачанка, *Мінутная слабасць*, "Полымя" 1962, № 5, с. 109.

і пакараннем за яго становіцца самазабойства. Трагізм узмацняецца. Вайна пасля свайго сканчэння ўзяла яшчэ ахвяры. Але ахвяры былі не толькі фізічныя, але і маральныя, калі чалавек шкадуе мінулага, таго, што калісьці было ўпушчана з нейкіх меркаванняў, хай нават правільных, лагічных. Так, у абразку "Толькі гэта і засталося" (1962) дзяўчына яшчэ за год перад вайною збаялася фізічнай блізкасці з каханым хлопцам Жэнем, які адыходзіў на службу ў войска. Яна баялася – і гэта лагічна – не нарабіць "глупства". *Жэня ў вёску болей не вярнуўся – загінуў недзе пад Брэстам. Яна ж, пахадзіўшы гадоў дзесяць у перастарках, выйшла замуж за ўдаўца на трое дзяцей. І пасля, колькі ні ўспамінала Жэню, не магла дараваць сабе таго, што сказала ў тую парную чэрвеньскую ноч...*[7] А былі гэта словы: *Пашкадуй, не рабі глупства...*[8] Як бачна, вайна прымушае пераасэнсаваць паняцці: тое, што здавалася глупствам да вайны, пасля яе стала ўяўляцца вялікім дабром, нават шчасцем.

Даследчык Павел Навуменка сцвярджае, што старэйшаму пакаленню пісьменнікаў пашчасціла ў тым сэнсе, што вайна, удзельнікамі якой яны былі, давала ім гатовыя сюжэты для творчасці. У іншых пісьменнікаў (Барыса Сачанкі, Міхася Стральцова) яна прыпала на дзяцінства. Вочы дзіцяці ўспрымаюць усё эмацыянальна, без глыбокага досведу, аналізу. Даследчык ставіць рытарычнае пытанне: *Ці не адсюль у многіх пісьменнікаў гэтага пакалення відавочны выразны ўхіл у лірызацыю, у спробу стварыць перш за ўсё не сюжэты, а эмацыянальны малюнак?*[9] Адсюль можна патлумачыць узмоцнены трагізм у творах на ваенную тэматыку і неабходнасць скарыстання малых празаічных жанраў для выяўлення эмацыянальна афарбаваных рэалістычных малюнкаў ваеннай рэчаіснасці. Творы самі па сабе ўяўляюць закончаную літаратурную форму, а спалучаючыся ў нізкі, цыклы, могуць утвараць падабенства кінастужкі ўражанняў, перажыванняў чалавека на вайне, дзе кожны кадр – гэта асобны маленькі твор.

Суб'ектыўнасць прозы Б. Сачанкі праяўляецца не толькі ў "я" лірычнага героя і біяграфізме ў творах, але і асаблівасцях творчай манеры пісьма. Так, стылю празаічных мініяцюр характэрна ў рознай ступені экспрэсіўнасць, у тэксце няцяжка адчуць эмацыянальны настрой аўтара. Даследчыкі яго творчасці (Павел Навуменка, Уладзімір

[7] Б. Сачанка, *Толькі гэта і засталося*, "Полымя" 1962, № 5, с. 104.

[8] Б. Сачанка, *Мінутная слабасць*, с. 104.

[9] П. Навуменка, *Пошукі ўласнай сцяжыны: Штрыхі да творчасці Барыса Сачанкі*, "Роднае слова", 1996, № 5, с. 4.

Юрэвіч і інш.) заўважалі ўменне Б. Сачанкі карыстацца прыёмамі ўнутранага маналогу, дыялогу, максімальна скарыстоўваць у творах магчымасці няўласна-простай мовы і па-майстэрску ўплесці гэта ў тканіну апавядання альбо твора нейкай іншай малой празаічнай формы. Нярэдка творы гучаць спавядальна, асабліва тыя, у якіх элемент аўтабіяграфізму найбольш вялікі, бо чалавеку (лірычнаму герою), лёс якога не песціў, вельмі ўласцівы трагізм мыслення, характэрна частае паўтарэнне ў свядомасці найбольш яркіх сцэн з жыцця, выпадкаў, якія паўплывалі на светапогляд, прымусілі паглядзець на рэчаіснасць іншымі вачыма. А гэта шчыльна спалучаецца з такою якасцю прозы, як аналітызм, калі ў першую чаргу аналізуецца асоба чалавека, псіхалогія яго паводзін, матывацыя тых ці іншых учынкаў альбо эмоцый. У мініяцюрах разглядаецца, як правіла, нейкі адзін дробны, хаця і не вельмі звычайны, небудзённы выпадак, падзея, у якой героем рухаюць не толькі сілы вонкавага ўздзеяння, абставін, але і ўнутраная матывацыя, светапогляд.

Як у многіх іншых пісьменнікаў, хто пісаў мініяцюры (З. Бядулі, М. Гарэцкага і інш.), у Б. Сачанкі ёсць шэраг твораў, якія па сваіх жанравых асаблівасцях знаходзяцца на памежжы мініяцюры і абразка, абразка і невялікага апавядання. Друкаваліся такія творы (ды і самі мініяцюры) у часопісах часта пад рубрыкай “З новых апавяданняў” ці “Маленькія апавяданні”. Так, напрыклад, філасофская замалёўка “Дарогі” (“Маладосць” 1965, № 4) была змешчана пад рубрыкай “З новых апавяданняў”, хаця па сваіх мастацкіх асаблівасцях уяўляе сабою разгорнуты вобраз-пейзаж, у якім частка асацыятыўнага зместу падаецца ў выглядзе прамога філасофскага разважання лірычнага героя. Перад чытачом узнікае сэнсава напоўнены фактуальны фрагмент, у якім адсутнічае як знешні, так і ўнутраны сюжэт, сюжэт пачуццяў і думак, што дазваляе назваць гэты твор хутчэй філасофскай мініяцюрай, а не апавяданнем. У гэтую ж рубрыку патрапілі і творы, якія дакладна адпавядаюць традыцыйнаму разуменню апавядання. Трэба зазначыць, што адна з першых публікацый мініяцюр была зроблена Б. Сачанкам у часопісе “Маладосць” (1960, №8) пад рубрыкай “Мініятуры” і змяшчала два творы – “Кошык малін” і “Горад”.

Цыкл “Агарод” (1965) – гэта ўжо спроба падаць нізку алегарычных мініяцюр, кожная з якіх прысвечана пэўнай карыснай расліне, і праз вобраз “агарода” паказаць людзей і праяўленне іх характараў у грамадстве. Але аўтарская спроба стварэння ўласных алегорый не заўсёды была ўдалай, бо нярэдка вобразы, якія падаваліся ў творах, не маюць сталай іншасказальнасці ў народнай мове, падтэксту, як, да-

пусцім, у беларускай вуснай народнай творчасці: заяц – гэта носьбіт такой якасці, як баязлівасць, ліса – хітрасці і г.д. Алегорыі Б. Сачанкі ў гэтым цыкле ў пэўных выпадках больш знешнія, ад чаго губляецца адчуванне праўдзівасці вобразу, страчваецца частка яго значэння, за што аўтар крытыкаваўся ў свой час. *У гэтым цыкле ёсць сапраўдныя перлы*, – зазначае У. Юрэвіч, – *што пацвярджаюць імкненні пісьменніка да афарыстычнага мыслення ("Капуста", "Часнок", "Гарбузнік"). Але ж большасць з іх ніякага дачынення да алегорый не мае, бо ў канкрэтным апісанні асаблівасцей цыбуліны, якая есць вочы, ці кропу, які мае моцны пах, нічога іншасказальнага не чытаецца*[10].

У падзагалоўку кнігі "Ваўчыца з Чортавай Ямы", якая выйшла ў 1978 годзе, значыцца: аповесці і апавяданні, – хаця нельга не зазначыць, што ў ёй былі змешчаны і іншыя жанравыя формы малой прозы. Так, у цыкле "Зялёнае дрэва" мініяцюра займае пануючае становішча. Як правіла, гэта творы філасофскага зместу, роздум з выпадку. Аўтар разважае над сэнсам жыцця, пра час, як пра вялікую каштоўнасць, якую трэба ўмела скарыстоўваць, нічога не губляючы, падае сваё разуменне трагічнага і прыгожага (прыемнага, радаснага), якія нярэдка знаходзяцца побач і ўзаемадапаўняюць адно аднаго. Свае філасофскія разважанні аўтар падмацоўвае "наглядным" малюнкамі з жыцця, падае здарэнні, "карціны", з якіх і выводзіць свае разважанні.

Вялікую ўвагу ў цыкле "Зялёнае дрэва" аўтар надае роднай старонцы, хатцы, полю, лесу, паказвае іх незвычайнае прыцягненне. І дзе б ні быў чалавек, адусюль родная старонка рана ці позна пакліча да сябе. Гэтую думку Б. Сачанка праводзіць у мініяцюрах "Дома", "Наша радасць і шчасце", "Незабыўнае". *Не думаў тады я, не гадаў нават, што ўсяго праз некалькі гадоў, аб'ездзіўшы многія чужыя краі, пабачыўшы і моры, і горы, душа мая будзе рвацца зноў сюды, на гэтыя лугавыя і палявыя сцежачкі, дарожкі, у знаёмы мне змалку лес, у сваю такую ціхую, маленькую вёсачку*[11], – зазначае пісьменнік. Родная вёска, так званая малая радзіма, ставіцца Б. Сачанкам на самы высокі эстэтычны ўзровень.

Цыкл "Вясковыя згадкі" ў зборніку "Ваўчыца з Чортавай Ямы" – гэта шэраг замалёвак, аб'яднаных адным лірычным героем, яны прысвечаны роднай аўтару вёсцы і яе жыхарам. Тут можна ўбачыць сапраўдную галерэю лёсаў, складаных, нярэдка трагічных. Большасць

[10] У. Юрэвіч, *Абрысы. Выбраныя літаратурна-крытычныя артыкулы*, Мінск 1976, с. 291–292.

[11] Б. Сачанка, *Ваўчыца з Чортавай Ямы: Аповесці, апавяданні*, Мінск 1978, с. 238.

твораў больш падобныя да “разгорнутых” абразкоў, чым да такой формы, як апавяданне, бо ўяўляюць сабою кароткі “малюнак” лёсу чалавека, не проста біяграфію, а сутнасць жыцця альбо нават яго трагедыю (“Дзядзька Раман”). Іншыя творы – больш апісанні выпадкаў, здарэнняў з жыцця, але незвычайных: у іх выяўляецца сутнасць душы чалавека. Гэта маленькія ліра-эпічныя апавяданні ад імя героя (“Парахня”). У сукупнасці і тыя і другія складаюць хроніку духоўнага жыцця вёскі са сваімі праблемамі, радасцямі, здрадамі. У. Юрэвіч творы называе эцюдамі (“Сыночкі”, “Дубы”, “Парахня”) і слушна зазначае: *Мы ўжо не раз упэўніваліся ў тым, што Б. Сачанка выдатна валодае майстэрствам лаканічнай, сціснутай да максімуму мастацкай мовы. Герой быццам самастойна раскрываецца ў сваёй сутнасці, хаця і адчуваеш, што паблізу аўтар, які мае абавязак глянуць на ўсё сваімі вачыма*[12].

Кніга Б. Сачанкі “Родны кут” (1989) мае падзагаловак “Аповесці, апавяданні, нарыс, эсэ”. Але і тут Б. Сачанка не абышоў форму мініяцюры. У зборнік патрапілі творы, напісаныя не толькі ў сярэдзіне 80-х (“Беларускія ягады”, “Ворчык”, “Бяссонніца”), але і ў 60-я – 70-я гады (“Мінутная слабасць”, “За што?..”, “Воля”). Аўтар аддае даніну падзеям мінулай вайны, паказвае трагізм лёсаў людзей, якія патрапілі пад неапраўданыя рэпрэсіі камуністычнай дзяржаўнай сістэмы (“За што?..”).

Асобна стаіць у кнізе “Родны кут” цыкл “Думкі ўроссып”, які складаецца з філасофскіх мініяцюр, прысвечаных пісьменніцкай праблематыцы. Гэта роздум пра асаблівасці творчай працы, творчасці ўвогуле, натхненне і крызіс, роздум над лістамі і выказваннямі вядомых пісьменнікаў і інш. Так, напрыклад, Б. Сачанка піша: *Трагедыя таленту не ў тым, што яго надзяляюць “міленькай утульнай славай” (Акутагава), а хутчэй за ўсё, што ён пачынае верыць гэтай славе, жыць ёю, а то і купацца, як сыр у масле, у яе залацістых, але падманлівых, здрадлівых промнях*[13]. Гэтыя творы вызначаюцца высокай ступенню суб’ектыўнасці, разважлівым ходам, згушчанасцю аўтарскай думкі і нярэдка вельмі маленькім аб’ёмам (у некалькі радкоў). Трэба зазначыць, што ў 80-я гады падобныя асаблівасці мініяцюр, глыбокі філасофскі роздум у іх не былі новымі. Гэта характэрна і мініяцю-

[12] В. Юревич, *Испытание зрелостью. О современной белорусской литературе*, Москва 1981, с. 191.

[13] Б. Сачанка, *Родны кут: Аповесці, апавяданні, нарыс, эсэ*, Мінск 1989, с. 374–375.

рам Я. Брыля, які надаваў вялікую ўвагу праблемам пісьменніцкай працы, лёсам твораў і іх аўтараў, культуры ў яе агульначалавечым маштабе.

Кніга "Трэцяе вока" (1992) ў падзагалоўку падае "Аповесці, апавяданні, нарыс, эсэ". Цыкл "Запіскі аб радыяцыі" ў ёй – гэта хроніка падзей, якія адбыліся пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, хроніка, пададзеная ад адной асобы. І гэты храніст – яшчэ і дзейная асоба, якая перажывае, аналізуе, змагаецца, разважае. Кожная "запіска" – асобны маленькі празаічны твор філасофскага зместу, нярэдка з трох-шасці радкоў. Трагічнае тут набывае абрысы агульнанацыянальнай катастрофы, жахлівыя вынікі якой яшчэ да канца не даследаваны і выявяцца ў будучыні. Максімальна сціскаючы слоўны матэрыял, Б. Сачанка даў творы ёмкія ў сэнсавым плане, у малым паказаў вялікае, праз бяду асобнага чалавека – нацыянальную трагедыю. Вось, напрыклад, адна "запіска", у якой аўтар падае ўсяго адзін "маленькі" факт пра падзеі 1986 года: *Сустрэўся з тымі, хто пабываў на Першамайскія святы і ў Хойніках і ў Вялікім Боры. Усё там спакойна, ніякай трывогі. Сеюць, загараюць, п'юць малако, ядуць першую зеляніну – шчаўе, крапіву, цыбулю, часнок...*[14] І гэта адразу пасля аварыі на ЧАЭС! Такія творы набываюць публіцыстычны выкрывальны пафас, асабліва калі размова ідзе пра злачынныя факты замоўчвання наступстваў аварыі адказнымі службовымі асобамі высокага рангу, прадажнымі навукоўцамі. Аўтар у якасці фактычнага матэрыялу цытуе газеты, а пададзеныя дыялогі з людзьмі з забруджаных тэрыторый узмацняюць эфект трагічнасці – у іх адчуваюцца бездапаможнасць, неабароненасць чалавека перад бядой. У сувязі з гэтым сярод "запісак" вылучаюцца і пэўныя філасофскія роздумы над трагедыяй, і абразкі жахаў, звязаныя найперш канкрэтнымі фактамі. Тут сустракаюцца мініяцюры ў форме публіцыстычнага паведамлення, сацыяльна-бытавой замалёўкі, нават можна ўбачыць анекдатычны абразок, у якім мастак запісаў "чорны гумар" з Чарнобыльскай зоны. Многія творы маглі б паслужыць эскізамі для большых, сюжэтна разгалінаваных. Малы аб'ём мініяцюр і абразкоў як найлепш дазваляе ў сціслай форме перадаць кадр за кадрам паслячарнобыльскую "гісторыю" грамадства, толькі кожны такі факт з'яўляецца сам па сабе асобным высокамастацкім "здымкам", асобным творам слоўнага мастацтва.

---

[14] Б. Сачанка, *Трэцяе вока: Аповесці, апавяданні, эсэ*, Мінск 1992, с. 172.

Цыкл “Напісана пяром...” (датуецца 1989–1990 гг.) у кнізе “Трэцяе вока” – гэта шэраг філасофскіх мініяцюр, дзе аўтар разважае не проста пра лёсы людзей, але – пра беларускую гісторыю, культуру, мову, маральны грунт грамадства. Аўтар аналізуе прачытанае, убачанае. *...Цярністыя шляхі беларускага слова... І не толькі слова, а і ўсяго, што звязана з Беларуссю, яе мінулым...*[15] – сцвярджае Б. Сачанка, акумулюючы ў гэтых словах праблематыку ўсяго цыкла “Напісана пяром...”.

У Барыса Сачанкі былі таксама зборнікі гумарыстычных твораў “Вол-фігурыст” (1966) і “Халасцяк” (1969). Паводле жанравых асаблівасцей у іх, як зазначае Лідзія Савік, *можна заўважыць іранічную мініяцюру, казку, байку ў прозе, гумарэску, жарт, эпіграму*[16]. Цэлы цыкл твораў у зборніку “Халасцяк” аўтар назваў “Іранічнымі карацелькамі”, што само па сабе тоеснае паняццю іранічных мініяцюр, хаця сюды ўваходзяць творы даволі розныя па сваіх жанравых асаблівасцях: ад баек у прозе да маленькіх вершаваных твораў (нізка “Коўзкі Парнас”), якія больш адпавядаюць традыцыйнаму разуменню карацелькі ў паэзіі.

Барыс Сачанка да апошняга дня свайго не так ужо і доўгага жыцця быў верны сабе як пісьменніку і сваёй творчасці. У мініяцюрах, як і ў апавяданнях, ён сцвярджаў канцэпцыю Асобы, і не толькі праз вобразы герояў, але і праз уласнае “я”, лірычную танальнасць твораў. У ягонай творчасці вызначаюцца наступныя ўстойлівыя жанравыя разнавіднасці празаічных мініяцюр: псіхалагічная (“Нарцысы”), філасофская (“Сіла жыцця”), алегарычная (цыкл “Агарод”), “іранічная”, дакладней – алегарычна-іранічная, бо для абсалютнай большасці з іх характэрная алегарычная вобразнасць (у зборніках “Вол-фігурыст”, “Халасцяк”), публіцыстычная і філасофска-публіцыстычная (у цыкле “Запіскі аб радыяцыі”). Б.Сачанка працягнуў традыцыю празаічнай мініяцюры, зрабіў мініяцюру больш разнастайнай паводле тэматыкі, герояў, у творах падаў свой адрозны падыход да жыцця, сваю мерку чалавечых каштоўнасцяў.

---

[15] Тамсама, с. 393.

[16] Л. С. Савік, *Пад мірным небам бацькаўшчыны: Нарыс творчасці Барыса Сачанкі*, Мінск 1986, с. 23.

SUMMARY

The article discloses the peculiarities of the conceptual and philosophical content in Barys Sachanka's works of the small prose genre according to the aesthetic concept of artistic reflection of reality. It considers the main stylistic peculiarities of the minuatures, their figurativeness. Analysing B. Sachanka's work the article shows both the traditional forms characteristic of the small prose genre and the new one's with which the writer enriched the Belarusian literature.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Іаанна Голец
Беласток

Беларуская нацыянальная ідэя ў галоўнай кнізе Яна Баршчэўскага

(“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”)

Цяжкія сацыяльна-палітычныя ўмовы, у якіх аказаўся беларускі народ у XVII–XVIII стст., прычыніліся да заняпаду беларускай літаратурнай творчасці і ўсяе культуры. Мова трох Статутаў Вялікага Княства Літоўскага ўступае сваё законнае месца лаціне і пальшчызне. У 1696 годзе сейм увогуле прымае пастанову, якая забараняе карыстацца беларускай мовай у афіцыйнай перапісцы, у дзяржаўных установах. Спыняецца друкаванне кніг на беларускай мове. У апошняй чвэрці XVIII ст. у выніку трох падзелаў польскай дзяржавы беларускія землі былі далучаны да Расіі. Палітыка царызму адмаўляла не толькі дзяржаўную незалежнасць, але і культурна-этнічную самабытнасць беларусаў. Мікалай I, наклаўшы ў 1840 г. вета на дзеянне Статуту Вялікага Княства Літоўскага, увогуле забараняе карыстацца тэрмінам *Беларусь*, які ў 30–40-я гг. XIX ст. пачаў пашырацца як назва значнай часткі ВКЛ. Вызначаючы Беларусь як *Северо-Западные губернии*, царызм рабіў яе сваёй спаконвечнай уласнасцю, часткаю расійскай імперыі.

Аднак менавіта 30–40-я гг. XIX ст., як доказна сцвярджае Мікалай Хаўстовіч, уяўляюць сабой важны этап у станаўленні і развіцці новай беларускай літаратуры, фарміраванні новай мастацкай традыцыі[1]. Якраз у гэты час узнікае нацыянальная ідэя, можна сказаць, уласна

[1] М. В. Хаўстовіч, *Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст.*, Мінск 2001, с. 8.

абуджаецца з вымушанага летаргічнага сну. Вычуванне гістарычнай значнасці і высокага ўзроўню духоўнай спадчыны беларускага народа, пачуццё гонару за гэтае мінулае сталася пабуджальна-стваральным імпульсам на складаных шляхах нацыянальнага самавызначэння. Немагчыма пераацаніць тут грамадскую ролю літаратурнай творчасці. Перад пачынальнікамі новай беларускай літаратуры стаяла задача выяўлення асноватворных прынцыпаў ідэалогіі нацыянальнага быцця і трэба было вырашыць праблему стварэння літаратурнай мовы, сцвердзіць тэрытарыяльную цэласнасць, абудзіць павагу да слаўнай спадчыны беларускага народа.

Можна з поўным правам сказаць, што ў першай палове XIX ст. найбольш плённай у распрацоўцы беларускай нацыянальнай ідэі была літаратурная дзейнасць Яна Баршчэўскага. У гісторыі беларускай літаратуры ён вядомы як аўтар вершаў на беларускай мове *Гарэліца*, *Чым жа твая, дзеванька, галоўка занята* і *Рабункі мужыкоў*, напісаных Янам Баршчэўскім яшчэ студэнтам Полацкай езуіцкай акадэміі, якую ён закончыў у 1812 г. Пра папулярнасць апошняга верша сведчыць факт, што ў 1828 г. паэт-самавук Паўлюк Багрым чытаў у Крашыне яго напамяць. На жаль, не ўсе творы Яна Баршчэўскага дайшлі да нашага часу, невядомым з'яўляецца, напрыклад, лёс беларускамоўнай паэмы *Пояс Венеры*. Неспрыяльныя ўмовы для друкавання гэтых твораў прычыніліся да таго, што два першых з узгаданых раней вершаў пабачылі свет толькі ў 1843 г. у *Roczniku Literackim*, які выдаваў Рамуальд Падбярэскі. Іх суправаджалі ноты Антона Абрамовіча, якія сведчылі, што перад чытачом нібыта народныя песні. Выдавец не асмеліўся акцэнтавацца на беларускай літаратуры.

Аднак, відаць, усвядоміўшы, што чытацкую беларускамоўную аўдыторыю трэба яшчэ ствараць, Ян Баршчэўскі звярнуўся да творчасці на польскай мове, тагачаснай літаратурнай мове Беларусі. Важнае месца ў творчасці пісьменніка займаюць польскамоўныя творы суб'ектыўна-лірычнага плана, а таксама балады літаратурна-рамантычнага характару і балады, заснаваныя на беларускім фальклорным матэрыяле – народных легендах, паданнях. Удалечыні ад роднага краю, у Пецярбурзе пачаў Ян Баршчэўскі пісаць сваю галоўную кнігу *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* (Пецярбург, 1844–1846), якая стала вяршыняй не толькі яго творчасці, але і эстэтычна-мастацкаю з'яваю, значнасць якой выходзіць далёка за межы сваёй эпохі. Штогод выязджаў ён са сталіцы, каб вандраваць пешшу па родных мясцінах. Збіраў на Полаччыне, Віцебшчыне і Магілёўшчыне народныя паданні і легенды, каб апрацаваць іх у ма-

стацкай форме. Пісьменнік паставіў за мэту давесці ў сваіх творах, што народ, які мае такую багатую народную культуру, заслугоўвае лепшых адносінаў да сябе. Увага да народнай творчасці, збіранне яе, выкарыстанне ва ўласных творах – своеасаблівая мадэль развіцця беларускай свядомасці і беларускага прыгожага пісьменства ў перыяд фарміравання новай мастацкай традыцыі.

Рамуальд Падбярэскі ў артыкуле *Беларусь і Ян Баршчэўскі*, ўласна распачынаючы беларускае літаратуразнаўства, напісаў пра Яна Баршчэўскага, што гэта чалавек, *які глыбока разумее свой край у паэтычных адносінах і сваімі фантастычнымі апавяданнямі, заснаванымі на паданнях беларускага простага народа, пачынае заслугоўваць агульную ўвагу і займаць выключнае месца ў шэрагу пісьменнікаў*[2] гэтага часу.

Хоць *Шляхціц Завальня* напісаны на польскай мове, але, як трапна зазначыў сучаснік Яна Баршчэўскага Міхал Грабоўскі, у кожным слове кнігі гучыць беларускасць[3]. Доўгі час раскрыццё беларускіх нацыянальных рысаў у польскамоўнай літаратуры Беларусі стрымлівалася стэрэатыпным успрыманнем твораў паводле іх моўнай прыналежнасці. Пераломным у гэтым плане стала апошняе дзесяцігоддзе. Уладзімір Мархель найпершым з беларускіх гісторыкаў літаратуры так пераканаўча і паслядоўна давёў, што, *прытрымліваючыся канкрэтна-гістарычнага падыходу да мастацкай творчасці, нельга не ўлічваць таго, што нацыянальная прыналежнасць пісьменніка фіксуецца не толькі ў мове, але і ў мностве іншых кампанентаў твора*[4]. Беларуская моўная стыхія ў XIX ст. заставалася моваю ніжэйшых слаёў насельніцтва Беларусі. Ян Баршчэўскі свядома абірае для свайго галоўнага твора польскую мову. Ён зазначае ўжо на пачатку *Шляхціца Завальні*, што апавяданні, змешчаныя ў кнізе, пачуў ад людзей, якія карыстаюцца беларускай моваю. Так, *не кожны чытач зразумее беларускую мову, дык гэтыя народныя апавяданні, якія пачуў я з вуснаў простага люду, вырашыў (наколькі змагу) у даслоўным перакладзе напісаць па-польску*[5]. Гэтая кніга была адрасавана найперш адукаваным

[2] *Пачынальнікі*, Мінск 2003, с. 54.

[3] Цыт. па: *Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры*, Т. II, Мінск 1969, с. 38.

[4] У. І. Мархель, *Прысутнасць былога. Нарысы. Артыкулы. Эсэ*, Мінск 1997, с. 3.

[5] Я. Баршчэўскі, *Шляхціц Завальня або Беларусь у фанастычных апавяданнях* (пераклад М. Хаўстовіча), Мінск 1990, с. 26. (Далей спасылкі на гэтае выданне падаюцца ў дужках).

суайчыннікам Яна Баршчэўскага, якія страцілі нацыянальную свядомасць, выракліся роднай мовы.

Беларуская мова і творчасць павінны былі нанава адбыцца ў новай мастацка-эстэтычнай форме. Захавальнікам роднага слова ў той змрочны час заставаўся толькі народ, а формай зберажэння – фальклор. Выкарыстоўваючы элементы народнай творчасці, па словах Віктара Каваленкі, *літаратура паглыбляла народны погляд на жыццё, удасканальвала вобразныя ўяўленні згодна з традыцыйным ладам народнага мыслення. Як нацыянальная літаратура, яна шукала апоры, выкарыстоўваючы фальклор, у глыбінных і шырокіх асновах народнага жыцця*[6]. Васіль Барысенка слушна назваў зварот пісьменнікаў новай беларускай літаратуры да фальклору *абуджэннем нацыянальнай самасвядомасці народа*[7].

Адным з першапраходцаў у гісторыі новай беларускай літаратуры, апрача Яна Баршчэўскага, можна лічыць Яна Чачота, які ўводзіць фальклор (разам з моваю) ў літаратурны ўжытак сваіх сяброў філаматаў. Ян Чачот пісаў па-польску і па-беларуску. Захапіўшыся хараством народнае паэзіі і разумеючы, што найлепшы пераклад не можа перадаць у поўнай меры яе арыгінальнага прыгожства, ён стаў друкаваць народныя песні ў запісаным выглядзе, без перакладу. Гэта стала штуршком для напісання ўласных вершаў на беларускай мове. Станаўленню ўнутрана-эстэтычных прынцыпаў новай беларускай літаратуры садзейнічала развіццё творчасці пра беларускі край і яго насельнікаў, ствараемай на польскай мове выхадцамі з гэтай зямлі. Асаблівая ў гісторыі беларускай літаратуры роля і значэнне творчасці Адама Міцкевіча. Зараз ужо не выклікае сумненняў, што творчасць Адама Міцкевіча належыць адначасова дзвюм роднасным культурам. Зразумела, *польскай паводле мовы і агульнапольскай вызваленчай ідэі ў барацьбе з расійскім царызмам і беларускай – паводле асноўных матываў і вобразаў, а таксама літвінскага патрыятычнага пафасу*[8]. Беларускі фальклор творча трансфармаваўся ў рамантычных паэмах і баладах Адама Міцкевіча, і надаў ім мастацкую непаўторнасць. Ян Баршчэўскі пайшоў тым жа самым шляхам, што і Адам Міцкевіч,

[6] В. А. Каваленка, *Вытокі. Уплывы. Паскоранасць*, Мінск 1975, с. 17.

[7] В. В. Барысенка, *Францішак Багушэвіч і праблема рэалізма ў XIX ст.*, Мінск 1957, с. 20.

[8] Л. Тарасюк, *Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX–XX ст.*, Мінск 1999, с. 9.

каб паказаць космас беларуса, сцвердзіць ягоную годнасць, абудзіць гістарычную памяць. *Але*, – як заўважае Мікалай Хаўстовіч, – калі *Міцкевіч праз космас беларуса імкнуўся да агульначалавечых вышыняў духу, дык Я. Баршчэўскі, наадварот, канцэнтраваў сваю думку на рэгіянальным, не ўзнімаўся вышэй нацыянальнага*[9].

Ян Баршчэўскі ўбачыў у фальклоры дасканалую крыніцу ведаў пра беларускі народ. Ён зразумеў, што ў народнай традыцыі захоўваюцца спрадвечныя ісціны, разуменне беларускім народам дабра і зла, выяўляецца ментальнасць народа і ўрэшце – беларускі архетып. Менавіта ў асэнсаванні мінулага краіны ён знайшоў карані тых асноў, якія абумоўліваюць існаванне народа. Пісьменнік імкнецца абудзіць у суайчыннікаў гістарычную памяць. *Апавяданні старых пра розныя здарэнні ў народных іх аповесцях, якія перайшлі ад чалавека да чалавека са старадаўніх часоў, былі для мяне* – піша аўтар у *Нарысе Паўночнай Беларусі*, якім распачыные свой твор – *гісторыяй гэтае зямлі, характару і пачуццяў беларусаў* (11).

Своеасаблівай экспазіцыйнай часткай да ўсёй кнігі з'яўляецца згаданы раней *Нарыс Паўночнай Беларусі*. У *Нарысе* пісьменнік з любасцю расказвае аб духоўных каштоўнасцях беларускага народа, культуры, звычаях. Ён выяўляе свае пачуцці да Бацькаўшчыны, апісваючы прыроду, цудоўныя краявіды, дзе шырокія засеяныя палі, сасновыя або бярозавыя гаі, а паміж лясоў – саламяныя дахі бедных жыхароў. Падарожны можа сустрэць там каплічкі, парослыя імхом, раскіданыя па ваколіцы магільныя крыжы і камяні. Такую цішыню гэтай ваколіцы, паводле слоў аўтара, можа парушыць *толькі голас пастушка, стрэл паляўнічага ў лесе або вецер, які гойсае ў вяршынях пушчы* (12). Пісьменнік згадвае свае дзіцячыя гады і маладосць, успамінае родныя краявіды, якія цяпер пераносяць яго ў нейкі чарадзейны край – дзе яшчэ ў памяці жывуць міфалагічныя багі. Сярод іх Русалкі, якія спяваюць цудоўныя песні ў бярозавых гаях, Лясун – пан дзікіх пустэчаў, які змяняе свой выгляд і гуляе па лясах і лугах. Ён з'яўляецца апякуном звяроў і лясных птушак. У гэтай маляўнічай краіне і ноч Купалы поўная незвычайных здарэнняў; *на думку простага народа, уся прырода ў гэтую ноч весяліцца* (17). У лясах і на лугах растуць незвычайныя травы, у якіх дрэмле дзівосная сіла, напрыклад Пералёт-трава. Яна сімвалізуе пошукі беларусамі шчасця не асабістага, а шчасця для краю. Але яе вобраз, на думку Мікалая Хаўстовіча можна прачытваць інакш,

[9] М. В. Хаўстовіч, *Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст.*, с. 148.

як сімвал марнае надзеі, прывіда, што зводзіць чалавека з правільнага шляху[10]: *гонячыся за якой не адзін збіўся з дарогі і не вярнуўся да свае роднае хаты* (18). Такім чынам, Ян Баршчэўскі звяртае ўвагу чытача на духоўную і фактуальную крыніцу для яго апавяданняў.

Шляхціц Завальня – носіць форму аповяду, вядомага з даўніх часоў (*Тысяча і адна ноч*), форму арыгінальную ўласна для кожнай літаратуры. Аб чым засведчыў сам Ян Баршчэўскі: *я не пераймаю формаў, якія любілі пісьменнікі англійскія, нямецкія або французскія; лічу, што чужаземнае не будзе пасаваць негаваркому жыхару Беларусі. Узяў я форму з самой прыроды* (8). Як заўважыў Віктар Каваленка, *Ян Баршчэўскі піша літаратурную казку, нешта накшталт апавядання з умоўна-фантастычным сюжэтам і выразна надзённым гучаннем ідэі*[11]. Трэба падкрэсліць, што ў *Шляхціцы Завальні* нацыянальнай ідэі падпарадкаваны ўсе ўзроўні вобразнай і стылявой сістэмы твора.

Усе трыццаць восем частак кнігі (апавяданні-прытчы, устаўныя навелы, лірычныя адступленні ды ўспаміны) звязваюцца асобай слухача – пана Завальні, да якога завітваюць людзі, шукаючы начлегу ў час снежнай завеі ў яго хаце на беразе возера Нешчарда. Роля апавядальніка перадаецца па чарзе пісьменнікам розным асобам – сялянам, падарожным, шляхціцам, і нават цыгану. Такім чынам аўтар дае магчывасць чытачу пазнаёміцца з думкамі і настроямі розных сацыяльных слаёў насельніцтва Беларусі.

Госці шляхціца Завальні – пераважна людзі сталага ўзросту, прыгадваюць у 1816–1817 гг. падзеі з мінулага стагоддзя, а маладыя пераказваюць апавяданні, пачутыя ад іншых: *я нічога яшчэ не сустрэў у жыцці, але чуў колькі гісторый* (271). Мікалай Хаўстовіч заўважае, што ў творы Яна Баршчэўскага няма апісання рэальных падзей з вызначэннем дат, якія адбыліся ў мінулым, а паказаны дух пэўнага часу. Даследчык мае падставы, каб назваць гэта гістарызмам Яна Баршчэўскага: *Гэта міфалагічны гістарызм, гэта спроба вытлумачыць у форме рамантычна-прытчавых катэгорый пераломны момант у жыцці краю*[12] – далучэнне Беларусі да Расіі. Ян Баршчэўскі беларускую рэчаіснасць 60–70-х гг. XVIII ст. паказаў *праз прызму фальклорна-міфалагічных уяўленняў*[13] жыхароў гэтай краіны: сялян і шляхты.

[10] М. В. Хаўстовіч, *Мастацкі метад Яна Баршчэўскага*, Мінск 2003, с. 72.
[11] В. А. Каваленка, *Вытокі. Уплывы. Паскоранасць*, с. 89.
[12] М. В. Хаўстовіч, *Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст.*, с. 155.
[13] Тамсама, с. 155.

Такім чынам, напрыклад, апавяданне *Белая Сарока* можна разглядаць як спецыфічнае ўвасабленне падзей на беларускіх землях, як падрыхтоўку да падзелу Рэчы Паспалітай. У навеле аўтар адлюстраваў жыццё пры Кацярыне II, якая адыграла вялікую ролю ў анексіі ВКЛ. Ян Баршчэўскі паказаў беларусаў напярэдадні падзелу РП, назваў таксама прычыну таго, што родны край аказаўся пад уладай Расіі – менавіта змова беларускага грамадства з агрэсарам давяла да заняпаду краіны. Герой апавядання Скамароха пабратаўся з пасланцам Белае Сарокі і абавязаўся да таго, што знойдзе ахвотных землякоў, якія будуць ёй служыць. Ён заахвочваў такімі словамі: *Белая Сарока ахвяруе табе падарунак, каб быў верны сам і іншых знайшоў, адданых ёй* (188). Чакаючы ўзнагароды, дабраахвотна згаджаецца ён дапамагаць Кацярыне II. Паўночнай пані патрэбныя такія людзі як Скамароха, якія за мяшок золата без вялікіх намаганняў дапамогуць падпарадкаваць край. З'яўленне Белай Сарокі, яе намеры заняць увесь край, выклікае адпаведную рэакцыю Плачкі-Беларусі, якая заклікае суайчыннікаў да развагі: *яе голас наводзіў на ўсіх трывогу і смутак* (189). Белая Сарока прынесла зло найперш простаму народу, які прадбачыў яе намеры, але з-за здрады пануючага класа не мог перамагчы яго. Зло распаўсюджвалася на ўвесь край.

Пісьменнік актыўна карыстаўся алегорыяй, шматлікімі вобразамі-сімваламі. Дзякуючы ім выказана асноўная думка твора: Беларусь – гэта краіна, якая мае сваё мінулае, краіна, гісторыя якой была шчаслівейшая, чым сённяшні дзень, а жыхары яе павінны жыць паводле закону і звычаяў сваіх дзядоў, а не быць прыгнечанымі суседзямі і існаваць паводле іх традыцый. Пісьменнік лічыць, што беларусам хопіць успомніць сваю гісторыю, слаўных асоб, якія ваявалі за незалежнасць краіны, каб іх сэрцы напоўніліся мужнасцю і гонарам за продкаў. Гэта дасць ім сілу ісці сваім шляхам да лепшай будучыні, а не шляхам, падказаным суседнімі краінамі. Нацыянальная ідэя набірае сілу з гістарычнай спадчыны.

Сімвалам пакрыўджанай Беларусі, ідэйным стрыжнем твора Яна Баршчэўскага, што спалучае ўсе апавяданні-прытчы ў цэльную карціну нацыянальнага жыцця беларусаў з'яўляецца вобраз Плачкі. Просты народ з прычыны сваёй неадукаванасці, а шляхта і паны з-за свайго прыстасавальніцтва не могуць зразумець Плачку. У гэтым прычына яе слёз. Вочы Плачкі заўсёды напоўнены смуткам. Многія людзі чулі яе словы: *Няма каму даверыць таямніцу сэрца майго* (125), гэта абазначае, што няма яшчэ людзей у родным краі, па словах Віктара Каваленкі, *якія маглі б пранікнуцца вялікім пачуццём любві*

да яе[14]. Амаль забытая ўсімі Плачка-Беларусь мусіць пераапранацца ў сялянку, бо вышэйшы слой грамадства адвярнуўся ад яе, з пагардай глядзіць на сірату. Ад слёз Плачкі ўтварылася *крыніца жывой вады* (135) на версе Пачаноўскай гары. Народ гаварыў, што хто нап'ецца вады з гэтай крыніцы і пазнае Плачку, раней не ведаючы пра цуд, таму выпадзе роля народнага прарока, якому адкрыюцца ўсе таямніцы гэтага свету. Паны і шляхта не разумеюць значэння жывой вады, якая абудзіла б у іх нацыянальную самасвядомасць. Наадварот, яны звязваюцца з Чарнакніжнікамі, аддаюць сваю Бацькаўшчыну пад уладу Белай Сарокі. Аднак аўтар верыць у лепшую будучыню, паказваючы нацыянальна свядомых людзей, якіх пакуль адзінкі, але ёсць надзея на тое, што яны дапамогуць неразумнай шляхце і панам вярнуцца да сваіх каранёў.

Пісьменнік паказаў у творы лёс прыхільнікаў чарнакніжніка, якія былі ім спакушаны або змушаны па нейкіх прычынах карыстацца яго дапамогай. Ды дабро перамагае зло і лёс тых, хто парушае спаконвечныя маральна-этычныя законы, зазвычай трагічны. Ім наканавана смерць (Карпа з апавядання *Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем*) або яны змушаны перабірацца ў царства чарнакніжніка (пан Скамароха з апавядання *Белая Сарока*), іншыя пакутуюць за здраду (Альберт з апавядання *Вогненыя духі* ці Марка *Ваўкалак*). Як мяркуе Мікалай Хаўстовіч, пісьменнік перасцерагае сваіх землякоў, што не будзе шчаслівым той, хто паспрабуе здрадзіць Бацькаўшчыне, служэнне акупантам не прынясе карысці ні яму, ні народу: *хлеб калабаранта – горкі*[15]. Свае людзі – беларусы – дапамагаюць чужынцам апанаваць увесь край, змяніць лад жыцця. Пісьменнік, як усе рамантыкі, адмаўляе тыя грамадскія адносіны, якія, на яго думку, нясуць пагаршэнне ўмоў жыцця яго народу, разбураюць спрадвечныя ісціны, і тым самым – нацыянальны светапогляд, што можа давесці да знікнення беларускага народа ўвогуле.

Ян Баршчэўскі паказвае ў апавяданнях-прытчах таксама адмоўныя рысы характару і паводзін прадстаўнікоў з народа. Героем апавядання *Зухаватыя ўчынкі* з'яўляецца Васіль, які надзелены аўтарам рысамі, што спрыяюць адчужэнню ў грамадстве: злосцю, гультайствам і свавольствам. Варта ўзгадаць момант, калі Васіль сустрэўся з панам лесу: *я рады, што ў шатана добра каменем пацэліў, няхай*

[14] В. А. Каваленка, с. 84.

[15] М. В. Хаўстовіч, *Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст.*, с. 152.

не выганяе птушак і звяроў (50). Камень, кінуты ў Лесавіка паказвае на зухаватасць героя, якая наводзіць няшчасце на землякоў. Гэты ўчынак у алегарычным плане можна характарызаваць як выступленне супраць сваіх традыцый, беларускіх звычаяў і веры. Васіль не разумее, чаму Лесавік выганяе звяроў з лесу – не ведае спаконвечнага! А апякун жывёл ратуе іх ад пажару. Не разумеюць гэтага і іншыя людзі, якія хваляць яго ўчынак, і толькі адзінкі папярэджваюць: *выгараць тут лясы і пушчы, будзе паморак на жывёлу* (50). Усё багацце гэтага краю можа згінуць, не толькі прырода, але і народныя традыцыі, а ва ўсім вінаватыя суайчыннікі. Васіль з'яўляецца прадстаўніком асяроддзя, якое хоча палепшыць сваё жыццё, нягледзячы ні на што, атрымаць скарбы свету, хоць коштам душы. Ян Баршчэўскі добра ведаў тагачаснае беларускае грамадства і дзякуючы таму стварыў вобраз земляка-перараджэнца. Людзі становяцца абыякавымі да сваіх грамадзянскіх абавязкаў, а карыслівасць з'яўляецца галоўнай рысай характару часткі суайчыннікаў. Яны, ідучы на службу чарнакніжнікам (царызму), адварочваюцца ад сваёй Бацькаўшчыны, прадаюць яе.

У апавяданні *Валасы, якія крычаць на галаве* пісьменнік паказаў прычыны знішчэння гістарычнае памяці беларусаў. Галоўны герой Генрык па намове старца, які сімвалізуе ідэалогію царызму, зруйнаваў каплічку, каб выкарыстаць цэглу з яе на падмурак палацу. Таксама разбурыў могілкі, каб *на гэтым жа месцы пасеяць авёс, каб і знаку не было, што тут гніюць нечыя косці* (215). Старац ведае, што памяць аб мінулым можа быць перашкодай на шляху чарнакніжніка да апанавання беларускага краю. Вораг не прымае таксама Амелію, жонку Генрыка, у якой на галаве крычаць воласы. Жывыя яе воласы сімвалізуюць усё тое жывое, што яшчэ асталося ў народзе, яны крычаць і замінаюць старцу ў выкананні яго брутальных планаў. Выкарыстоўваючы прыхільнасць Генрыка, ён загадвае адрэзаць касу жонцы і тым самым прыцішыць голас народа, які вычувае небяспеку. Слугаванне чарнакніжніку сталася прычынай хваробы галоўнага героя, які пасля смерці Амеліі змяняецца. Цяпер ён ужо не абыякавы да праблем краю. Ягоная хвароба, па словах Мікалая Хаўстовіча, *гэта хвароба патрыятызму; гэта пачуццё любові да роднага краю*[16].

Свет, у якім жывуць героі Яна Баршчэўскага, прасякнуты злом, а ўсё, што добрае ў чалавеку, паводле герояў твора, выхоўваецца хрысціянскай верай і спрадвечнымі народнымі традыцыямі. Фантастычныя

[16] М. В. Хаўстовіч, *Мастацкі метад Яна Баршчэўскага*, с. 146.

апавяданні, якія расказваліся ў доме Завальні, нясуць маральную засцярогу і павучанне.

Варта падкрэсліць, што твор Яна Баршчэўскага мае сувязь з нацыянальным духам краю, г.зн., што *толькі адно ядро належыць простаму народу, увесь малюнак – фантазія аўтара, сатканая на аснове нацыянальных колераў*[17]. Жывая беларуская мова выяўляе беларускасць *Шляхціца Завальні*: *Рандар! Рандар! адчыні вароты; ахці, якая мяцеліца, саўсём перазяблі, і коні прысталі, чуць цягнуць!* (25). Гэтае выкарыстанне народнай гаворкі ў апавяданнях падарожных, мае істотнае значэнне ў паказе пісьменнікам рэальнасці сітуацыі. У творах Яна Баршчэўскага даўніна сутыкаецца з сучаснасцю, народная фантастыка – з рэальнымі прычынамі людскіх пакут і нядолі.

Пісьменнік ў галоўным сваім творы закранаў тэмы і праблемы, якія былі забароненымі ў гэты час, а менавіта паказ гістарычнага мінулага Беларусі і непрызнанне вынікаў падзелу РП (праз адмаўленне сучаснасці і ўзвышэнне мінулага), як заўважыў Мікола Хаўстовіч, а таксама сцвярджэнне права беларускага народу на незалежнасць (праз ідэю вяртання да Плачкі-Беларусі і гуртавання вакол яе). Ян Баршчэўскі ў неспрыяльных сацыяльна-палітычных умовах, калі забараняецца ўжываць тэрмін *Беларусь*, выносіць гэтую назву ў тытул свайго твора, што надае яшчэ большую нацыянальную афарбоўку твору. Беларусь ён апісвае ў фантастычных апавяданнях, *яна становіцца яго аб'ектам даследавання, аб'ектам ягонае любові і натхнення*[18]. Паводле слоў Рамуальда Падбярэскага, *місія пана Баршчэўскага не апошняя, ён адкрывае новы край, таму прычыняецца да развіцця і поступу думкі*[19]. Класік беларускай літаратуры Максім Гарэцкі ў першай гісторыі беларускай літаратуры падкрэсліваў, што ў *Шляхціцы Завальні* пісьменнік высвятліў беларускае жыццё, паказаў беларускі дух і беларускую душу народа[20]. Галоўным героем твора, як адзначае сам Ян Баршчэўскі ў своеасаблівай прадмове *Колькі слоў ад аўтара*, з'яўляецца Беларусь, якая сама апавядае пра свой лёс і пакуты: *Сірата штодзённа наракае на сваю нядолю, апавядае пра розныя пакуты, якія ён мусіў трываць на гэтым свеце, і яго скаргі на працягу ўсяго жыцця зліваюцца ў адну аповесць* (8).

---

[17] *Пачынальнікі*, с. 68.

[18] М. В. Хаўстовіч, *Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст.*, с. 153.

[19] *Пачынальнікі*, с. 70.

[20] М. І. Гарэцкі, *Гісторыя беларускае літаратуры*, Мінск 1992, с. 176.

Шляхціца Завальню Яна Баршчэўскага можна з поўным правам назваць гімнам Беларусі. Яскрава аўтар падае своеасаблівасці нацыянальнага характару беларуса, яго светапогляд, рысуе прыгажосць душы і паказвае драматычны лёс народа. Трагізм беларусаў як нацыі ў XIX ст. выявіўся, магчыма, найперш у тым, што народ гэты па выхаванню з'яўляўся беларускім, па адукацыі – польскім, а рускім – па службе. Увесь народ быў ахвярай бязладдзя таго часу, але сярод яго выраслі такія патрыёты Айчыны, як Ян Баршчэўскі, які знайшоў шлях да абуджэння нацыянальнай самасвядомасці.

S T R E S Z C Z E N I E

Przedstawiona jest analiza głównego utworu „Szlachcic Zawalnia albo Białoruś w fantastycznych opowiadaniach" Jana Barszczewskiego, jednego z głównych pisarzy, który zapoczątkował w XIX wieku nową białoruską tradycję literacką. Akcentuje uwagę na idei narodowej zawartej w jego książce, ukazane są podstawowe zręby ideowo-narodowościowe: problem języka, terytorialnej całości, szacunku do sławnej spuścizny narodu białoruskiego.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Анна Саковіч
Беласток

Некаторыя асаблівасці празаічных мініяцюр Яна Чыквіна

Малая лірычная проза набыла асаблівую папулярнасць сярод беларускіх літаратараў у XX стагоддзі. Мабыць, гэтая форма з яе разняволенай мастацкаю структураю, монацэнтрычнасцю выказвання найлепшым чынам адпавядае патрэбам і магчымасцям самавыяўлення творчай асобы ў супярэчлівы час сацыяльна-грамадскіх катаклізмаў, сусветных войн, навукова-тэхнічнага прагрэсу з яго непрадказальнымі, нечаканымі, часта трагічнымі наступствамі.

З'яўленне празаічнай мініяцюры або "верша ў прозе" спачатку ў рускай літаратуры, а затым і ў беларускай, звязваецца з агульнаеўрапейскай практыкай перакладу лірычных вершаў прозай. У французскай традыцыі пачынальнікам гэтай формы малой літаратуры прынята лічыць Эварыста Парні, які пасля наведання Мадагаскара напісаў вершы ў прозе, змешчаныя ў кнізе *Мадэгаскія песні* (1787). Увогуле ж у французскай літаратуры XIX стагоддзя заўважаецца шмат прыхільнікаў гэтай формы: гэта і Алоізіюс Бяртран (*Гаспар з цемры* 1842), і Шарль Бадлер (*Парыжскі сплін* 1869), і Арцюр Рэмбо (*Азарэнні, Сезон у пекле* 1872–1873), якога прынята лічыць французскім класікам новага жанру. Рускі пісьменнік Іван Сяргеевіч Тургенеў, які шмат гадоў пражыў у Францыі, відаць, менавіта пад уплывам заходнееўрапейскай традыцыі напісаў вершы ў прозе *Senilia* (*Старческое*). Якраз ён лічыцца пачынальнікам і майстрам гэтага жанру ў рускай літаратуры XIX стагоддзя. Цікава, што вызначэнне жанру, які замацаваўся за стракатымі па складу мініяцюрамі ў прозе Тургенева – малымі апавяданнейкамі, лірычнымі замалёўкамі, драматычнымі

сцэнкамі – са згоды пісьменніка даў выдавец часопіса "Вестник Европы", якому Тургенеў даслаў гэтыя свае творы з Францыі напачатку 1880-х гадоў пазамінулага стагоддзя.

У беларускай літаратуры першаю і вельмі ўдалаю спробай, можна сказаць, узорам для наступнікаў у гэтай творчай сферы сталі *Абразкі* Змітрака Бядулі (1913 год), аднаго з выдатнейшых пачынальнікаў навейшай беларускай літаратуры. Пісьменнікам з чулай і паэтычнай душой назваў яго Максім Багдановіч. Вядомая даследчыца творчасці З. Бядулі Зоя Мельнікава падкрэслівае, што *"Абразкі" – гарманічныя і натуральныя для экспрэсіўна-рамантычнага стылю ранняй творчасці Бядулі і ўсёй маладой беларускай літаратуры*[1]. Тым жа пачаткам, які аб'ядноўвае розныя па змесце лірычныя імпрэсіі, стала цэласная сістэма філасофска-эстэтычных поглядаў асобы, *якая пакутуе ад дысанансаў жыцця, але настойліва шукае гармонію і шчасце ў гэтым няўтульным свеце*[2].

Адным з заснавальнікаў традыцыі беларускай празаічнай мініяцюры з'яўляецца Максім Гарэцкі. Кароткая, малая лірычная форма была актуальнаю для пісьменніка на працягу ўсяго яго творчага шляху: ад мініяцюр ранняй пары *Буйніцы і драбніцы, Усё мінаецца, Стогны душы* да цыклу *Сібірскія абразкі*, *Люстрадзёна* і ўрэшце *Скарбаў жыцця*, *Лявоніуса Задуменкуса*, *Кіпарысаў* у апошні трагічны жыццёвы перыяд. Міхась Мушынскі слушна адзначае:

> У *Скарбах...* Максіма Гарэцкага шмат ад філасофскай прытчы, ад алегорыі, ад шчырай пісьменніцкай споведзі, усхваляванага мастакоўскага маналогу, ад жанру прарочага казання, прадбачання, якім чалавек пачынае валодаць у экстрэмальнай, пагранічнай сітуацыі, у хвіліны асабліва напружанага інтэлектуальнага жыцця. Менавіта ў такім крытычным становішчы і аказаўся на пачатку 30-х гадоў М. Гарэцкі[3].

Скарбы жыцця Максіма Гарэцкага пісаліся ў 1932–1935 гадах, а пабачылі свет толькі напрыканцы XX стагоддзя. Яны засведчылі, што традыцыя беларускай лірычнай прозы не занікала і ў варожых чалавечай душы сацыяльна-грамадскіх абставінах. Хоць, зразумела, вельмі шкада, што гэтыя творы не маглі доўгі час аказваць уплыў на літаратурны працэс, як і ўся "рэпрасаваная" творчасць М. Гарэцкага.

---

[1] З. П. Мельнікава, *"На горне душы..." Творчасць Змітрака Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя*, Брэст 2001, с. 40.

[2] Тамсама.

[3] *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя ў чатырох тамах*, Мінск 1999, т. I, с. 423.

Найбольш вопытным майстрам жанру лірычнай прозы ў сучаснай беларускай літаратуры з'яўляецца Янка Брыль[4]. Аўтар адзінага ў беларускай літаратуры лірычнага рамана такога кшталту *Птушкі і гнёзды* (1964), выдатны майстар апавядання пачынае з 70-х гадоў мінулага стагоддзя аддаваць выразную перавагу жанру лірычнай мініяцюры. Алесь Яскевіч пранікліва заўважыў, што літаратурная грамадскасць разглядала спачатку лірычныя запісы Я. Брыля як дапаможны матэрыял да вялікага эпічнага палатна аб сучаснасці.

> Але ў плане творчым форма замалёвак непасрэдных уражанняў з натуры, іх сузіральна-лірычнага перажывання, паводле назапашвання пісьменніцкага вопыту патрабавала ўмацоўвання ў сваіх жанравых правах. І думаецца, што гэтай улюбёнай празаікам форме лірычнага самавыяўлення, якую аўтар не іначыць ужо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, наканавана сцвердзіцца ў нашай прозе самастойнай жанравай разнавіднасцю[5].

З поўным правам можна канстатаваць, што мініяцюра Я. Брыля заняла сваё вартае месца ў жанравай структуры беларускага прыгожага пісьменства, стала пэўным узорам, эталонам для прадстаўнікоў наступных творчых пакаленняў. Больш таго, разглядаецца як *цэлы этап эвалюцыі жанравых асаблівасцей і мастацкіх магчымасцей малых празаічных твораў*[6].

Мініяцюра як жанр месціцца на памежжы лірыкі і эпікі, што, пэўна ж, дадаткова ўзбагачае яго вобразна-выяўленчую сістэму. І адначасова, зразумела, ускладняецца ягоная жанравая характарыстыка: вельмі цяжка ўлічыць шматстайныя аспекты гэтай літаратурнай формы, якая *принадлежит словно бы двум культурам и традициям – стихотворной и прозаической – одновременно, поэтому может использовать приемы, мотивы, сюжэты и образы стихов и прозы, порой причудливо и прихотливо монтируя их в рамках одного произведения или цикла. Характерно, что стихотворения в прозе обычно пишутся и печатаются именно циклами или целыми книгами*[7]. Бясспрэчна, сваім

---

[4] Я. Брыль, *Жменя сонечных промняў* 1965, *Вітражы* 1972, *Свае старонкі* 1951 1979, *Сёння і памяць* 1985, *Пішу як жыву* 1994, *Вячэрняе* 1994 і інш.

[5] А. С. Яскевіч, *Ритмическая организация художественного текста*, Минск 1991, с. 123.

[6] Р. К. Казлоўскі, *Беларуская празаічная мініяцюра XX стагоддзя*. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук, Мінск 2002, с. 3.

[7] Ю. Орлицкий, *Стих и проза в русской литературе*, Москва 2002, с. 221.

знешнім выглядам лірычная мініяцюра напамінае асаблівага роду прозу, лірычным жа сваім бокам набліжаецца да белага верша або верлібра, якому ўласціва схільнасць да філасафічнасці, унутранай напружанасці, вобразнай структурнай скандэнсаванасці, асацыятыўнасці. Таму, напрыклад, верлібр Максіма Багдановіча *Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы* (1915), як і яго ж апавяданні *Музыка* (1907) і *Апокрыф* (1913), некаторыя даследчыкі лічаць набліжанымі да лірычнай мініяцюры.

Бясспрэчнай увагі заслугоўвае тут лапідарная характарыстыка складанай жанравай формы, зробленая Русланам Казлоўскім:

> Празаічная мініяцюра – асобны жанр у беларускай літаратуры XX стагоддзя, які характарызуецца наступным комплексам устойлівых прыкмет, што з'яўляюцца дамінуючымі і вызначаюць фармальна-сутнасную арганізацыю мастацкіх твораў: невялікі аб'ём, свабодная кампазіцыя, бессюжэтнасць, суб'ектыўнасць, выразнасць мастацка-выяўленчых сродкаў пры моцнай насычанасці ідэйна-філасофскім зместам, а таксама спалучэнне асаблівасцей эсэістычнага стылю. Паводле сэнсавых уласцівасей у сваім змесце ўтрымлівае імгненны фрагмент (малюнак) рэчаіснасці, думкі[8].

На тое, што не заўсёды ўдаецца дакладна вызначыць жанр твора, мяжу паміж мініяцюрай і кароткай эсэістыкай, звяртае ўвагу і Ганна Кісліцына:

> Невялікі аб'ём, канкрэтная тэма, суб'ектыўнасць, вольная кампазіцыя, схільнасць да парадоксаў, арыентацыя на размоўную мову – гэтыя і іншыя прыкметы эсэістыкі адначасова з'яўляюцца вызначальнымі і для лірычнай мініяцюры, паняцця, якое традыцыйна ўжываецца ў беларускай літаратуры замест запазычанага – эсэ[9].

Для жанру мініяцюры ўласціва, каб аповед вёўся пісьменнікам ад першай асобы. Хоць, трэба заўважыць, што гэта не абавязковае запатрабаванне, чаму класічным прыкладам вершы ў прозе І. С. Тургенева.

Аб пашырэнні аб'ёму паняцця мініяцюра сведчыць той факт, што сярод твораў, якія адносяцца да гэтага ж жанру, можна ўбачыць розныя мінімальныя формы: паэтычную рэфлексію ў прозе, прытчу, дыялог, імпрэсію, версет, абразок, лірычную замалёўку, кароткія

---

[8] Р. К. Казлоўскі, *Беларуская празаічная мініяцюра XX стагоддзя*, с. 3.

[9] Г. М. Кісліцына, *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*, Мінск 2000, с. 27.

дзённікавыя запісы, аб'яднаныя ў цыклы, алегорыю і г. д. Усё гэта сведчыць аб вялікіх патэнцыях мініяцюры, дзе паэт–пісьменнік можа ў сваіх выказванннях вызваліцца ад традыцыйных законаў вершаскладання, якія канкрэтнымі патрабаваннямі да формы абмяжоўваюць яго творчае самавыяўленне.

Творчасць Яна Чыквіна як аўтара паэтычных зборнікаў *Іду* (1969), *Святая студня* (1970), *Неспакой* (1977), *Na progu świata* (1983), *Сонечная вязь* (1988), *Кругавая чара* (1989), *Odpoczynek przy wyschniętym źródle* (1996) *Свет першы і апошні* (1997), *Крэйдавае кола* (2002) даследавалася і аналізуецца ў разнастайных аспектах. У Інстытуце Літаратуры Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі ў 2000 годзе была абаронена і кандыдацкая (доктарская) дысертацыя, прысвечаная паэзіі Я. Чыквіна. Празаічная ж творчасць шматгадовага старшыні літаратурнага аб'яднання "Белавежа" да гэтай пары застаецца недаследаванай.

Можна сказаць, што кожны пісьменнік, які напісаў хаця б адзін цыкл твораў малой прозы, стварае ўласную жанравую мадэль гэтай формы. Яну Чыквіну ўласцівы схільнасць да філасафічнасці і рэфлексіі, устаноўка на медытатыўнасць, інтэлектуальную заглыбленасць. У цэнтры яго мініяцюр разнастайныя праявы жыцця чалавека, яго радасць, шчасце, а таксама расчараванне, скруха. Пісьменнік адлюстраваў і ў гэтых творах, як і ў паэтычных, свой душэўны, накоплены гадамі вопыт, перажытае, пачутае, пабачанае.

Мініяцюры Яна Чыквіна былі напісаны ў 1976–1977 гадах, а пабачылі свет толькі праз 22 гады ў часопісе "Тэрмапілы" пад назваю *Трохкрылыя птушкі* пад псеўданімам Янка Дубіцкі. Між іншым, адным з першых псеўданімаў паэта.

Метафарычнай з'яўляецца сама назва цыкла, які пачынаецца і заканчваецца творамі, у якіх птушка набыла ці не ключавы сэнс. Гэтая маленькая істота ўспрымаецца як памкненні душы ў пошуках праўды, як сімвал жыцця чалавека з яго шчасцем, болем, горыччу. Здаецца, што птушка ў палёце мае больш, чым два крылы. Асабліва датычыцца гэта лёту малых птушак. Іхнія крыльцы нібы займаюць сабой цэлую прастору. Сапраўды, птушка ў палёце – штосьці зменлівае, трапяткое, кранальнае. Дарэчы, гэты сімвал своеасабліва, па-свойму перадае і характар разглядаемага жанру. Мініяцюра ж таксама існуе паміж лірыкай і прозай – у працэсе іхняга судакранання, таемнага сімбіёзу. У нас жа, насельнікаў хрысціянскай экумены, могуць узнікнуць і асацыяцыі з сакральным зместам, з біблейнай лічбай "тры". Адна ж з Асоб Святой Тройцы – Святы Дух падаецца іканапісцамі ў выглядзе птушкі.

Сапраўды, сэнсавая поліфанічнасць назвы цыкла ўяўляецца складаным ключом для разумення ўсяго твора.

Цыкл мініяцюр *Трохкрылыя птушкі* складаецца з пяцідзесяці пяці твораў, розных па аб'ёму, спосабу мастацкага самавыяўлення, сярод якіх можна выдзеліць некалькі галоўных тэм. Тэм-праблем, якія часта ўзаемадзейнічаюць, перасякаюцца, але выступаюць, можна сказаць, у адной іпастасі: экзістэнцыя, сэнс жыцця чалавека, непасрэдны жыццёвы вопыт пісьменніка, адносіны з іншымі людзьмі, вобразы жанчын, прырода... Трэба адзначыць, што часта месцам дзеяння мініяцюр з'яўляецца Санкт-Пецярбург, на той час Ленінград, дзе ў 1976–1977 гадах Я. Чыквін доўгі час жыў, што таксама з'яўляецца дадатковым сведчаннем аўтабіяграфічнасці *Трохкрылых птушак*. Можна сказаць, што ў гэтым творы *лірычны герой (які, дарэчы амаль заўсёды – двайнік свайго аўтара) становіцца структурным цэнтрам усёй кампазіцыі, якая ўяўляе сабой ланцуг непасрэдных перажыванняў героя*[10].

Мініяцюры Я. Чыквіна характарызуюцца заглыбленасцю ў еўрапейскі культуралагічны і філасофскі кантэкст, што таксама ў значнай ступені пацвярджае іх аўтабіяграфічнасць, сведчаць аб шырокіх філалагічных інтарэсах аўтара. Ён, аўтар *Трохкрылых птушак*, часта звяртаецца да выказванняў вядомых пісьменнікаў, у прыватнасці: Вісарыёна Бялінскага, Андрэ Маруа, Джорджа Байрана, Іагана Вольфганга Гётэ, Івана Тургенева, Яраслава Івашкевіча, Станіслава Граховяка, ці да звестак з біяграфіі Аляксандра Пушкіна, Фёдара Дастаеўскага, або да герояў іх твораў, як напрыклад, Макара Дзевушкіна, Алёшы Карамазава.

Важнае месца ў мініяцюрах Я. Чыквіна займаюць назіранні за глыбіннымі праявамі жыцця, выяўленыя крытычным вокам пісьменніка-паэта. У шматлікіх філасофскіх роздумах уздымаецца пытанне пра тое, як найбольш вартасна пражыць адзін раз дадзены чалавеку зямны шлях. Пісьменніка страшыць *нястрымнае імкненне ў будучыню. Да чаго вядзе яно? Да перакрэслення жыцця нашых бацькоў і матак. Да згоды на іх смерць. Да маўклівай згоды на смерць многіх пакаленняў, як сродка для шчасця будучых пакаленняў. Амаральна!*[11] Гэтымі словамі Я. Чыквін нагадвае аб прамінанні, абмежаванасці чалавечага жыцця. Чалавеку ўласціва спяшацца за прагрэсам, цывілізацыяй, мроіць аб цудах, якія чакаюць яго дзесь за чарговым паваротам часу. Але ж

[10] Г. М. Кісліцына, *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*, с. 28.

[11] Я. Дубіцкі, *Трохкрылыя птушкі*, (у:) Тэрмапілы № 2, Беласток 1999, с. 85. (Далей старонкі падаюцца ў дужках)

там, за гэтым паваротам, ужо незнаёмыя, чужыя людзі. І няма сродку, каб прыручыць прамінанне, рассунуць межы жыцця...

Вынікам унутранай рэфлексіі аказваюцца глыбокія высновы, роздумы над індывідуальнай працягласцю часу і залежнасцю яго ад спосабу жыцця. *Чалавек, калі жыве сярод другіх людзей і іх спраў, жыве вельмі хутка. А той, хто здалёку ад чалавечай мітусні – мае пачуццё працягласці часу і датыкання вечнасці* (86). Назіранне пісьменніка над асаблівасцямі плыні часу змушае чытача ўгледзецца ў сваё ўласнае жыццё. Усведамляйма сабе, што жыццё вельмі кароткае і таму добра было б скрозь насычаць яго мудрым зместам. Памятайма пра незваротнасць адведзенага нам часу, каб старацца перажыць яго найбольш вартасна, інтэнсіўна, умець радавацца цяперашняму, аддаваць належнае кожнаму дню, кожнаму імгненню.

Выразна медытатыўны характар маюць у *Трохкрылых птушках* фрагменты з вобразамі могілак (ці то ў Ленінградзе, ці то ў Дубічах Царкоўных). Лірычны герой шчыра прызнаецца, што раней баяўся кранаць магільныя крыжы. Вось цяпер жа не адчувае страху. Ён пераступіў *нейкі псіхічны бар'ер* (83) і можа ў *агародзе памерлых* (83) ўдыхаць *арамат жыцця і смерці* (83). У выніку ўнутранай эвалюцыі, узбагачэння жыццёвым вопытам памяняліся адносіны лірычнага героя да смерці. Мяжа паміж жыццём і смерцю перасунулася, што сведчыць аб працэсе ўзрастання, сталення душы.

Гэтыя роздумы Я. Чыквіна над сутнасцю быцця ўвогуле і асабістага жыцця наводзяць паралельна на думку, што творчасць з'яўляецца своеасаблівым сродкам неўміручасці для чалавека. Каб змястоўна, важка пражыць жыццё, трэба прасякнуцца яго нацыянальнай і агульначалавечай патэнцыяй.

Значнае месца ў мініяцюрах Я. Чыквіна займае вобраз прыроды, што далёка не выпадкова, бо вырас мастак сярод цудоўных краявідаў. Ян Чыквін нарадзіўся 18 мая 1940 года ў падбелавежскай вёсцы Дубічы Царкоўныя на Гайнаўшчыне. У гэтай вёсцы прайшло першых дзесяць гадоў жыцця паэта. Ён сам у інтэрв'ю, дадзеным Тэрэзе Занеўскай, прызнаўся, што гэты час здаецца яму найшчаслівейшай парою яго жыцця:

> Mieszkałem na wsi, w Dubiczach Cerkiewnych, niedaleko Puszczy Białowieskiej, do której nieraz chodziło się po jagody lub jesienią po orzechy, dziesięć moich pierwszych lat. Dzisiaj, z odległej perspektywy, wydają mi się one utraconą Arkadią, najszczęśliwszą porą mego życia[12].

[12] T. Zaniewska, *A dusza jest na wschodzie*, Białystok 1993, s. 28.

І менавіта дзяцінства ў Дубічах Царкоўных, як кажа ён сам, ёсць найчысцейшай крыніцай творчага натхнення паэта. Вобраз прыроды знаходзіць лірычнае ўвасабленне то ў вобразе птушак, то ў вобліку дрэў, якія *лісцём стотысячным са мной чытаюць* (82). Прыгожая, жывая прырода хавае ў сабе таямніцу жыцця.

Звяртае на сябе ўвагу ў цыкле Я. Чыквіна рэфлексія І. Тургенева пра птушак. *Маладых салаўёў трэба да старых падвешваць, каб вучыліся. І наглядаць: калі малады, пакуль стары спявае, сядзіць і маўчыць – слухае, з такога будзе талковы пясняр...*[13] Чаму ўвёў яе ў свой твор "белавежац"? Відаць, назіранне гэта ў значнай ступені адпавядае перакананням самога аўтара, як паэта.

Надыходзіць момант, калі душа шукае падтрымкі і не можа атрымаць яе ў знешнім, сярод штодзённых людскіх клопатаў. І лірычны герой *Трохкрылых птушак* прыходзіць у Нікольскі сабор Ленінграда. *З хаты няма звестак. Ад знаёмых – таксама. Радня, пасля апошняй сустрэчы, крыва глядзіць на мяне* (85). Са шчырасцю прызнаецца: *Я ўнутрана выплакаўся і бязбожна памаліўся* (77). Адбываецца пераацэнка жыццёвых каштоўнасцей. Сямідзесятыя гады, гэта значыць час напісання *Трохкрылых птушак*, былі дастаткова складанымі для хрысціянскай прасторы. Ды людзі насуперак афіцыяльнай палітыцы ўлад звярталіся са сваімі просьбамі да Бога, ішлі ў храм.

Адносіны да Бога, народная этыка, мараль прадстаўлены таксама і ў іншай мініяцюры. Лірычны герой прыходзіць да высновы, што хрысціяне, з аднаго боку, вераць у Бога, і, адначасна, баяцца ўвесці ў гнеў *таго, чый смех знішчае фізічна і душэўна – усё!* (83), а з другога боку, даўнія паганскія забабоны надалей жывыя ў народнай традыцыі. Згодна з гэтай псіхалогіяй *людзі апавядаюць сумныя, трагічныя гісторыі, скардзяцца на сваё жыццё,...* (83), забываюцца аб тым, што без Яго дазволу волас з нашай галавы не спадзе.

У *Трохкрылых птушках* выступае сукупнасць жаночых вобразаў. Менавіта жанчыны, як прызнаўся ў інтэрв'ю Т. Занеўскай сам аўтар, з'яўляюцца другой крыніцай паэтычнага натхнення Я. Чыквіна. Гэтая тэма – таксама своеасаблівая кантынуацыя, пастаянны зварот да агульначалавечых праблем і "адвечных" тэм. Праніклівы лірычны герой назірае за жыццём жанчын, за драматычнымі яго праявамі. Вобраз за вобразам, што прадстаўлены ў шэрагу мініяцюр, урэшце стварае галерэю складаных чалавечых лёсаў, няшчасцяў, якія ча-

[13] Тамсама, с. 85.

кающь чалавека на жыццёвай дарозе. Тут і воблікі Наташы з Данецка, якая супраціўляецца мужняй агрэсіі, Валі Рассэт – разумнай жанчыны, надзеленай багатым жыццёвым вопытам, Надзеі фон Мэкк, якая цэлае жыццё платанічна кахала Пятра Чайкоўскага. Узнікае пытанне пра прынцып адбору пісьменнікам жыццёвага матэрыялу. Відавочна, у дзявочых, ці мацярынскіх вобразах уражвае лірычнага героя іх бескарыслівасць, жаночая патрэба жыць для іншых. Жанчыны з мініяцюр Я. Чыквіна надзелены высокімі маральнымі якасцямі.

Уражвае таямнічае заканчэнне заключна-завяршальнай мініяцюры цыклу Я. Чыквіна: *І сёння ноччу, калі быў дарэшты змучаны фізічна, напружаны нярвова, з архіва памяці выплыў колішні час, з яго непрадбачанымі гукамі... Я прачнуўся раптоўна. Як тады, са стукатам сэрца да болю. І ў вачах з трохкрылымі птушкамі.* (87)

Жанр гэтай апошняй мініяцюры, своеасаблівага заключнага акорду, можна вызначыць як верлібр. Назіраецца тут перамяшчэнне розных часавых адрэзкаў у невялікім па аб'ёме матэрыялу. Такое вар'іраванне часам, сутыкненне розных часавых пластоў лічыцца адметнасцю мініяцюры і мае падкрэсліць *мэтанакіраванае, свядомае змяшэнне побытавага, хуткаплыннага і высокага, філасафічнага, паняційнага*[14].

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што мініяцюра з'яўляецца жанрам творчых асоб сталага ўзросту. Да яе прыходзяць маючы ўжо за сабой літаратурны, жыццёвы вопыт. Прыкметна, што ў малой форме лірычнай прозы вельмі добра адчуваюць сябе якраз паэты, што і пацвярджаюць *Трохкрылыя птушкі* Яна Чыквіна.

STRESZCZENIE

W niniejszym artykule zwraca się szczególną uwagę na specyfikę gatunku lirycznej miniatury. Po raz pierwszy jest rozpatrywany cykl prozaicznych miniatur Jana Czykwina napisany w latach 1976–1977. Podkreśla się, iż Jan Czykwin tworzy swój własny model gatunkowy tej formy, dla którego właściwe jest zagłębienie w kwestie egzystencjalne, filozoficzność, szeroki ogólnoeuropejski kontekst kulturalny.

[14] Г. М. Кісліцына, *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*, с. 32.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Алена Паўлоўская
Віцебск

Элементы постмадэрнізму ў сучаснай беларускай прозе

У другой палове 80-х гадоў XX стагоддзя адбыліся значныя змены ў беларускім літаратурным жыцці. Пачалі з'яўляцца новыя па жанрава-стылёвай прыродзе творы, якія садзейнічалі пераадоленню стэрэатыпаў і традыцыйнага разумення мастацка-эстэтычных асаблівасцей літаратуры. Яшчэ ў пару грамадскага застою пачыналі свой мастацкі шлях Уладзіслаў Рубанаў, Алесь Наварыч, Алесь Асташонак, Антаніна Хатэнка і іншыя таленавітыя пісьменнікі. Адразу трэба зазначыць: яны не адмаўляліся ад традыцый, напрацовак старэйшага пакалення, а толькі імкнуліся адысці ад схематызму, тэматычнай і вобразнай уніфікацыі, уласцівай у рознай ступені тагачаснай літаратуры, імкнуліся абнавіць стыль, уразмаіціць тэматыку твораў.

Нягледзячы на крытыку прыхільнікаў адналінейнага рэалізму, маладыя літаратары сцвердзілі права на існаванне розных шляхоў развіцця прыгожага пісьменства. Плённым аказалася тут асваенне паэтыкі заходнееўрапейскай літаратуры, актыўная арыентацыя на лепшыя набыткі айчыннай і сусветнай класічнай літаратуры. Як слушна заўважыў Алесь Бельскі, *сённяшні перыяд літаратурнага развіцця – гэта працэс творчага разняволення асобы, этап узбагачэння слоўнага мастацтва новымі тэмамі і жанрамі. Літаратура ўзмацняе свой чалавекаznaўчы пафас, рухаецца па шляху ўсебаковага даследавання*[1].

[1] А. Бельскі, *Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90-я гг.)*, Мінск 1997, с. 4.

Такім чынам, у беларускую прозу ўваходзіць новая паэтыка, у якой сінтэзуюцца элементы рэалізму з постмадэрнізмам і мадэрнізмам. Значная ўвага надаецца такім прыёмам, як гратэск, гіпербалізацыя, іншасказанне. Выявілася гэтая тэндэнцыя ў творчасці пісьменнікаў, схільных да фармальных навацый (Віктар Казько, Адам Глобус), а таксама тых, хто меў рэпутацыю традыцыяналістаў (Андрэй Федарэнка, Людміла Рублеўская, Алесь Наварыч, Уладзімір Бутрамеў).

Агульнапрызнана, што асаблівае значэнне для станаўлення канцэпцый постмадэрнізму мела праца Жака Франсуа Ліятара *La conditio postmoderne: Rapport sur la savoir* (1979), дзе развіваецца думка аб тым, што постмадэрнізм пабудаваны на руінах страчаных ідэалаў. Літаратуразнаўца з ЗША Іхаб Хасан у сваю чаргу адзначаў, што *дэгуманізацыя ў мадэрнізме і постмадэрнізме азначае канец рэалізму. Факты пераплятаюцца з выдумкай, аўтар пастаянна вяртаецца да сябе. Гэта своеасаблівы ілюзіянізм*[2]. Трэба адзначыць, што менавіта такія вырашэнні ўласцівы для некаторых аповесцей Андрэя Федарэнкі і Людмілы Рублеўскай, а таксама іх апошніх раманаў *Рэвізія* і *Золата забытых магілаў*. Гэтыя творы ў той ці іншай ступені сінтэзуюць у сабе элементы "сур'ёзнай" і "забаўляльнай" літаратуры. Даследчык В. Іўбуліс разам з такімі характарыстыкамі літаратуры постмадэрнізму, як неакрэсленасць, фрагментарнасць, іронія, непрэзентабельнасць, дэкананізацыя вылучыў карнавалізацыю (тэрмін Міхаіла Бахціна) – камічны пафас постмадэрнізму. На гэтую ж асаблівасць дадзенага кірунку, дарэчы, звярнула ўвагу пры разглядзе сучаснай рускай гістарычнай прозы літаратурны крытык Ніна Іванова, якая адзначыла:

> Замест рацыяналізацыі рускай гісторыі і яе метафарызацыі постмадэрнізм прапанаваў карнавалізацыю: гісторыя дэкарыруецца, вызваляецца ад болю, успрымаецца як касцюміраванае прадстаўленне, "страшныя" маскі становяцца смешнымі і нават сімпатычнымі, гучаць забаўныя дыялогі з царства мёртвых, у рамкі забаўляльных сюжэтаў інкрустуюцца абязболеныя гістарычныя падзеі, абясшкоджаныя гістарычныя асобы. Усе скачуць і спяваюць[3].

Беларускі постмадэрнізм больш сціплы па сваім характары. Ён не разлічаны на эпатаж. Заснаваная на кантамінацыі рэалістычных

[2] В. Ивбулис, *Модернизм и постмодернизм: идейно-эстетические поиски на Западе*, Москва 1988, с. 9.

[3] Н. Иванова, *Скрытый сюжет. Русская литература на переходе через век*, Санкт-Петербург 2003, с. 205.

і постмадэрнісцкіх прыёмаў, аповесць Андрэя Федарэнкі *Гісторыя хваробы* прасякнута вострым драматызмам. У ідэйна-змястоўным плане твор блізкі да *Крэйцэравай санаты* Льва Талстога. Беларускі пісьменнік актыўна карыстаецца рэмінісцэнцыямі, разглядаючы праблему, якой надаваў шмат увагі рускі класік, а менавіта: праблему ўзаемаадносінаў паміж мужчынам і жанчынай. Абедзве аповесці – шчырая споведзь галоўнага героя перад іншымі персанажамі, чытачом, перад самім сабою. Элементы постмадэрнізму ў творы Федарэнкі выяўляюцца ў арыентацыі аўтара на тыя прынцыпы, ідэалы, каштоўнасці, якія сцвярджаў сваёй творчасцю Леў Талстой, у прыватнасці – маральнасць, чысціня пачуццяў, узаемадачыненняў. Невыпадкова эпіграфам да свайго твора А. Федарэнка ўзяў словы Л. Талстога: *Чалавек перажывае землятрусы, эпідэміі, жахі хваробаў і ўсялякія пакуты душы, але на ўсе часы для яго самай пакутлівай трагедыяй была, ёсць і будзе – трагедыя спальні.* Аднак аповесць Федарэнкі – не "голы" рэмейк на аповесць Талстога, а цалкам самастойны, арыгінальны твор, у цэнтры якога – унутраны свет "сапраўднага" беларуса, абцяжараны "адвечнай песняй" (Янка Купала) нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Адмовіўшыся ад схематычнага, сацрэалістычнага вобраза талерантнага, інтэрнацыянальнага беларускага народа, малады аўтар здолеў вынесці на ўсеагульны агляд душу сучаснага чалавека, беларуса – душу, у якой грамадскае, нацыянальнае імкнецца стаць часткай прыватнага, асабістага.

У фантастычнай аповесці *Сінія кветкі* Андрэй Федарэнка выкарыстоўвае прыём зруху часу дзеля сцвярджэння ідэі пакарання таго, хто робіць зло іншым, а таксама дзеля сцвярджэння нікчэмнасці жыцця ў імя помсты. У творы прысутнічаюць містычныя моманты, элементы магіі, пераўтварэнні, незвычайныя сны. Усе гэтыя постмадэрнісцкія "штучкі" вельмі добра адчуваюць сябе на фоне звычайных рэалістычных падзей. У цэнтры аўтарскай увагі – псіхалогія падманутага кахання, якое імкнецца да, як яму здаецца, справядлівай помсты крыўдзіцелю, а ў выніку прыходзіць да нічога. Абсалютная ўлада і бязмежныя магчымасці, якімі надзяляюць галоўнага героя сінія кветкі, раптам знікаюць, а ўсё зло абарочваецца супраць самога ж героя. Ад гэтага твора А. Федарэнкі павявае таямнічым скразняком, як ад апавяданняў Эдгара По. Невыпадкова, відаць, і прозвішча цэнтральнага персанажа аповесці *Сінія кветкі* Холад. І ўсё ж беларускі пісьменнік пакідае герою магчымасць для рэабілітацыі, выпраўлення жыццёвых памылак. Фінал твора нечаканы: раптоўная смерць Арценя Холада і хуткае вяртанне падзей да самага пачатку аповесці. А. Федарэнка,

карыстаючыся пісьменніцкім правам, ажыўляе свайго героя і ў гэтым таксама чуецца фантастычны акорд. Дарэчы тут узгадаць словы Сяргея Ханені: *Сучасная літаратура даволі часта спалучае філасофскія пошукі з містычна-фантастычнымі праявамі, якія ўзмацняюць адчуванне патаемнасці, загадкавасці свету*[4].

У дыялектнай мове Брэстчыны выбар пераменных назоўнікавых кампанентаў фразеалагізмаў абмежаваны вузкім колам сістэмна звязаных слоў. Як слушна зазначае В. Ф. Данскі, *менавіта дзякуючы сістэмным адносінам паміж адпаведнымі кампанентамі магчыма захаванне тоеснасці фразеалагічных адзінак на працягу значнага прамежку часу*[1]. Сістэмнасць пры фарміраванні варыянтных ФА вызначаецца наяўнасцю не толькі сінанімічных, але і прадметна-тэматычных адносін паміж словамі, суадноснымі з пераменнымі назоўнікавымі кампанентамі. На першы погляд можа паказацца, што лексічная замена на аснове аднясення назоўнікаў у свабодным ужыванні да тэматычна аднароднай групы лексікі супярэчыць варыянтнасці, асноўнай прыкметай якой з'яўляецца захаванне фразеалагічнага вобраза. *Гэта супярэчнасць была б рэальнай*, – піша В. М. Макіенка, – *калі б мы прызналі, услед за некаторымі фразеолагамі (напр., Л. Р. Скрыпнік), "неспарадкаваны" характар падобных замен. Разбор канкрэтнага матэрыялу ў дыяхранічнай праекцыі, зроблены асобна, паказвае, аднак, сістэмнасць, спарадкаванасць такіх замен*[2]. Такая аднароднасць мае сваю фразеалагічную спецыфіку. На гэта звяртае ўвагу В. М. Тэлія:

[1] В. Ф. Донской, *Вариантность как показатель системности фразеологического состава*, [у:] *Семантический анализ лексических единиц*, Иркутск 1979, с. 89.

[2] В. М. Мокиенко, *Семантическая регламентация при лексическом варьировании фразеологии в диалектах*, [у:] *Псковские говоры*. Сб. науч. тр., Ленинград 1979, с. 101.

Парадыгматычнасць варыянтных радоў прынцыпова адрозніваецца ад адпаведнай спарадкаванасці слоў[3]. Выдзеленая асаблівасць звязваецца з тым, што, становячыся кампанентамі прататыпаў ФА, назоўнікі набываюць гранічна абагульненую семантыку. Таксама *абагульнены характар ужывання слова, абстрагаванне ад намінатыўных функцый лексемы і павышэнне яе ацэначных, экспрэсіўных характарыстык цягне за сабой больш шырокі дыяпазон тэматычнай аднароднасці пры лексічных заменах*[4].

Тэматычныя сувязі, якія назіраюцца паміж назоўнікамі, адпаведнымі заменнікам дыялектных ФА Брэстчыны, вельмі разнастайныя. Назоўнікі можна аб'яднаць у лексіка-семантычныя групы, якія называюць "часткі цела", "жывёлы і насякомыя", "лес, дрэвы", "расліны, зерне, насенне і прадукты харчавання", "аб'екты жыцця і дзейнасці чалавека", "прасторавыя прамежкі", "час".

Назоўнікі, якія складаюць лексіка-семантычную групу "часткі цела". Асобную групу ў дыялектнай мове складаюць варыянтныя ФА, назоўнікавыя кампаненты якіх адпавядаюць словам-саматызмам, паміж якімі могуць назірацца партытыўныя адносіны, што грунтуюцца на сумежнасці дэнататаў – адзін з'яўляецца часткай цэлага: **буты под ногою (под пятою)** *у каго* [Хойна Пін., Камень Кобр.] *'быць у поўным падпарадкаванні ў каго-н.'*, **взеты под ногы (под п'яту)** *каго* [Заазёрная, Гвозніца Мал.], **взяты в рукы (в пазуры)** *каго* [Навалессе Мал., Навасёлкі Кобр.] – *'падпарадкаваць каго-н. сваёй волі, прымусіць быць паслухмяным'* (**нога** *'ніжняя канечнасць чалавека'*, **пята (п'ята)** *'задняя частка ступні'*; **рука** *'верхняя канечнасць чалавека ад пляча да кончыкаў пальцаў'*, **пазур** *'рагавое покрыва на канцы пальцаў'*), (*розжыцца*) **со своіх рук (пальцоў)** [Валішча, Сташаны Пін.] *'самастойна, выкарыстоўваючы сваю энергію, сілу'* (**рука** *'верхняя канечнасць чалавека ад пляча да кончыкаў пальцаў'*, **палец** *'адна з пяці рухомых канцавых частак кісці рукі'*).

Некаторыя назоўнікі, што вызначаюцца адносінамі "частка-цэлае", служаць у прататыпах ФА для "змяншэння" дзеяння, абазначанага фразеалагізмамі: **не быць і ногой** *дзе* – **ны буты і ступо́ю** *дзе* [Кароцічы Стол., Заазёрная Мал.] *'зусім не прыходзіць куды-н., не бы-*

[3] В. Н Телия, *Вариантность идиом и принципы идентификации вариантов*, [у:] *Проблемы устойчивости фразеологических единиц.* Материалы межвуз. симпозиума, Тула 1972, вып. 2. с. 58.

[4] В. М. Мокиенко, *Семантическая регламентация при лексическом варьировании фразеологии в диалектах*, с. 101.

ваць дзе-н.', **рукы (пальца) ны положыты** *на каго* [Сташаны Пін., Свіцічы Кам.] *'не прычыніць ніякай шкоды каму-н., не стукнуць каго-н.'*. Асабліва выразна градуіраванне выяўляецца ў радзе назоўнікаў **пальчык**, **ныготь**, **повныгтя**, адпаведных заменнікам ФА (*ныма*) **і на пальчык (на ныготь, на повныгтя)** [Заазёрная Мал.] *'зусім (няма)'*. Назоўнікі абазначаюць не тры асобныя прадметы, а пэўнае цэлае, недыскрэтную малую колькасць. Слова **повныгтя** падкрэслівае найменшую колькасць чагосьці, а **пальчык** – найбольшую.

Назоўнікі, суадносныя з пераменнымі кампанентамі ФА дыялектнай мовы, могуць характарызавацца адносінамі, заснаванымі на сумежнасці дэнататаў, абазначаных словамі, але пры гэтым адзін дэнатат не з'яўляецца часткай другога. Выдзелены тып адносін паміж назоўнікамі адлюстроўваюць прататыпы наступных фразеалагізмаў: **дыржаты язык за губамы (за зубамы)** [Кустовічы Кобр., Заазёрная Мал.] *'не гаварыць лішняга; маўчаць, калі трэба'*, **на чужом ка́рку (горбу́) выізджаты** [М. Дубрава Пін.] *'карыстацца плёнам чужой працы, дамагаючыся сваёй карыслівай мэты'*, **сыдіты на плэчух (на ка́рку)** *у каго* [Кончыцы Пін., Цна Лун.] *'быць на чыім-н. забеспячэнні, утрыманні'*, **гнуты ка́рок (го́рбуся)** [Крытышын Ів., Заазёрная Мал.] *'выконваць цяжкую работу, мардаваць сябе працай'*, **носом (лобом) зарыты** [Заазёрная Мал.] *'упасці тварам уніз'*.

Назоўнікі ў складзе прататыпаў названых ФА характарызуюцца таксама сітуацыйнай залежнасцю. Так, унутраная форма фраземы **гнуты ка́рок (го́рбуся)** перадае працэс фізічнай працы, у якім адначасова дзейнічаюць абодва дэнататы – **ка́рок** *'задняя частка шыі ў чалавека'* і **го́рбусь** *'спіна, тулава чалавека ад шыі да крыжа'*.

Сітуацыйна пазначаным з'яўляецца варыянтны рад **плэчы – карок** ФА **сыдіты на плэчух (на ка́рку)** *у каго*. У аснове фразеалагізма – гіпербалізаваны вобраз, супастаўленне чалавечага жыцця з сядзеннем на плячах ці на карку ў каго-н. Кожны з дэнататаў – **плычо** *'частка тулава ад шыі да рукі'* і **ка́рок** *'задняя частка шыі'* – дастасоўваецца да дзеяння, пакладзенага ў аснову фразеалагізма.

Сітуацыйна маркіраваныя заменнікі назіраюцца таксама ў структуры ФА **на чужом ка́рку (горбу́) выізджаты**. Назоўнікі **ка́рок** і **горб** *'спіна'*, адпаведныя кампанентам, асацыіруюцца з абстрактнай ідэяй фізічнай працы на каго-небудзь у залежным становішчы.

Сітуацыйна-дэнататыўны фактар таксама паўплываў на выбар заменнікаў ФА **дыржаты язык за губамы (за зубамы)**. Назоўнікі **губы**, **зубы** не з'яўляюцца лішкавымі ў структуры прататыпа ФА. Наадварот, яны выступаюць у ролі своеасаблівых канкрэтызатараў

месца знаходжання дэнатата, хоць нічога новага не ўносяць у змест і эмацыянальнае гучанне фразеалагізма.

Сітуацыяй абумоўлены выбар пераменных кампанентаў ФА **носом (лобом) зарыты**. Менавіта назоўнікі **нос** і **лоб** могуць спалучацца з дзеясловам **зарыты**, апісваючы гэтым самым дзеянне, супрацьлеглае падзенню **навзна́к** *'уніз патыліцай'*.

Фарміраванне варыянтных радоў назоўнікавых кампанентаў ФА можа вызначаць прагматычны фактар. Так, у дыялектнай мове назіраецца фразема **ны злазыты со спыны (з головы)** *чыёй* [Заазёрная Мал.], якая абазначае *'настойліва прыставаць да каго-н., дамагаючыся чаго-н.'*. Выбар свабоднасінтаксічнага прататыпа ФА, асабліва яго назоўнікавага звяна, адлюстроўвае імкненне падкрэсліць "гіпербалізаваную" ступень чужых запатрабаванняў. Замена кампанента **спына** на **голову** ў структуры фразеалагізма з'яўляецца сігніфікатыўнай.

Адметныя заменнікі назіраюцца ў складзе ФА **і носа (гочэй) ны пуказуваты (ны показваты)** *куды* [Дзівін Кобр., Стрэльна Ів.] *'зусім не прыходзіць куды-н., не з'яўляцца дзе-н.'*. Словы **ныс** і **гочы** суіснуюць у прататыпе названай ФА не як семантычна адрозныя моўныя адзінкі. Яны аб'ядноўваюцца тут для выдзялення, акцэнтавання аднаго – адсутнасці каго-небудзь, і пры гэтым нясуць агульную сему *'нічога'*. Назоўнікі выконваюць у прататыпе ролю сэнсавых узмацняльнікаў: пар. **ны пуказуватыся** і **носа (гочэй) ны пуказуваты (ны показваты)**. Пры такой прагматычнай функцыі слоў утвараецца сэнсавае і экспрэсіўнае цэлае.

Аднолькавымі ў прагматычнай функцыі выступаюць назоўнікі, адпаведныя пераменным кампанентам ФА (*промокнуты*) **до шкуры (до тіла, до костэ́й)** [Сошна Пін., Сарацні Драг., Журавок Ів.] *'вельмі моцна, зусім, наскрозь'*. Фразема мае ўзмацняльнае значэнне, для праяўлення ж яго ў прататыпе ФА выкарыстоўваецца такі прыём, як градуіраванне ступені праяўлення дзеяння. Ён не грунтуецца на партытыўных адносінах паміж назоўнікамі **шкура – тіло**, **косты – тіло**, якія абапіраюцца на арганічную сувязь дэнататаў, абазначаных словамі: пар. **тіло** – *'арганізм чалавека ў яго знешніх фізічных формах'*, а **шкура** – *'вонкавае покрыва чалавека'*, **косты** – *'цвёрдыя ўтварэнні ў целе чалавека, якія з'яўляюцца састаўной часткай шкілета, а значыць, і цела'*. Назоўнікі атрымліваюць новую расстаноўку ў семантычным полі ступені (**шкура – тіло – косты**), утвараючы адно цэлае.

У дыялектных ФА могуць праяўляцца і адвольныя замены назоўнікавых кампанентаў. Як правіла, яны назіраюцца ў кампаратыўных

устойлівых выразах: **сыдіты як почка (пычінка) в са́ловы** [Арэхава, Заазёрная Мал.] *'жыць раскошна, прывольна, у поўным дастатку'*, **як за сыба́ (за плэчы, за ухо́) закынуты (закінуты)** [Арэхава Мал., Гірск, Гарадзец Кобр.] *'лёгка і хутка з'есці, выпіць што-н.'*.

Як бачым, назоўнікі-саматызмы, адпаведныя пераменным кампанентам ФА, характарызуюцца разнастайнымі сувязямі, якія адлюстроўваюць пэўныя заканамернасці ў фарміраванні варыянтных фразеалагічных радоў. Многія з іх грунтуюцца на ўяўленні аб пэўнай сітуацыі, на ўзнаўленні прадметаў (частак цела) у пэўных адносінах. Асаблівай экспрэсіўнасцю, выразнасцю вызначаюцца тыя ФА дыялектнай мовы, заменнікам якіх адпавядаюць назоўнікі-саматызмы, напоўненыя ў прататыпах фразем прагматычным зместам. Апошнія ўводзяцца ў прататыпы ФА для таго, каб выразіць абагульнены сэнс, што непасрэдна экспліцыруе элементы фразеалагічнага значэння ці ўзмацняе, выдзяляе іх.

Назоўнікі, якія складаюць лексіка-семантычную групу "жывёлы і насякомыя". З жывёльным светам звязаны назоўнікі, адпаведныя заменнікам варыянтных ФА **хоть ты псэй (вовків) гоны** *куды* [Моталь Ів., Кублік Драг.] *'вельмі холадна (у хаце, памяшканні і пад.)'*, **коту (собацы) хвоста не зав'язаць (ны зав'язаты)** [Аздамічы Стол., Сарацні Драг.] *'анічога не зрабіць (звычайна за дзень)'*, (*пуйты*) **дэ Макар тылята (ко́зэй) ны пасэ** [Ласіцк, Чухава Пін.] *'вельмі далёка'*. Яны ў дыялектных фразеалагізмах сустракаюцца рэдка.

Толькі заменнікі ФА **і комара (мухы) ны заб'е** [Снітава, Трудавая Ів.] *'вельмі ціхі, лагодны, пакорлівы'*, (*зрабіць*) **шчо на́вэ муха (комар) носа не поточыць** [Бастынь Лун.] *'нельга прычапіцца да чаго-н.'* суадносяцца з назвамі насякомых.

Назоўнікі **муха**, **комар**, акрамя тэматычнай сувязі, набываюць у прататыпах названых ФА яшчэ і асацыятыўную, паколькі сімвалізуюць нешта самае маленькае. Такім імпліцытным сэнсам назоўнікаў асабліва выразна матывуецца ўстойлівы выраз (*зрабіць*) **шчо на́вэ муха (комар) носа не поточыць**, які першапачаткова *выкарыстоўваўся, відаць, як ацэнка такой сталярскай або цяслярскай работы, пры якой паміж шчыльна падагнанымі дошкамі ці бярвёнамі нельга прасунуць нават камарынага носа*[5].

[5] І. Я. Лепешаў, *Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў*: У 2 частках, Мінск 1993, ч. 2, с. 91.

Назоўнікі, якія складаюць лексіка-семантычную групу “лес, дрэвы”. У ролі заменнікаў ФА дыялектнай мовы могуць выступаць назоўнікі з агульным значэннем *‘лес ці дрэвы’*: **быры́зына** *‘бярозавы лес’* – **бограчкі́** *‘сасновы лес’* – **пойтэ(-ты) у быры́зыну (у бограчкі́)** [Туляцічы Ів., Зводы Бр.] *‘памерці’*; **берэзы** *‘бярозы’* – **бар’яки́** *‘сосны’* – **пойці (пуйты) пыд берэзы (пуд бар’яки́)** [Альманы Стол., Пажэжын Мал.] *‘памерці’*; **вульшы́на** *‘альховы лес’* – **лес** – (*росты*) **на ліс (на вульшы́ну) дывячыся** [Ст. Раматова Мал., Балоты Кобр.] *‘вельмі хутка і значна па вышыні’*.

Семантычная тоеснасць варыянтных ФА з такімі заменнікамі заснавана на працэсе семантычнай нейтралізацыі, ці здыманні сэнсаадрозных магчымасцей адзінак ніжэйшага ўзроўню, якімі выступаюць назоўнікі – кампаненты прататыпаў фразем. Гіпанімічныя (віда-відавыя) адносіны, характэрныя для назоўнікаў **быры́зына – бограчкі́**, **берэзы – бар’яки́**, а таксама гіпера-гіпанімічныя (рода-відавыя) суадносіны, уласцівыя для слоў **лес – вульшы́на**, у межах свабоднасінтаксічных прататыпаў фразеалагізмаў страчваюць сваю рэлевантнасць. У сувязі з чым на месцы назоўнікаў-гіпонімаў можа быць любая іншая відавая назва. Гіперонім можа таксама замяняцца гіпонімам, паколькі ў прататыпах ФА відавая назва не канкрэтызуе шырокага значэння родавага слова, а родавае не папаўняе семантычнай недастатковасці відавога слова. У такім разе, гіпанімічныя і гіпера-гіпанімічныя замены ў памянёных ФА адбываюцца не заканамерна, а стыхійна.

Назоўнікі, якія складаюць лексіка-семантычную групу “расліны, зерне, насенне і прадукты харчавання”. З ліку назоўнікаў, што маюць агульнае значэнне *‘расліны або іх зерне, насенне’*, у якасці заменнікаў ФА дыялектнай мовы выступаюць наступныя: **просо** *‘збожжавы злак з мяцёлкавым суквеццем, з ачышчанага зерня якога атрымліваюць крупы’* – **коноплі́** *‘высокая травяністая расліна каноплевых, са сцябла якой выраблюць пяньку, а з семя – алей’* – **оно в просо (в коноплі́) ставыты** *каго* [Астравічы Пін., Дзевяткі Кобр.] *‘хто-н. ходзіць у падранай ці вялікай вопратцы’*; **ріпа** *‘рэпа; караняплод з акруглым коранем светла-жоўтага колеру’* – **свыры́па** *‘свірэпіца; аднагадовая культурная расліна з тонкім коранем’* – **хоть ты ріпу (свыры́пу) сій** [Хамічава Ів., Здзітава Бяр.] *‘вельмі брудныя (пра рукі, ногі)’*; **жыто – овэс** *‘зерне жыта, аўса’* – **хоть (хоч) жыто (овэс) вій дзе** [Знамянка, Лышчыцы Бр.] *‘вельмі холадна ў памяшканні’*; **просо** *‘зерне проса’* – **мак** *‘насенне маку’* – **просо (мак) товчы** [Сіманавічы Драг., Залессе Кобр.] *‘мітусіцца ў паветры плоймай, клубком (пра камароў, мошак)’*.

Выдзеленыя субстытуцыі назоўнікавых кампанентаў **просо – конопля́, ріпа – свыры́па, жыто – авэс, просо – мак** з'яўляюцца свабоднымі. Вядома, і іх свабода адносная, бо кожны кампанент суадносіцца з назоўнікам, які *можа спалучацца з большай ці меншай колькасцю слоў, а не з любымі словам*"[6]. Што да назоўніка **мак**, то яго спалучальнасць у прататыпе фразеалагічнага варыянта **мак товчы** не адпавядае агульнапрынятай: В ступы ячмінь на куттю, просо на пшоно товкуть. А **мак** тэрэбіцця, намочуецця водою. После ёго колотять маковэртом в мысцы і вмачають хлібом в ёго, ідеть [Заазёрная Мал.].

Назвамі прадуктаў харчавання з'яўляюцца назоўнікі **сыр – варэнык**, **жір – масло**, адпаведныя заменнікам наступных ФА: **купатыса(-ся) як сыр (варэнык) у ма́славі(-овы)** [Боркі Пруж., Дубічна Мал.], **якто почка в жі́ровы (в маслі) кататыся** [Гвозніца Мал.] – *'жыць прывольна, у поўным дастатку'*.

Назоўнікі, якія складаюць лексіка-семантычную групу "аб'екты жыцця і дзейнасці чалавека", абазначаюць прадметы хатняга ўжытку і гаспадарчай дзейнасці чалавека. Так, агульнае значэнне *'сельскагаспадарчы інвентар'* маюць назоўнікі **ярмо** *'драўляны хамут для рабочай буйной рагатай жывёлы'* – **хамут** *'частка вупражы ў выглядзе драўлянага каркаса, абкладзенага з унутранага боку мяккім лямцом, якую надзяюць каню на шыю'* – **плуг** *'сельскагаспадарчая прылада з шырокім металічным лемяшом і адвалам для ворыва'*, што адпавядаюць заменнікам фразеалагізмаў **хоть у ярмо (у хамут, у плуг) запрагай** *каго* [Снітава Ів., Воса Кобр.] *'хто-н. дужы, моцны, здаровы'*, **впрагаты в ярмо (в плуг)** *каго* [Заазёрная Мал., Крыўчыцы Пін.] *'беручы пад сваю ўладу, прымушаць каго-н. працаваць; эксплуатаваць каго-н.'*.

Назоўнікі **хліў** і **ку́ча**, суадносныя з пераменнымі кампанентамі ФА **статы на хліў (на ку́чу)** [Заазёрная Мал.] *'перастаць пасвіца'*, характарызуюцца абагульненым значэннем *'памяшканне, месца для жывёлы'*.

Заменнікі фразеалагізмаў дыялектнай мовы могуць адпавядаць назоўнікам, якія абазначаюць ёмістыя прадметы для захавання, пераноскі, нашэння чаго-н.: **мыска – корыто** ў ФА (*стоеты*) **як у мысцы (в корыты)** [Заазёрная Мал.] *'нерухома, на месцы (пра ваду на*

[6] *Сучасная беларуская літаратурная мова. Уводзіны. Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія. Фразеаграфія. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія.* Вучэб. дапам. 3-е выд., дапрац. і дапоўн. М. Ц. Кавалёва, А. К. Юрэвіч, Ф. М. Янкоўскі і інш., Мінск 1993, с. 30.

возеры, рацэ)'; **бочка – торба** ў ФА **быздонная бочка** [Заазёрная Мал.] – **бяздонная торба** [Флер'янава Лях.] *'тое, што патрабуе многа выдаткаў, грошай'*; **мышок – ко́роб** *'плецены з саломы посуд для захавання, пераносі чаго-н.'* у ФА (*наговорыты*) **сем мэшку́ў (ко́робів) і бочку орышта́нтуў** [Церабень, Ласіцк Пін.] *'вельмі многа і абы-чаго'*; **коші́ль** *'сплецены з ліпавага ці хваёвага лыка посуд прамавугольнай формы, без накрыўкі, з тонкімі вяроўкамі (вэрцямы), на якіх падвешваўся на спіну'* – **вырэ́нька** *'сплецены з бярозы кошык з накрыўкай'* у ФА **плысты кошылі́ (вырэ́ньку)** [Заазёрная Мал., Моталь Ів.] *'гаварыць абы-што, выдумляць'*; **выдро – луб** *'лубяны кораб'* у ФА (*дождж*) **як з выдра (з луба)** [Заазёрная Мал., Радастава Драг.] *'праліўны, вельмі вялікі'*; **кішэня** *'ўшыты ў вопратцы мяшэчак для нашэння пры сабе дробных рэчаў, грошай'* – **калы́тка** *'скураны кашалёк, які насіўся на рэмені цераз плячо і служыў для захавання грошай'* у ФА **встыпынуты кішэнью (калы́ткою)** [Язвіны Драг., Заазёрная Мал.] *'выдаткаваць многа грошай на што-н.'*.

Агульным значэннем *'прадметы для завязвання'* характарызуюцца назоўнікі **выровка** і **шнурок**, адпаведныя заменнікам ФА (*крычеты*) **однэю выровкою (одным шнурком)** [Заазёрная Мал.] *'не сціхаючы, вельмі моцна'*. Мікрагрупа **выровка – шнурок** выразна дыферэнцуецца па прыкмеце *'таўшчыня (прадмета)'*.

Сэнсава блізкія назоўнікі **плот** *'агароджа з жэрдак'* і **пляце́нь** *'агароджа з пераплеценых тонкіх галін'*, суадносныя з пераменнымі кампанентамі фразеалагічных варыянтаў **плысты плота – плесці пле́тня** [Снітава Ів., Цераблічы Стол.] *'гаварыць абы-што, выдумляць'*.

Проціпастаўленне па прыкмеце *'месца адносна печы'* ўтвараюць назоўнікі **за́пык** *'прастора паміж печчу і сцяной; нары з дошак каля печы, на якіх раней спалі'* і **пры́пык** *'месца перад вусцем печы, дзе раней ставілі гаршкі і сковарады, якое цяпер служыць плітой для прыгатавання ежы'*, адпаведныя заменнікам ФА (*поіхаты*) **з за́пыка (з пры́пыка) на піч** [Заазёрная, Гвозніца Мал.] *'нікуды (не паехаць)'*.

У лексіка-семантычнай групе "прасторавыя прамежкі" збліжаюцца назоўнікі **зымля** *'глеба, верхні слой кары нашай планеты, паверхня'* – **полэ** *'засеяны ўчастак зямлі'* – **стэжка** *'вузкая палоска зямлі, прызначаная для перамяшчэння'*, суадносныя з заменнікамі фразеалагізмаў **выбратысь з поля (з зымлі)** [Гірск Кобр.] *'прарасці, выйсці на паверхню (пра ярыну, азімыя і пад.)'*, **зымля (стэжка) ны спыть** *пад кім* [Балоты, Гірск Кобр.] *'хто-н. рухавы, спрытны, здольны да хуткага перамяшчэння'*.

Названыя назоўнікі характарызуюцца семантычным супрацьпастаўленнем *‘зямля як цэлае – частка зямлі’*. Так, у мікрагрупе **зымля – полэ** назоўнік **полэ** маркіраваны па прыкмеце *‘засеяная, апрацаваная, лакальна абмежаваная частка зямлі’*. Такая прыкмета з’яўляецца нерэлевантнай для слова **зымля**. Пазіцыю немаркіраванага члена займае гэта слова і ў мікрагрупе **зымля – стэжка**. Назоўнік жа **стэжка** маркіруецца па прыкмеце *‘вузкая палоска зямлі’*, а таксама па прызначэнні.

Назоўнікі, якія складаюць лексіка-семантычную групу “час”. Іх нямала ў дыялектнай мове. Найперш гэта назоўнікі, якія адпавядаюць заменнікам фразеалагізмаў: (*робыты*, *рабіць*) **од ранка (з рання) до смыркання (до ночы)** [Плянта Кам., Пузічы Лун.], **од ранка (од світання, од світу) до змыркання** [Плянта Кам., Бездзеж Драг., Тышкавічы Ів.], **уд світу ду змыркання (ду змроку)** [Кустовічы Кобр.] – *‘цэлы дзень’*.

Фраземы, у складзе якіх назоўнікі выступаюць у якасці пераменных кампанентаў, утвораны на аснове парнага супрацьпастаўлення слоў, што выражаюць супрацьлеглыя, але звязаныя паміж сабою паняцці. Так, назоўнікі **смырканне – ноч**, **ранок – світанне – світ**, **змырканне – змрок**, якія ўтвараюць варыянтныя рады названых ФА, з’яўляюцца антонімамі адпаведна да слоў **ранок (ранне)**, **змырканне**, **світ**.

На прыкладах прыведзеных ФА таксама можна назіраць, як парушаецца сіметрычнасць паміж кампанентамі, суадноснымі з антонімамі. Фразеалагізмы з кампанентамі, адпаведнымі выразным антанімічным словам, могуць мадыфікавацца ва ўстойлівыя структуры з кампанентамі, якія суадносяцца са словамі з меншай ступенню супрацьлегласці значэнняў. Напрыклад, назоўнікі **світанне** *‘час перад усходам сонца, калі пачынае світаць’* і **змырканне** *‘час пасля захаду сонца, калі пачынае цямнець’* [САБМ, с. 210], занатаваныя ў якасці кампанентаў фразеалагічнага варыянта **од світання до змыркання**, з’яўляюцца крайнімі супрацьлеглымі пунктамі ў сістэме аднародных паняццяў часавага супалажэння. Між тым слова **світанне**, як паказвае варыянтная ФА **од світання (од ранка, од світу) до змыркання**, дапускае магчымасць узнаўлення новых антанімічных пар з меншай ступенню супрацьлегласці значэнняў: пар. **ранок** *‘час, калі пачынаецца дзень’*, **світ** *‘час, калі ёсць святло; свячэнне, промні’* і **змырканне** *‘час пасля захаду сонца, калі пачынае цямнець’*. Не крайнімі супрацьлеглымі пунктамі ў сістэме часавага супалажэння з’яўляюцца назоўнікі-антонімы **світ** і **змрок** *‘няпоўная цемната, прыцемак’*, адлю-

страваныя ў фразеалагічным варыянце **уд світу ду змроку**. Можна ўстанавіць адносна назоўніка **світ** выразнае супрацьпастаўленне: **світ** *'святло'* – **тымнота** *'цемра'*. Слова **змрок** выступае сярэднім членам на антанімічнай шкале: **світ** – **змрок** – **тымнота**. Такая асаблівасць антанімічных адносін, як іх не крайняя супрацьпастаўленасць, адзначаецца і ў дачыненні да назоўнікаў **ранок (ранне)**, **смырканне**, **ноч** *'частка сутак ад вечара да ранку'* [САБМ, с. 65], суадносных з кампанентамі ФА **од ранка (з рання) до смыркання (до ночы)**. Кожны з назоўнікаў, занатаваных у складзе згаданай ФА, мае ў дыялектнай мове выразны антонім: **ранок (ранне)** – **вэчор**, **смырканне** – **світанне**, **ноч** – **дзень**.

Спецыфічныя адносіны супрацьпастаўлення слоў, адпаведных кампанентам названых ФА, і вызначаюць магчымасці вар'іравання фразеалагічных структур, у якасці заменнікаў якіх выступаюць тэматычна звязаныя назоўнікі. Некаторыя з іх выразна спецыялізаваны ў сваіх значэннях, паколькі ўкладваюцца ў межы цыклічнай стыкоўкі часавых адрэзкаў: **од ранка (з рання) до смыркання (до ночы)**, **од ранка (од світання) до змыркання**. У дыялектнай мове сістэма часавых найменняў не прамалінейная: перыяду ўсходу сонца, наступленню **раніцы** *'часу, калі пачынаецца дзень'* папярэднічае такі часавы прамежак, як **світанне** *'час перад усходам сонца, калі пачынае віднець'*. Дыферэнцаваныя і назвы вячэрняга перыяду: словам **змырканне** абазначаецца *'час пасля захаду сонца, калі пачынае цямнець'*, а **ноч** паказвае на тое, што наступіла поўная цемната.

Паказальна, што варыянтны рад ФА **од світу до змыркання**, **уд світу ду змроку** складаюць заменнікі, суадносныя з сінкрэтычнымі назоўнікамі, якія па-рознаму абазначаюць адзін і той жа часавы прамежак. Назоўнік **змырканне**, утвораны ад дзеяслова **змыркаты** *'цямнець'*, абазначае апрадмечанае дзеянне, а назоўнік **змрок** выдзяляе якасць гэтага дзеяння: працэс змяркання звязаны з няпоўнай цемнатой, якая толькі потым заменіцца наступленнем цемры.

Тэматычная сувязь паміж назоўнікамі **світ** і **ранок**, адлюстраваная ў прататыпе ФА **од ранка (од світу) до змыркання**, звязана з дастаткова канкрэтнымі асацыяцыямі. Меркай наступлення раніцы з'яўляецца святло, якое выпраменьваецца сонцам. Гэта сувязь носьбітамі мовы перадаецца так: В круг ідэ сонцэ, там ясніе, дэ оно подходыть [Заазёрная Мал.]. Святло дасягае гранічнай ступені праяўлення толькі з усходам сонца.

Фразеалагічныя варыянты з часавым значэннем трэба адмяжоўваць ад фразеалагізмаў-сінонімаў. Так, ФА (*ісці, уставаць*) **на свет**

[Рубель Стол.] і (*іты*) **на зору (на зорошку, на зорочку)** [Астравічы Пін., Навасёлкі Кобр., Галоўчыцы Драг.] з'яўляюцца сінанімічнымі, паколькі паказваюць на розныя часавыя прамежкі. Спосабам адліку часу ў першай фраземе з'яўляецца святло, першыя прыкметы світання. Другая ФА **на зору (на зорошку, на зорочку)** перадае арыентацыю ў бытавым часе па зорцы, ці "світовіі зорі", якая, паводле назіранняў носьбітаў дыялектнай мовы, "пырыд днём всходыть, дысь у 4 часа выдно еі з боку сонця-всходу, одмінчыста од всіх остальных зор, більша, ярчіша, аж двіжыцця" [Заазёрная Мал.].

Варыянтныя ФА з пераменнымі кампанентамі, адпаведнымі тэматычна звязаным словам, прадуктыўныя ў дыялектнай мове даследаванага рэгіёна. Шырокае іх ужыванне абумоўлена не толькі патрэбамі камунікатыўнага характару, але і мэтай экспрэсіўнага, мастацка-выяўленчага плану.

Умоўныя абазначэнні

ТС – *Тураўскі слоўнік.* У 5 тт. Склад.: А. А. Крывіцкі, Г. А. Цыхун, І. Я. Яшкін, Мінск 1982–1987, т. 2. 1982, 271 с.

ТСБМ – *Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы.* Пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко, Мінск 1996, 783 с.

САБМ – Лазоўскі У. М. *Слоўнік антонімаў беларускай мовы. Канкрэтныя выпадкі ўжывання*, Мінск 1994, 293 с.

Прынятыя скарачэнні

Назвы раёнаў: Бр. – Брэсцкі, Бяр. – Бярозаўскі, Драг. – Драгічынскі, Ів. – Іванаўскі, Кам. – Камянецкі, Кобр. – Кобрынскі, Лун. – Лунінецкі, Лях. – Ляхавіцкі, Мал. – Маларыцкі, Пін. – Пінскі, Пруж. – Пружанскі, Стол. – Столінскі.

SUMMARY

In this article variants of Brest region phraseological units with substitutions of thematically bound nouns. The author describes in detail lehico-semantic groups of words which name parts of human body; animals and birds; forest and trees; plants, seeds and food; objects of people's activity; space and time. The substitutions found show system organization of variant phraseological units.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Artur Czapiga
Rzeszów

Z badań nad funkcją składniową metafor odzwierzęcych w języku polskim, rosyjskim i angielskim

Obiektywność świata, a więc przedmiotowe cechy wszystkiego, co nas otacza, postrzegana jest za pomocą języka[1]. Językowy obraz świata nie jest jednak dokładnym odbiciem rzeczywistości, cechy budujące obraz obiektu nie są wiernym odzwierciedleniem cech realnych. Są one przede wszystkim rezultatem wyboru – jedne są uwydatniane, inne są pomniejszane, jeszcze inne są całkowicie eliminowane. Wybór usankcjonowany jest przyjętą perspektywą opisu, wynikającą z widzenia aspektowego[2]. Dochodzi tu, więc do subiektywizacji przekazywanego obrazu. Podstawą symbolicznej funkcji języka jest metaforyczne i znakowe ujmowanie rzeczywistości, silnie antropocentryczne postrzeganie świata. Wyjątkowo skondensowanym środkiem postrzegania językowego obrazu świata jest przenośnia, gdyż osadzona jest głęboko w systemie wartości i ewaluacji każdej grupy językowo-kulturowej, korzysta z utartych skrótów myślowych, bazuje na wierzeniach i naiwnym obrazie świata. Niniejszy szkic poświęcony jest antroponimicznym metaforom odzwierzęcym w funkcji kolejnego argumentu i stanowi kontynuację opisu funkcji składniowych tej specyficznej klasy rzeczowników[3]. Podstawo-

[1] R. Kwaśnicka, *Rzeczywistość jako byt sensu. Teza o językowym tworzeniu rzeczywistości*, [w:] *Język a kultura*, t. I, red. J. Anusiewicz, J. Bartmiński, Wrocław 1991, s. 37.

[2] J. Maćkiewicz, *Co to jest językowy obraz świata*, [w:] *Etnolingwistyka 11*, red. J. Bartmiński, Lublin 1999, s. 13.

[3] Zob. prace autora: *Metafory odzwierzęce w funkcji adresatywnej w języku polskim, rosyjskim i angielskim*, „Przegląd Rusycystyczny" 2005, z. 1, s. 82–94; *Opis zdań z metaforami odzwierzęcymi w pozycji argumentu (na materiale języka polskiego, rosyjskiego*

wym zadaniem przenośni jest orzekanie[4], jednak nie zawsze jest to pozycja prymarnego predykatu. Metafora może zajmować w zdaniu dowolną pozycję, a predykatywny charakter realizuje się wtedy implicytnie, np. *Spotkałem na ulicy tę żmiję – Spotkałem na ulicy kobietę, która jest żmiją (tzn. która ze względu na cechy charakteru jest nazwana żmiją = jest przebiegła i podstępna).*

W podstawowej strukturze predykatowo-argumentowej (PWPA)[5] metafory odzwierzęce stosunkowo często, zwłaszcza w języku polskim i rosyjskim, zajmują pozycję kolejnego argumentu danego predykatu. Ilość argumentów zależy od semantyczno-składniowych właściwości członu werbalnego. Przykładowo, czasowniki nieprzechodnie (intransitive) wymagają jedynie obecności głównego argumentu, natomiast pozostałe czasowniki mogą implikować większą liczbę argumentów, przy czym w niektórych wypowiedzeniach spotykamy się z ukrytymi argumentami, np.: *Jan śpi* – predykat jednoargumentowy; *Jan czyta książkę* – predykat dwuargumentowy; *Czytam książkę* – predykat dwuargumentowy z ukrytym głównym argumentem; *Jan czyta książkę bratu* – predykat trójargumentowy itd.

W badanych tekstach literackich[6] najliczniej reprezentowane są wypowiedzenia z predykatami dwuargumentowymi, w których metafora zoonimiczna jako kolejny argument odnosi się do głównego argumentu podstawowej struktury predykatowo-argumentowej. Zarysowują się tu dwa typy strukturalne:

1) w którym główny argument jest materialnie wyrażony (rzeczownikiem, zaimkiem),
2) w którym argument jest ukryty w formie osobowej predykatu lub wynika z szerszego kontekstu.

Pierwszy typ wypowiedzeń stosunkowo często pojawia się w badanych tekstach: 19 przypadków w języku polskim, 21 w języku rosyjskim i 20 w języku angielskim. Por.:

Niech ją mama nie zasłania, bo przecież to niesłychane, ile ja cierpię przez tego ***bąka****.* (Makuszyński)

---

i angielskiego), Studia Wschodniosłowiańskie, t. 5, Białystok 2005, s. 241–252; *Metafory odzwierzęce w funkcji predykatu w języku polskim, rosyjskim i angielskim*, „Przegląd Rusycystyczny" 2005, z. 3 (w druku).

[4] Zob. m.in.: T. Dobrzyńska, *Metafora*, Wrocław 1984, s. 119; Н. Д. Арутюнова, *Предложение и его смысл*, Москва 2003, с. 238–356.

[5] S. Karolak, *Składnia wyrażeń predykatywnych*, [w:] *Gramatyka współczesnego języka polskiego*, pod red. Z. Topolińskiej, Warszawa 1984, s. 11–178.

[6] Z tekstów literackich po 10000 stron dla każdego języka wyekscerpowaliśmy: 63 wypowiedzenia z metaforą odzwierzęcą w pozycji kolejnego argumentu w języku polskim, 64 w rosyjskim i 30 w angielskim.

– *Ja się chyba w tej* ***sikorce*** *kocham.* (Zarzycka)

Jak on mógł tak bardzo kochać tę ***wydrę!*** (Dołęga-Mostowicz)

Sukę *właśnie Bieżan koniecznie chciał wreszcie ominąć i zmusić tę babę do ujawnienia innych wrogów zabitego Dominika, uparcie przez nią lekceważonych i ukrywanych.* (Chmielewska)

Ożeni się człowiek z taką ***sikorą****, to potem weźmie pod pantofel i rządzi.* (Zarzycka)

– *Ты не серчай, Ксюша, на этих* ***жеребцов****. От скуки они.* (Шолохов)

– ***Змею*** *ты грел! – вдруг резким фальцетом выкрикнул дед Сашка, нелепо топыря руки.* (Шолохов)

[...] *и слезы у меня текут радостные, что и среди этих* ***волков****, простите волки, среди этих* ***акул*** *и* ***крыс****, простите акулы и крысы, есть невинные люди* [...] (Акунин)

Я пододвигался к моей мерцающей ***голубке****, останавливаясь и втягиваясь...* (Набоков)

Разве мы позволим ***гаду*** *пролезть?* (Платонов)

Ah, man, I'd like to know that gone little ***cat*** *and what he thinks and what kind of girls he has – oh, man, I'm. high on this air!* (Kerouac)

We need a good strong ***wolf*** *like the nurse to teach us our place.* (Kesey)

Hoowee, I've seen some ***bitches*** *in my life, but she takes the cake.* (Kesey)

The firm now had fourteen lawyers, all making at least $200,000; twenty-one paralegals at $75,000 each (...) and four office ***gofers*** *at $15,000 each.* (Grisham)

Come on, let's go, or we'll wake the ***dragon****.* (Evans)

Wyróżnione metafory odzwierzęce jako kolejny argument struktury predykatowo-argumentowej oznaczają osobę, która w subiektywnym odczuciu nadawcy swoim wyglądem, zachowaniem, cechami charakteru kojarzy się z określoną nazwą zwierzęcia. Są one wyrazem stosunku emocjonalnego nadawcy do desygnatu, reprezentowanego przez daną przenośnię. Wiąże się to z szerszym kontekstem, z konsytuacją, z normami kulturowymi danej nacji.

Nieco częściej pojawiają się w polskich tekstach zdania z ukrytym głównym argumentem (26 razy), w rosyjskich 11 razy, w angielskich są to przypadki sporadyczne (5):

Przyszedł do zadumanego, nieruchawego ***ślimaka****, wywabił go okrzykiem z domku, zaśmiał go na śmierć, otumanił* [...] (Makuszyński)

[...] *ileż kłopotu miałem z tym* ***źrebakiem*** (Helą – A. Cz.), *zanim go ugłaskałem.* (Nowak)

A w domu mam ***goryla****, stać mnie na to, o czym dobrze wiecie.* (Chmielewska)

Oho! Jedną ***żmiję*** *możesz zobaczyć od razu* (o kobiecie – A. Cz.). *Widzisz, schodzi ku brzegowi.* (Makuszyński)

Przede wszystkim widzę ***małpę****, niezdarnie udającą człowieka* (o bracie – A. Cz.) (Makuszyński)

А помнишь, как я тебе дорогу перебежала? – Помню. – ***И жеребушку*** *помнишь* (Задорнов)

Понимаешь, конвойный его опознал, чуть не задушил здесь ***гаденыша****.* (Островский)

Гидров *этих в море спрудим!* (Шолохов)

Ах ты бо-ж-жже мой! А? Запорю ***сучку****!* (Шолохов)

– Змею ты грел! – вдруг резким фальцетом выкрикнул дед Сашка, нелепо топыря руки. – ***Гадюку*** *прикормил! Она с Евгением свалялась!* (Шолохов)

It won't sound too pretty to say you've caught the ***kitten*** *and let the cat escape.* (Tolkien)

It iss that you yourself should beware of U Po Kyin. Beware of the ***crocodile****.* (Orwell)

Look – at – those – ***cats****!* (Kerouac)

By God, Chief, you may be big, but you shake my hand or I'll consider it an insult. And it's not a good idea to insult the new bull ***goose*** *loony of the hospital.* (Kesey)

Carajo! Give it to the ***bitch****.* (Sheldon)

Z szerszego kontekstu bądź z formy osobowej czasownika łatwo się domyślić, kto jest głównym subiektem w danej strukturze predykatowo-argumentowej.

Przy predykatach trójargumentowych tylko w tekstach polskich główny argument jest ukryty (4 zdania i 4 z wyrażonym podmiotem), natomiast w pozostałych językach zawsze jest wyrażony materialnie (rosyjski 10, angielski 2):

A właśnie teraz możesz mi urodzić to puszyste ***kociątko****, kociątko najmilsze.* (Nowak)

A potem, Piotrze, urodzę ci syneczka. ***Kociątko*** *puszyste urodzę ci, Piotrze.* (Nowak)

Jacek poczerwieniał. (Może on oprócz tej rudej ***wydry*** *ma jeszcze coś na sumieniu?)* (Dołęga-Mostowicz)

[...] *ileż jednak jest takich szkół bez sumienia, ileż lisów naucza śpiewu biedne* ***gęsi****?* (Makuszyński)

Matka wyprawiła niepoprawną ***oślicę*** *na wieś do siostry, ażeby choć*

przez pewien czas zeszła z oczu ojcowskich i spod jego ciężkiej pięści. (Żeromski)

Кто бы мог ожидать от чопорной ***козы*** *такого любопытства?* (Акунин)

Давайте я лучше расскажу вам вон про того ***орангутана****.* (Акунин)

А в записке, которую я тогда послал ***свинье*** *с тем, чтобы его дама ее прочла, было написано...* (Акунин)

Мы за трудовой народ, за его интересы дрались с генеральской ***псярней****, не щадя живота, и теперь вот гибнем от вашей руки!* (Шолохов)

– Едацкая кампания была ниточкой, на которую я сразу поймал и левацкого ***карася*** *и правую* ***щуку*** *(кулаков).* (Платонов)

(...) *and Dorothy appeared to fascinate him beyond all the '****birds****'.* (Orwell)

Struktury wieloargumentowe z metaforami odzwierzęcymi w badanych tekstach spotykane są bardzo rzadko:

Czy wyhodowałam sobie ***żmiję*** *na własnej piersi?* (Makuszyński)

Киров держит за пазухой троцкистскую ***змею*** *против Сталина, а не укусит ли она самого товарища Кирова?* (Рыбаков)

Regardless of how little they earned or how tight their budgets were, they thrived on the lonely independence of their work and the satisfaction of protecting the ***underdog****.* (Grisham)

W języku polskim i rosyjskim zoomorficzny metaforyczny argument nierzadko występuje w zdaniach jednoczłonowych (bezsubiektowych – 10 przypadków w polskich tekstach, 19 w rosyjskich), natomiast w tekstach angielskojęzycznych tylko 2 razy:

A czy można dopatrzyć takiego ***zwierzaka****?* (Iwaszkiewicz)

Ciemno się jednak czyniło na duszy ludzkiemu ***źrebięciu****, kiedy tego uczynić nie było można.* (Makuszyński)

Trzeba zaś było mieć świętą, anielską cierpliwość, aby wytrzymać z gromadą rozbrykanych ***rumaków*** *bożych* (o żakach – A. Cz.)*, z całym arsenałem dynamitowych nabojów, które o wybuch przyprawia byle iskra.* (Makuszyński)

Radość zapanowała na literackiej łące, skąd wygnano ***cielęta****, które ją paskudziły niełądnie.* (Makuszyński)

– За этой ***кобылкой*** *приходится смотреть, – сводя белесые, выцветшие брови, ответил капитан.* (Задорнов)

Учить этих ***сук*** *надо.* (Нагибин)

Шароку они были ненавистны... Душить таких ***гадов*** *надо, а не*

миндальничать с ними. (Рыбаков)

Ну уж и неоплатном, – пожал плечами он. – Просто хотелось осадить этого самодовольного ***индюка.*** *(Индюк – это такая уродливая американская птица..., в переносном смысле – чванливый и глупый человек).* (Акунин)

I'll go if they really look like breaking in. But, oh, to be killed by ***swine*** *like that!* (Orwell)

Dacoits, rebels, – yes; but not these poor cringing ***rats!*** (Orwell)

W powyższych wypowiedzeniach subiekt (główny argument) nie został sprecyzowany: ma uogólniony charakter – dotyczy ludzi, społeczeństwa.

Niekiedy metaforyczny argument nie odnosi się bezpośrednio do głównego predykatu, lecz pojawia się w strukturze bardziej złożonej:

Вот маманя моя, – говорит Дуська, <u>*называя*</u> *так нежно эту* ***суку*** *паралличную, плывущую, как Хейердал, на судне в крематорий...* (Алешковский)

Как Фан Фаныч мог угрохать столько нервов и здоровья, <u>*доказывая*</u> ***суке*** *из Кащенки, что он человек с большой буквы, звучащий гордо?* (Акунин)

Что за мысли поворачивались в зажравшемся мозговом тесте, <u>*работавшем*</u> *на нескольких дебильных* ***динозавров*** *из политбюро?* (Алешковский)

'We're not going to lose clients.' Clay said, <u>*thinking*</u> *of all those nice* ***sharks*** *he'd just met out in Idaho.* (Grisham)

Wyróżnione metafory jako kolejne argumenty odnoszą się do dodatkowego implicytnego predykatu: *называет сукой, доказывает суке, работает на динозавров, (he is) thinking of sharks.*

Zwykle metaforyczny drugi argument występuje pojedynczo, czasami są to szeregi dwóch lub trzech zoomorfizmów, natomiast rekordową ilość notujemy w następującym tekście:

Вы читали "Графа Монте-Кристо"? Тогда почитайте. Специально для вас доставлена любимая моя книжечка из библиотеки Дома творчества писателей. Смешно мне стало, когда я давеча порылся там в книжках классиков и вообще достойных авторов, а потом зашел в столовую и окинул печальным взглядом ***трутней***, ***слепней***, ***клопов***, ***летучих крыс***, ***ящериц***, ***черепах***, ***раков***, ***шакалов***, ***гиен***, ***кошечек,*** *оскопленных* ***петушков***, ***хамелеонов,*** *ценимых начальством за прочно удерживаемый кожей красный цвет, посмотрел я на* ***пауков***, ***свиней***, ***буревестников,*** *прогнозирующих вечный штиль, на* ***соболей,*** *хававших себе подобных особей, на* ***волов,*** *пашущих и боронящих на тучных нацнивах,* ***на лисиц***, ***на кротов,*** *на*

ручных ***соколов*** *в наглазных повязках,* ***на грифов****, гордо, как орлы на скалах, сидящих на обглоданных до костей останках классиков, посмотрел я* ***на*** *горных* ***орлов****, клюющих с ладони тюремщиков и палачей,* ***на*** *низколобых* ***горилл****, научившихся выдумывать в неволе тексты пошлейших песен,* ***на попугаев****, говорящих за орешки и семечки: "Солженицын – дурак!", "Сахарров – враг!.."* (Алешковский)

Taka plejada metafor odzwierzęcych, nacechowanych głównie pejoratywnie, tworzy niezwykle plastyczny obraz rzeczywistości. Istotną rolę ogrywają tu również dodawane do metafor określenia, będące niejako uzasadnieniem takiej a nie innej nazwy argumentu.

Materiał badawczy potwierdza dużą różnorodność i częstość użycia zoomorfizmów w funkcji kolejnego argumentu w badanych językach. W materiale języka polskiego notujemy 40 różnych metafor odzwierzęcych w opisywanej funkcji, w rosyjskim aż 62, natomiast w angielskim tylko 20. Niektóre z nich występują kilkakrotnie, np.: *гад / гадина / гадюка / гаденыш* (15 razy), *wydra* (7 razy), *małpa*, *suka*, *голубь / голубка / голубушка / голубчик / голубик*, *сука* (5 razy), *gęś*, *rat* (4 razy), *ptaszek*, *шакал*, *bitch*, *swine*, *cat* (3 razy). Dwukrotnie pojawiają się: *bydlę*, *kociątko*, *oślica*, *piskle*, *żmija*, *zwierzyna*, *ślimak*, *акула*, *крыса*, *обезьяна*, *свинья*, *гриф*, *сокол*, *змея*, *соловей*, *bird*. Pozostałe metafory występują okazjonalnie. Pozytywne bądź pejoratywne wartościowanie dodatkowo może być modyfikowane (wzmacniane lub osłabiane) odpowiedniki określeniami: *pracowite pszczoły*, *przemiłe małpoludy*, *niepoprawna oślica*, *głupia ruda wydra*, *srogi tygrys*, *czarna owca*, *stary lis*, *ученый соловей*, *молоденькая жеребушка*, *троцкистская змея*, *ядовитая желтая гадина*, *чопорная коза*, *испуганная газель*, *nice shark*, *strong wolf*, *old fox*, *poor*, *cringing*, *little*, *frightened rat*, *stinking swine*, *ruthless bitch*.

Metafory odzwierzęce użyte w pozycji kolejnego argumentu struktury predykatowo-argumentowej odnoszą się do osoby, która w subiektywnym odczuciu nadawcy kojarzy się z określoną nazwą zwierzęcia. Identyfikacja wyznaczonej osoby osiągana jest zwykle poprzez użycie określników typu *ten*, *taki*, *этом*, *that*, *the*[7].

Różnorodność i częstość użycia metafor odzwierzęcych w poszczególnych językach w znacznej mierze wynika z odmiennego sposobu odzwiercie-

[7] H. Wróbel, *Gramatyka języka polskiego*, Kraków 2001, ss. 310–312; Z. Topolińska, *Składnia grupy imiennej*, [w:] *Gramatyka współczesnego języka...*, op. cit., ss. 302–303, 336; A. Głaz, *Jedno słowo, wiele spojrzeń. Przedimek i wielka litera w angielskim tekście artystycznym*, [w:] *Semantyka tekstu artystycznego*, red. A. Pajdzińska, R. Tokarski, Lublin 2001, ss. 261–275.

dlenia rzeczywistości pozajęzykowej w danych kulturach, natomiast motywacji podobieństw należy doszukiwać się w pokrewieństwie badanych grup językowo-kulturowych, w ich wspólnym pochodzeniu oraz historyczno-kulturowym współoddziaływaniu. Zgodnie z przewidywaniami zdecydowanie najwięcej podobieństw w zakresie wyboru określonych leksemów oraz częstości ich występowania w omawianej pozycji składniowej notujemy w materiale języka polskiego i rosyjskiego, znacznie mniej polskiego i angielskiego, natomiast najmniej wspólnych cech łączy materiał rosyjski i angielski.

Na płaszczyźnie składniowej metafora zoonimiczna jako kolejny argument funkcjonuje w badanych językach w zasadzie bardzo podobnie: występuje przy różnych predykatach, jednak najczęściej przy predykatach dwuargumentowych. Główny argument podstawowej struktury predykatowo-argumentowej bywa materialnie wyrażany rzeczownikiem (zaimkiem) bądź jest ukryty w formie osobowej predykatu lub wynika z szerszego kontekstu.

РЕЗЮМЕ

В статье описываются польские, русские и английские предложения, в структуре которых отзоонимная метафора занимает позицию очередного аргумента. Она появляется при предикатах разной семантики, коннотирующих два и больше аргументов. Имеются два типа структур: 1) в которых главный аргумент выражается материально (существительным или местоимением), 2) в которых аргумент содержится в личной форме предиката или вытекает из более широкого контекста. Очередной аргумент называет лицо, которое в субъективном восприятии говорящего своим поведением, внешним видом, чертами характера ассоцируется с определенным зоонимом.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Светлана Купрадзе
Минск

К проблеме речевых новообразований (некоторые вопросы словотворчества)

Во все времена поэты, писатели играли со словом. Художественную литературу, особенно поэтическое творчество, в определенном смысле можно рассматривать как игру. *Poiesis есть игровая функция. Поэзия в своей первоначальной функции как фактор ранней культуры рождается в игре и как игра. Это освященная игра, но в своей священности эта игра все же постоянно остается на грани необузданности, шутки, развлечения...*[1]. В начале XX века в России игра со словом породила философию зауми, основной чертой которой стало словотворчество (Велимир Хлебников, Игорь Северянин, Алексей Крученых).

Такой вид «языковой игры» как словотворчество в последние годы вызывает все больший интерес. Это связано с тем, что лингвисты осознали тот факт, что коммуникативная компетенция говорящих не сводится только к способности строить предложения, но и состоит в том, что говорящие владеют навыками создания новых лексических единиц и способны распознавать их в языке и речи.

Исследование неузуальной лексики – одна из современных тенденций в области изучения разговорной и художественной речи. Внимание языковедов сосредоточено на анализе фактов появления новых слов, изучении моделей их создания, определении их значений, стилистических функций. Объектом исследований все чаще становятся речевые

[1] Й. Хейзинга, *Homo ludens, В тени завтрашнего дня*, Москва 1992, с. 464.

степенная интенсификация цветов с усиливающейся дифференциацией тончайших оттенков цвета, во-вторых, цветовая палитра подлежала постепенной символизации и все большему сближению со звуком и запахом (то есть шла по пути синкретизма чувств, синэстетической полноты художественного восприятия). В фетовском поэтическом мире, как утверждает Пивоварска, цвета определяют не только предметы и явления природы, но также характеризуют чувства, впечатления и состояния. Специфический синкретизм мировосприятия поэта наделяет свето-цветовым ореолом звуки (*гаснущие звуки*), тишину (*серебряная тишь*), чувства (*светлая грусть*) и другие непривычные для нахождения в них подобных качеств объекты. Выделяя из цветов, наиболее употребляемых в фетовской художественной палитре, три излюбленные цвета, составляющие своеобразную колористическую доминанту лирика-импрессиониста, Пивоварска относит к ним сочетание из красного, голубого и золотого, их *хроматическую колористическую триаду* (*chromatyczna triada kolorystyczna*), являющуюся, по мнению польского литературоведа, основой семантической структуры поэтического мира фетовских стихов. Золото (а также частое у Фета серебро), связываясь Пивоварской с астральной, солярной символикой, несет на себе, по ее мнению, тепло и гармонию лета, солнца, роскошь зрелых хлебов. Голубой цвет, кроме своего непосредственного значения, имеет у лирика также «трансцендентальный» оттенок чего-то абсолютного, высшего, не поддающегося пониманию в земных категорях. И, наконец, красный, как свидетельствует Пивоварска, является для Фета эквивалентом любви, страсти, жизни, чувственности (что связано, например, с символикой розы). Цвет этот, неся в лирике автора «Соловья и розы» сложную семантическую нагрузку, может, в зависимости от художественного замысла поэта, иметь значение метафорическое, символическое или же нести на себе *миметическую функцию* (*funkcja mimetyczna*), сводящуюся к передаче натурального качества описываемого предмета или явления. Красный цвет, связываясь ассоциативно с огнем, пламенем, пожаром, а также с блеском молнии, светом, зарей, имеет наиболее широкий спектр применения в фетовской цветовой палитре, окрашивая поэтический мир его стихов красками от теплых розоватых тонов неба до зловещих кроваво-красных всполохов ночного пожара. Цвет этот привносит в фетовские строки собственную пульсацию[27].

[27] D. Piwowarska, *Malarskie widzenie świata w poezji Afanasija Feta*, s. 123, 131–133.

Живописное видение мира поэтом и его синэстетическаю манера оперировать вербально-визуальными средствами художественного выражения находит свое отражение, например, в стихотворении «Воздушный город». Цветовую палитру данного поэтического произведения составляют розовые, золотые и белые краски, в своем просветленно-воздушном сочетании передающие ирреальность причудливой гряды облаков, напомнившей поэту своей конфигурацией прекрасный город. Характерно, что здесь отсутствует традиционный для неба цвет голубой, замененный «воздушным» «белым». Как отмечает Пивоварска, голубой, имея для Фета трансцендентальную семантику, видимо, исключен из колористической палитры данной поэтической картины умышленно – «белый» лишен таинственной возвышенности «голубого»; несмотря на всю свою чистоту, он, все-таки, не достаточно глубок по сравнению с небесной лазурью. Это явное отсутствие голубого в «колористической триаде» фетовского цветописания как бы призвано вторить заключительным словам стихотворения, разрушающим идиллию созерцания поэтом феерического явления – *Там кто-то манит за собою – Да крыльев лететь не дает*! Нет неба – нет и крыльев.

Одухотворяюще-возвышенное значение голубого цвета подтверждают следующие фетовские строки:

Она

Две незабудки, два сапфира –
Ее очей приветный взгляд,
И тайны горнего эфира
В живой лазури их сквозят.

Ее кудрей руно златое
В таком свету, какой один,
Изображая неуемное,
Сводил на землю Перуджин.(320–321)

Здесь присутствуют и «лазурь», передающая «тайны горнего эфира», и «руно златое», излучающее яркий свет, но, как и в предыдущем стихотворении, бросается в глаза отсутствие третьего основного цвета фетовской излюбленной цветовой «триады» – красного. Зная семантическую нагрузку, которой Фет наделил этот цвет, объяснение опять напрашивается само собой: поэт хочет показать бесстрастность своего восхищения красотой женщины, которой посвящены его строки. Достаточно вспомнить историю создания данного стихотворения, чтобы убедиться в правильности подобной интерпретации: посвященное жене К. Р., великого князя, произведение это исключало малейшие

намеки на любовь, страсть, чувственность или хотя бы сердечное влечение со стороны поэта, тогда уже – старца.

Упоминание поэтом имени Перуджино, итальянского живописца, учителя Рафаэля, которое подчеркивает бесстрастно-почтительное отношение автора строк к их адресату, сродни благоговейному прикосновению кисти Рафаэля, пишущего Мадонну.

Видимо, недостаток какой-либо из этих трех основных «красок» поэтом воспринимался как признак несовершенства, своего рода неполноценности, недостаточности, неизбежно находящей отражение и в поэтическом воплощении, равно как и в эстетическом восприятии этого воплощения:

Как трудно повторять живую красоту
Твоих воздушных очертаний;
Где силы у меня схватить их на лету
Средь непрестанных колебаний?

Когда из-под ресниц пушистых на меня
Блеснут глаза с просветом ласки,
Где кистью трепетной я наберу огня?
Где я возьму небесной краски?

В усердных поисках всё кажется: вот-вот
Приемлет тайна лик знакомый, –
Но сердца бедного кончается полет
Одной бессильною истомой. (319)

Чтобы передать «живую красоту», поэту не достаточно «огня» красного и «небесной краски» голубого, то есть он констатирует то, что его поэтическая палитра кажется ему значительно беднее «воздушных очертаний» и «непрестанных колебаний» «живой красоты».

Все три излюбленные цвета поэтической фетовской колористики находят свое соединение в лирической миниатюре «На лодке». Гармония внешнего мира, гармоничные отношения с любимой и внутренняя, душевная гармония лирического «я» стихотворения нашли свое выражение в полноцветном сочетании красок фетовской цветовой «триады», отмечаемой Пивоварской.

Небезынтересна и другая работа польской исследовательницы, в которой она поднимает проблему экфрасиса в фетовской лирике[28].

[28] D. Piwowarska, *Ekphrasis w poezji Afanasija Feta*, [w:] *Dialog sztuk w kulturze słowian wschodnich*. Red. J. Kapuścika, Kraków 2002.

Понятие это, используясь в узком и широком смыслах, означает, соответственно, описание произведения искусства, возведение в ранг особого литературного жанра или описание как таковое, содержащееся в тексте литературного произведения. В качестве литературоведческого термина экфрасис как жанр в литературе подразумевает подчиненность слова образу, а образа, в свою очередь, – описанию этого образа. Слова в такой зависимости приобретают медиальное значение (у Пивоварской – «medium») и принимают непосредственное участие в переложении объектов описания на *знаки* этих объектов, способные их отражать в новом, вербально-визуальном качестве[29].

Как сигнализирует Пивоварска в своей работе, экфрасис у Фета присутствует и поддается литературоведческому рассмотрению сразу на нескольких уровнях его поэтики: эстетическом, языковом (*językowo-poetycka płaszczyzna*), семиотическом и на уровне культурного контекста (*kontekstowo-kulturowa płaszczyzna*)[30]. Стихи-экфрасисы, по мнению литературоведа, составляют отдельное поэтическое направление в рамках жанра антологической лирики Фета и являются специфическими словесными описаниями произведений античного искусства, чаще всего скульптур и картин. Явление экфрасиса в фетовских текстах, причисляемых к данной категории антологических стихотворений наблюдается как в подробном «миметическом» описании произведений искусства, так и абстрагировании от предметности, от видимой сути описываемого объекта и в проникновении «вглубь», в суть вещей, продиктованном потребностью поэта в поиске их *извечного смысла и красоты*[31].

Осуществляется связь между поэзией и другими видами искусства: экфрасисы Фета – это всегда его авторское преломление античности, возведение древних шедевров искусства в своеобразные *знаки* античной культуры. В противопоставлении красоты языческой древнегреческой культуры уродливости современной поэту цивилизации Фет утверждал эстетический эталон, зиждущийся на непреходящих ценностях и воспринимал средиземноморскую античность как идеал, образец и норму истинного артистизма. Своеобразное пигмалионовское «оживление» прекрасных статуй, которое осуществлялось Фетом в его антологии (*мотив оживления скульптуры*) имело, по мнению Пивоварской, для автора «Дианы» своего рода символическое, культовое

[29] D. Piwowarska, *Ekphrasis w poezji Afanasija Feta*, s. 73, 74.

[30] Там же.

[31] Там же, с. 84.

значение – поэт воскрешал идиллический край неотразимой в своей простоте эллинской культуры. Все фетовские стихотворения-экфрасисы, являясь поэтическими описаниями скульптур или полотен с мифологическим сюжетом, содержат в себе особые метаязыковае знаки (*znaki metajęzykowe*), служащие своеобразными показателями наличия экфрасиса в них. К таким знакам Пивоварска причисляет, во-первых, заглавия, тождественные со знаменитыми произведениями искусства Древней Греции, во-вторых, упоминание авторов описываемых шедевров в подзаголовках стихотворений данной категории, и, в-третьих, содержание в поэтических текстах элементов описания. Развитие сюжетной линии фетовских экфрасисов происходит по своего рода шаблону наложения нескольких планов: от общего плана, через описание деталей к заключительной констатации бессмертия шедевра. При этом, как считает Пивоварска, поэт создавал пространственно-временную перспективу от настоящего, «застывшего» на миг в момент его созерцания (мотив этот Пивоварска определила как *motyw trwania*), по направлению к прошлому (экскурс в мифологию) и к будущему (сопоставление времени – и вечности). Описания скульптурной композиции при этом были для Фета особо характерны в силу универсальности их тематического материала: скульптура, являясь своего рода *фиксацией момента*, позволяет сохранить тот же принцип и при ее словесном описании, осуществляя моментальное закрепление в вечности прекрасной стороны объекта. Такие стихотворения, отражающие красоту произведений искусства в духе платоновского понимания ее как гармонии, меры и пропорции, имеют, по мнению Пивоварской, двойную семантику: первое значение – сама скульптура, и другое – мифологический персонаж, представляемый ею. И, если скульптура рисуется поэтом в ее статике, ее красота передается автором стихотворений в динамике, описание действия божества, представленного изваянием создает иллюзию его движения, «оживляет» неподвижность камня. Отклонением от устоявшейся поэтической манеры Фета представлять именно так объекты экфрасиса Пивоварска считает знаменитую антологическую миниатюру «Диана», в которой художественный мир выходит за рамки античности за счет самообнаружения в тексте «я» поэта, смещающего мифологический хронотоп в сторону субъективной лирики. Балансируя между иллюзорным миром богов и реалистичностью настоящего времени, привнесенного лирическим «я», образ богини перестает восприниматься и как скульптура, и как мифический персонаж, все более приближаясь к реальности живого существа. Демонстративное появление мифического героя в стихах-экфрасисах способствовало,

как замечает исследовательница, усилению лирической стихии в антологической сдержанности фетовских стихотворений этого жанра, что обогащало их субъективными, эмоционально насыщенными впечатлениями от «живой» красоты неживых объектов. Подобное типично-фетовское решение антологического жанра Пивоварска определяет как его несомненную романтическую «психологизацию», осуществляемую поэтом-импрессионистом[32].

Сравним теперь два фетовских стихотворения-экфрасиса («Диана, Эндимион и Сатир (картина Брюллова)», «Аполлон Бельведерский»), являющихся классическими образцами этого жанра.

Антологическое описание картины Брюллова, одноименной с фетовским стихотворением, имеет все черты экфрасиса, указанные Пивоварской. Текст данной поэтической миниатюры представляет собой подробное описание полотна, иллюстрирующего мифологический сюжет. Мотив «оживления» изображения богини Дианы представлен здесь одной поэтической строкой-восклицанием, как бы разрушающей добросовестную описательность всего текста в целом: *О, как вздрогну́ла ты, как обернулась вдруг!* Лирическое «я» в данном произведении практически ничем не проявляет себя, кроме одной скупой реплики: *Я слышу стук копыт.*

Типично-экфрасисное описание античной статуи Аполлона, поражавшее обилием деталей еще современников, воспринимается несколько тяжеловесно, громоздко, напоминая, скорее, не описание мраморной скульптуры, а описание насыщенной подробностями картины[33]. Впечатление монотонной описательности усиливается заключительным сравнением, далеким от античной легкости, а также полным отсутствием «я» поэта. Мотив «оживления» (*motyw ożywienia rzeźby*) здесь обнаруживается с большой натяжкой в строке *Победою усилено дыханье*, приписывающей неживому объекту описания (статуя Аполлона) свойство живого существа (Аполлон учащенно дышит, разгоряченный стрельбой из лука). Шедевром, сочетающим в себе черты экфрасиса и поэтичнейшую лиричность, присущую всем лучшим фетовским стихотворениям, является также, несомненно, ставшая хрестоматийным эталоном антологического жанра, прославившая поэта, его «Диана».

---

[32] D. Piwowarska, *Ekphrasis w poezji Afanasija Feta*, s. 75–77, 79, 80, 83.

[33] В бухштабовских комментариях к стихотворению содержится информация о том, что еще Тургенев отзывался о нем нелестно: «Стихотворение Ваше «Аполлон» – мне не очень нравится. «Слишком старательно, мелко-подробно и общего впечатления не передает», [в:] А. А. Фет, *Полное собрание стихотворений*, с. 802.

Подытоживая осуществленный нами краткий обзор научных материалов, касающихся Фета и представленных в вышеизложенной работе, мы не можем не заметить, однако, что на сегодняшний день в польском литературоведении не все аспекты фетовской поэзии освещаются равномерно: существуют такие ее стороны, которые или вовсе не затрагиваются современными исследователями, или же появляются вскользь, в общих чертах. Такими сторонами лирического наследия Фета являются тематические блоки, посвященные любви к природе, остающиеся до сегодняшнего момента той областью, в которой со времен советских критиков (Борис Бухштаб, Дмитрий Благой) польскими литературоведами проводится, к сожалению, непропорционально мало исследований по отношению к проблемам, решаемым в работах Я. Чиквина и Д. Пивоварской.

S T R E S Z C Z E N I E

W artykule ukazane są podstawowe kierunki badań tekstów poetyckich Afanasija Feta w skali megatekstu poety, które uwidoczniły się w najnowszych pracach polskich literaturoznawców. Jan Czykwin, zajmujący się przede wszystkim teoretycznymi aspektami interpretacji liryki Feta, wpisuje tę lirykę w ogólny kontekst historycznoliteracki popuszkinowskiej epoki. Zaś Danuta Piwowarska koncentruje swoją uwagę na problemach synestezji poetyckiej, a także na występowaniu w niej ekfrazy jako jednej z najbardziej charakterystycznych, według niej, cech stylu rosyjskiego poety.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

Сняжана Асабіна
Гродна

Словаўтваральныя і марфалагічныя варыянты фразеалагізмаў у творах Янкі Купалы

Як паказана ў некаторых даследаваннях, каля 31 працэнта фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ахоплена з'явай варыянтнасці[1]. Калі ж звярнуцца да твораў Я. Купалы, то ў іх працэнт фразеалагічных варыянтаў будзе яшчэ большы.

Звычайна вылучаюць 8 тыпаў варыянтаў: лексічныя, фанетычныя, акцэнтныя, акцэнтна-фанетычныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, канструкцыйна-колькасныя, камбінаваныя[2]. Аднак пры даследаванні мовы твораў пісьменніка сярод кожнага тыпу можна вылучыць дадаткова тры разнавіднасці варыянтаў.

Да першай адносяцца агульнамоўныя, агульнаўжывальныя варыянты, тоесныя ў сэнсавых і стылістычных адносінах і ўзаемазамяняльныя ў любым кантэксце. Напрыклад, у Я. Купалы нароўні з фразеалагізмам *песенька спета* 4 разы сустракаецца словаўтваральны варыянт гэтага выразу *песня спета*: *"Спета Юркі песня, Ўсё пайшло па свеце. Жонка ў пясочку, Людзям служаць дзеці"*[3].

Другую групу складаюць варыянты, выкліканыя версіфікацыйнымі мэтамі, патрабаваннямі рытму ці рыфмы. Такіх варыянтаў у творах Я. Купалы даволі шмат. Як вядома, у беларускай літаратурнай мове нарматыўным лічыцца ўжыванне суфіксаў *-ці*, *-чы*, *-ць* у інфінітыве,

---

[1] Гл.: І. А. Хлусевіч, *Варыянтнасць фразеалагізмаў у сучаснай беларускай мове*, Гродна 2002, с. 22.

[2] Тамсама, с. 22.

[3] Янка Купала, *Поўны збор твораў*, Мінск 1995–2003, т. 6, с. 49.

прычым *-ць* ужываецца пасля галоснага гука (*глядзець*), *-ці* – пасля зычнага (*несці*), *-чы* – пасля *г*, *к*, *х* (*секчы*). Аднак пісьменнік часта ўжывае ў інфінітыве суфікс *-ці* пасля галоснай (*як відаці; як слова сказаці; кроў ліці; рукі складаці; памянуці добрым словам*), таму што гэта абумоўлена рыфмай: *"Няма Гонты; як відаці, Спявацi не смее Ў гэтым часе"*[4]. У дадзеным прыкладзе замест нарматыўнага фразеалагізма *як відаць* ужыты яго словаўтваральны варыянт *як відаці*. Сярад марфалагічных варыянтаў таксама нямала тых, якія спецыяльна ствараюцца Я. Купалам дзеля рыфмы: *"Не будзе, не будзе тады Вайны, калатні між людзей; Дзяўчына, юнак малады Не зложаць без часу касцей"*[5]. Я. Купала замест фразеалагізма *злажыць косці* ўжывае яго марфалагічны варыянт *злажыць касцей*. Падобныя прыклады яшчэ раз падцвярджаюць той факт, што "вершаваная мова адрозніваецца ад празаічнай наяўнасцю рытму, рыфмы і страфы, больш складанай арганізаванасцю... Адбіраючы самыя неабходныя для данай моўнай сітуацыі словы і фразеалагізмы, падпарадкоўваючы іх пэўнаму рытмічнаму памеру, замацоўваючы радкі рыфмай, паэты імкнуцца пераадолець "супраціўленне" моўнага матэрыялу, а там, дзе гэта не зусім удаецца, карыстаюцца традыцыйнай "паэтычнай вольнасцю". Таму ў вершаванай мове звычайна часцей, чым у празаічнай, сустракаюцца разнастайныя адхіленні ад нормы"[6]. У творах Я. Купалы версіфікацыйныя варыянты не з'яўляюцца грубым парушэннем, а ўспрымаюцца як нязначныя індывідуальна-аўтарскія адхіленні ад нормы, выкліканыя спецыфікай вершаскладання.

Трэцяя група – гэта індывідуальна-аўтарскія варыянты, створаныя самім пісьменнікам на аснове агульнаўжывальных фразеалагізмаў. Асабліва часта такія варыянты сустракаюцца ў ранніх творах паэта, напісаных у той час, калі нормы беларускай літаратурнай мовы толькі складваліся. Можна цалкам пагадзіцца з меркаваннем В. А. Ляшчынскай, што Я. Купала "сваёй творчасцю выяўляў і фіксаваў заканамернасці і жывыя тэндэнцыі развіцця роднай мовы і такім чынам спрыяў выпрацоўцы нормаў літаратурнай мовы"[7]. Пісьменнік актыўна ствараў шматлікія варыянты з новымі, іншымі, чым у літаратурнай мове, словаўтваральнымі сродкамі (*дайсці да ладу* –

[4] Янка Купала, *Поўны збор твораў*, т. 6, с. 328.

[5] Тамсама, т. 5, с. 94.

[6] І. Я. Лепешаў, *Фразеалогія сучаснай беларускай мовы*, Мінск 1998, с. 240.

[7] В. А. Ляшчынская, *Слова ў паэзіі Янкі Купалы*, Мінск, 2004, с. 126.

прыйсці да ладу; надзець маску – уздзець маску; кроў зайграла – кроў узыгралася).

Далей ўвага будзе звернута толькі на словаўтваральныя і марфалагічныя варыянты фразеалагізмаў, прычым толькі на варыянты першай з трох названых вышэй разнавіднасцей.

Словаўтваральныя і марфалагічныя варыянты разам з фанетычнымі, акцэнтнымі, акцэнтна-фанетычнымі некаторыя даследчыкі лічаць фармальнымі. У іх змяненні адбываюцца толькі ў межах аднаго кампанента і змяняюць адзін яго бок (акцэнтны, фанетычны, словаўтваральны, марфалагічны). Фармальныя варыянты "не з'яўляюцца ні паказчыкамі тых ці іншых граматычных катэгорый у фразеалагізме, ні формамі выражэння адносін і сувязей фразеалагізма са словамі ў маўленні... Замена аднаго фармальнага варыянта кампанента другім не змяняе катэгарыяльнай характарыстыкі фразеалагізма"[8]. Звернемся спачатку да словаўтваральных варыянтаў (яны адрозніваюцца словаўтваральнай структурай аднаго з кампанентаў). Такіх варыянтаў у творах пісьменніка налічваецца больш за 60.

Пераважае варыянтнасць кампанента-дзеяслова (33 ужыванні). Гэта можна вытлумачыць тым, што дзеяслову ў параўнанні з іншымі часцінамі мовы ўласціва багатая сістэма словаўтварэння.

У большасці выпадкаў вар'іруюцца тыя дзеяслоўныя кампаненты, якія ўжываюцца ў форме закончанага і незакончанага трывання: *аблівацца (залівацца) слязамі – абліцца (заліцца) слязамі; даваць (задаваць) пытлю – даць (задаць) пытлю; падымаць (узнімаць) вочы – падняць (узняць) вочы.*

Некаторыя дзеясловы, нягледзячы на здольнасць ўтвараць трывальныя пары, у фразеалагізмах вар'іруюцца толькі ў межах аднаго трывання: *ліць (праліваць) слёзы – праліць слёзы; ліць (праліваць) пот – праліць пот; асушваць (асушаць) слёзы– асушыць слёзы; сыходзіць (сходзіць) з поля – сысці з поля; укладваць (укладаць) у вусны – укласці ў вусны.* Могуць ўзаемазамяняцца дзеяслоўныя кампаненты, якія ў складзе фразеалагічнай адзінкі рэалізуюць граматычнае значэнне або толькі закончанага, або толькі незакончанага трывання: *западаць у вока – упадаць у вока; нічога не зробіш – нічога не паробіш; утапіць у крыві – патапіць у крыві.* Дзеяслоўныя кампаненты ў словаўтваральных варыянтах звычайна ўжываюцца ў дзвюх разнавіднасцях: *нарадзіцца ў кашулі – радзіцца ў кашулі; пайсці ў ма-*

[8] А. И. Молотков, *Основы фразеологии русского языка*, Ленинград 1977, с. 69.

гілу – сысці ў магілу. У творах Янкі Купалы ёсць і фразеалагізмы, у якіх дзеяслоўны кампанент выкарыстоўваецца ў трох і больш разнавіднасцях: *як вокам кінуць (акінуць, скінуць, глянуць, сцяць); кроў льецца (ліецца, лілася, пральецца); хоць разарвіся (парвіся, падарвіся)*: [Даміцэля:] *"Звалаклася недзе, а тут адной мне хоць падарвіся: ні вады каму прынесці, ні ў хаце прыбраць"*[9].

Даволі пашырана і ўзаемазамена назоўнікавага кампанента (12 ужыванняў). Словаўтваральны варыянт можа мець іншую стылістычную афарбоўку, дадатковую экспрэсію ў параўнанні з зыходным фразеалагізмам. Розныя адценні надаюцца пры дапамозе памяншальна-ласкальных суфіксаў: *замарыць чарвяка – замарыць чарвячка; на мінуту – на мінутку; не жарты – не жартачкі; парыць у зямлі косці – парыць у зямельцы косці.* У некаторых фразеалагізмах Я. Купала ўжывае варыянт без памяншальна-ласкальнага суфікса: *падстаўляць ножку – падстаўляць нагу; у пяткі закалола – у пяты закалола; на цыпачках – на цыпках.* У двух выпадках варыянты адрозніваюцца наяўнасцю ў назоўнікавым кампаненце суфікса *-j-*, які ў выніку асіміляцыі папярэднім зычным перадаецца праз падаўжэнне гэтага зычнага: *апусціць крылы – апусціць крылле; расправіць крылы – расправіць крылле*[10].

Сустракаецца толькі адзін прыклад замены прыметнікавага кампанента: *кароткі пяты – закароткі пяты* ў п'есе "Тутэйшыя" ў маўленні Янкі Здольніка: *"З гэтага нічога не выйдзе, пане вучоны. Бо абхапіць гэтае "далей" закароткі вашы пяты"*[11].

Варыянты прыслоўных кампанентаў адрозніваюцца суфіксам: *тым больш – тым болей; так ці інакш – так ці іначай; як не трэба лепш – як не трэба лепей.* У фразеалагізмах са словаўтваральнай варыянтнасцю сустракаюцца таксама змяненні прыназоўнікавага кампанента: *між іншым – паміж іншым* (6 ужыванняў). Варыянты *хай бог крые – няхай бог крые* з'яўляюцца вынікам вар'іравання кампанента, суадноснага з часціцай.

Марфалагічных варыянтаў налічваецца каля 45. Яны адрозніваюцца граматычнай формай кампанентаў. У творах Я. Купалы ўсе марфалагічныя варыянты звязаны з заменай кампанентаў-назоўнікаў. Часцей за ўсё гэта замены формаў ліку ці склону.

---

[9] Янка Купала, *Поўны збор твораў*, т. 7, с. 186.

[10] Гл.: І. А. Хлусевіч, *Варыянтнасць фразеалагізмаў у сучаснай беларускай мове*, с. 57–58.

[11] Янка Купала, *Поўны збор твораў*, т. 7, с. 295.

У 13 выпадках вар'іраванне назоўнікавага кампанента звязана з заменай ліку: множнага – адзіночным (*не за гарамі – не за гарой; спакон вякоў – спакон веку; не на жарты – не на жарт; на высокіх нотах – на высокай ноце*) ці адзіночнага множным (*мераць вокам – мераць вачамі; слінка цячэ – слінкі цякуць*). Дадзеныя фразеалагізмы свабодна ўзаемазамяняюцца ў любым кантэксце.

У многіх фразеалагізмах вар'іруюцца саматычныя кампаненты (называюць часткі чалавечага цела). Выяўлена, што калі кампанент называе парныя органы ці часткі цела (вочы, рукі, ногі, вушы і інш.), то яму ўласціва ўзаемазамена лікавых формаў[12]. Напрыклад, фразеалагізм *не спускаць вачэй* мае марфалагічны варыянт *не спускаць вока* і можа ўжывацца ў выпадках, калі гаворыцца і пра аднаго чалавека, і пра некалькіх: [Фуртыянка:] *"Брама моцная, дубовая, і акутая жалезнымі штабамі... Прытым я ключы заўсёды маю пры сабе і не спускаю вока..."*[13]. Калі саматычны кампанент абазначае нянарны орган ці частку цела, ён вар'іруецца тады, калі гаворка ідзе не пра адну асобу, а пра некалькіх. Напрыклад, выраз *закруціць галаву* ўжываецца ў выглядзе *закруціць галовы*, бо мае дачыненне да некалькіх асоб: [Кароль:] *"Ці табе ў вачах маяча, Каб раўняці дзеўку тую,Нерухавую, брыдкую, Да парыжскіх ненаглядак, Што сваёй красою, складам Цэлы свет змагчы гатовы, Ўсім закручваюць галовы?"*[14].

Калі ж звернемся да вар'іравання склонавых канчаткаў у назоўнікавых кампанентах (14 ужыванняў), то заўважым, што найчасцей замена назіраецца ў творным склоне множнага ліку: *паціснуць плячамі – паціснуць плячыма; аблівацца слязамі – аблівацца слязьмі; абводзіць вачамі – абводзіць вачыма; сваімі вачамі – сваімі вачыма*. Падобная ўзаемазамена адбываецца па той прычыне, што ў творным склоне множнага ліку словы свабоднага ўжывання таксама могуць мець варыянтныя канчаткі *-амі*, *-ыма*, *-мі*.

Вар'іраванне сустракаецца і ў творным склоне адзіночнага ліку: *наліцца кроўю – наліцца крывёю; змешваць з граззю – змешваць з газёю*. Ёсць адзін прыклад узаемазамены формы вінавальнага склону творным: *костка ў горле – косткай у горле*.

---

[12] Гл.: І. А. Хлусевіч, *Варыянтнасць фразеалагізмаў у сучаснай беларускай мове*, с. 62.

[13] Янка Купала, *Поўны збор твораў*, т. 9, ч. 1, с. 91.

[14] Тамсама, т. 9, ч. 1, с. 208.

У 11 фразеалагізмах вар'іруюцца формы назоўнага і старажытнага клічнага склону: *не дай Бог – не дай Божа; крый Бог – крый Божа; дай Бог – дай Божа.*

Як бачым, Я. Купала шырока карыстаецца словаўтваральнымі і марфалагічнымі варыянтамі, як, дарэчы і іншымі тыпамі фразеалагічнай варыянтнасці, што сведчыць пра выдатнае веданне народнай фразеалогіі і ўменне выкарыстоўваць яе ў сваіх творах.

SUMMARY

In this article word-formation and morphological variants of phraseological units in products of Yanka Kupala are analyzed. The special attention addresses on common normative variants of phraseological units than meet in products of the writer, the individual – author's variants specially created by the author, and the variants caused by requirements of a rhyme also are characterized.

RECENZJE

Ян Чыквін, Па прызванні і абавязку. Літаратурна-крытычныя артыкулы, Беласток 2005, сс. 236

Кола творчых зацікаўленняў паэта, празаіка, перакладчыка, галоўнага рэдактара "Тэрмапілаў", старшыні БЛА "Белавежа", даследчыка літаратуры Яна Чыквіна насуперак назве аднаго з яго апошніх вершаваных зборнікаў не мае выразнай "крэйдавай" акрэсленасці (Ян Чыквін, Крэйдавае кола, Беласток 2002), характарызуецца рэдкай для сучаснасці незамкнёнасцю ў перадачы света- і словаруху. Шматграннасць выяўлення мастакоўскай індывідуальнасці ўзмацняецца нязмушанасцю, свабодай міжжанравых і міжгаліновых пераходаў, што кожны раз сведчаць пра талент і плён здзяйснення адоранай асобы. Яе творы-акорды здольныя скласці *Сонечную месу*, кожны раз імкнуцца агучыць *парыў асонцаяўлены ў суправаджэнні хора* (53), шукаюць і адшукваюць таямніцы быцця – гэтае *вечнае перастварэнне нябёсаў* – праз *формулу навелы, у яе адкрыта-рухлівым сюжэце* (52), праз асэнсаванне лёсаў і напісанага іншымі мастакамі слова.

Не будзе сумніўным заключэнне адносна таго, наколькі непарушным для большасці даследчыкаў з'яўляецца няпісанае правіла аб недатыкальнасці аўтарытэтаў класікаў літаратуры ці нават спроба перагляду асобных момантаў іх творчасці, жыццяпісу. Таму зварот Яна Чыквіна да адкрытага і прыхаванага, але ад гэтага не менш вострага, прынцыповага ідэйна-эстэтычнага супрацьстаяння Янкі Купалы і Максіма Багдановіча ў артыкуле *Два шляхі беларускай паэзіі* пры ўсёй адрознасці чытацкага ўспрымання не можа не выклікаць пачуцця шчырай павагі. Заслужанасць апошняй узмацняецца як лагічнай разважлівасцю самога аўтара,так і доказнасцю яго спасылак на біяграфічныя, гістарыяграфічныя, крытычныя і літаратуразнаўчыя працы, апублікаваныя ўспаміны сведкаў тагачасных падзей, палемічнасцю выкладу меркаванняў аўтарытэтных сучасных даследчыкаў Анатоля Сідарэвіча, Ірыны Багдановіч і іншых. Безумоўна тое, што ні крытычнасць закідаў Яна Чыквіна, ні рэзкае разыходжанне яго меркаванняў з агульнапашыранымі ў навуцы пра літаратуру не ставяць за мэту звяржэнне з п'едэсталаў некага з абодвух заслужаных карыфеяў нацыянальнага прыгожага пісьменства. Але несумненна і тое, што *кожны з іх з самага пачатку выпраменьваў "забойчую" для другога творцы моцна скандэнсаваную энергію; яны вытварылі кожны сваё сілавое поле. І як дзве непаўторныя і непадобныя творчыя індывідуальнасці яны былі жывымі дзейнікамі двух кірункаў, двух шляхоў развіцця мастацкай літаратуры...* (11) Адрознасць фармальна-мастацкай і свядомасна-тэарэтычнай канцэпцый Купалы і Багдановіча ў поглядах на далейшае глыбіннае і плённае выспяванне нацыянальнай літаратуры,

ролю творцы ў сацыяльным і культурным жыцці, самабытнасць талентаў і паэтычнага ўвасаблення, шмат у чым, як разважае пра тое на пачатку артыкула Ян Чыквін, нагадвае светапоглядныя і эстэтычныя разыходжанні іх папярэднікаў – прадстаўнікоў *"верхняга" і "нізавога" шляхоў* (10) – В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча. Слушнасць такога сцверджання падмацоўваецца ўсімі наступнымі, у тым ліку і цяперашнім, перыядамі развіцця прыгожага пісьменства і толькі лішні раз даказвае апраўданасць сённяшняга рэтраспектыўнага звароту да нязменна актуальных у розныя эпохі праблем, сведчыць пра пераканаўчасць назіранняў аўтара з Беласточчыны адносна вызначальнай ролі двух, у многім палярных, купалаўска-багдановічаўскіх – *"някрасаўскага" творчага імператыву* і паэзіі *высокага мастацкага ўзроўню* (18), "чыстае красы" – літаратурна-эстэтычных прынцыпаў. Раўнаважнасць талентаў, узаемапатрэба для пераўтварэння ў волатаў, плён суперніцтва іх прадстаўнікоў, як і моц акрэсленых імі кірункаў далейшага руху *краснай пісьменнасці*, найлепш выяўлена адным з самых непрадузятых суддзяў – часам, што не адмаўляецца дагэтуль ад вынесенага раней: *А трэба ім прарока* (*Крэйдавае кола*, с. 26).

У свой час сапраўднай з'явай у літаратуразнаўстве стала даследаванне Яна Чыквіна *Далёкія і блізкія. Беларускія пісьменнікі замежжа* (Беласток, 1997). Толькі непадробнасцю і глыбінёй інтарэсу, жаданнем яшчэ раз угледзецца і дагаварыць незаўважанае раней, важка прааргументаваць, падсумаваць і нанова прачытаць творы адарваных па розных прычынах ад Радзімы аўтараў з дапамогай самых розных аспектаў сістэмна-цэласнага аналізу, метадалагічных прынцыпаў, асобаснага стаўлення, як і імкненнем суаднесці з імі набыткі літаратуры Беласточчыны, некаторыя эстэтычныя з'явы і гістарычныя факты з жыцця і творчых стасункаў класікаў айчыннага прыгожага пісьменства, можна растлумачыць з'яўленне асобнага раздзела падобнай тэматыкі ў нядаўняй кнізе літаратурна-крытычных артыкулаў даследчыка *Па прызванні і абавязку*.

Падаецца істотным удакладніць, што ўтрыманая ў назве зборніка, нязменна актуальная на працягу ўсяго функцыянавання беларускага мастацтва слова, энергаёмістая і сутнасна вычарпальная характарыстыка актыўнай творчай асобы як асобы ў той або іншай ступені эстэтычна і сацыяльна заангажаванай аднолькава адносіцца і да прадстаўленых у кнізе пісьменнікаў, і да самога аўтара. Праўда, апошняе тлумачыцца не столькі прыхільнасцю Яна Чыквіна да апалагетаў прынцыпу непарыўнасці паняццяў "паэт-грамадзянін", колькі памкненнем адчуць і перадаць самыя тонкія нюансы рэалізацыі мастацкіх задум па-сапраўднаму цікавых для яго пісьменнікаў, выразна ўсвядомленай пазіцыяй да максімальнай аб'ектыўнасці ў перадачы трагізму іх лёсаў, што патрабуе адначасовай адстароненасці і погляду знутры, г.зн. амаль поўнага зрастання, атаясамлівання творцы з яго героямі-творцамі. А інакш як перадаць іх бясконцыя, ачышчаныя агнём, звароты да Бога і Біблії, душэўныя, экзістэнцыйныя, маральныя пакуты-зрухі, як, калі не шчырай захопленасцю і ненадуманай спагадай, прымусіць сённяшняга, спакушанага мастацка-эстэтычнымі прыёмамі, фармальнай віртуознасцю чытача спасцігнуць недаравальныя для нас усіх драмы выкінутых і спісаных на міжбярэжжа, няўмольныя абставі-

ны талентаў, *страты імі цвердзі пад нагамі, поўнай дэзарыентацыі ў свеце і часе і пакінутасці толькі на волю лёсу* (78).

Тым не менш, варта зазначыць, што найгалоўнейшы клопат і інтарэс для Яна Чыквіна складае ўласна мастацкая творчасць такіх блізкіх і высокіх па творчых патэнцыях, крэатыўным пачатку, тонкасці паэтычнага светаадчування, перадачы прыродных малюнкаў, іх празрыстай элегічнай вобразнасці і прыцягальнасці аўтараў, як Наталля Арсеннева, Масей Сяднёў, Янка Юхнавец, іншыя прадстаўнікі беларускай эміграцыйнай паэзіі. Разгорнуты і ўдумлівы аналіз творчасці пералічаных аўтараў, надзвычай рознабаковае і шматузроўневае – ад развагаў пра сэнсавую выразнасць, назіранняў над вобразна-паэтычнымі малюнкамі, сімволікай, метафарычнасцю да асаблівасцей рытміка-сінтаксічнага складу – прачытанне мастацкіх тэкстаў пісьменнікаў-эмігрантаў не толькі ўяўляе сабою рэдкі на сёння узор філасофска-літаратуразнаўчага сінкрэтычнага эсэістычнага даследавання, але і робіцца своеасаблівым метадалагічным дапаможнікам для спасціжэння загадкавай у яе шматлінейным выражэнні амплітуды творчай парадыгмы самога аўтара. Маюцца на ўвазе найперш інтэлектуалізм паэзіі Яна Чыквіна, які ніколькі не выключае прыёмаў асацыятыўнага пісьма, суседства сюжэтнага лірычнага твора і абагуленага вобразаверша.

Разам з зайдросным практычным валоданнем літаратуразнаўчым інструментарыем, прыёмамі аналізу версіфікацыйнай тэхнікі не можа не здзіўляць тэарэтычная абазнанасць даследчыка, веданне ім філасофіі і культуралогіі. Асабліва поўна гэтая якасць аўтара кнігі выявілася пры разглядзе творчасці Янкі Юхнаўца, па ўсім бачна, адным з любімых творцаў Чыквіна. Па сутнасці, прадстаўленае ў зборніку *Па прызванні і абавязку* даследаванне эстэтычна-філасофскіх аспектаў творчасці гэтага паэта-эмігранта з'яўляецца адным з самых поўных і адметных па прапанаваных падыходах, прынцыпах аналізу, глыбіні прачытання і зробленых высновах. У якасці ўзорных можна прывесці развагі крытыка пра экзістэнцыяльныя неспакоі Янкі Юхнаўца, якія *лагодзяцца і "размываюцца", між іншым, па-шапэнгаўэраўску разуметай вітальнасцю, воляю да жыцця, па-бергсанаўску – інстынктыўным elan vital, а таксама – дар, уласцівы толькі чалавеку – зачараваннем метафізікай быцця і метагісторыяй прыроды"* (138).

Несумненна, што якраз другі раздзел кнігі Яна Чыквіна, дзе прадстаўлена творчасць пісьменнікаў-эмігрантаў, успрымаецца найбольш цэласным у зместава-тэматычным і структурным планах. Ён вылучаецца арганічнай знітаванасцю эфектаў максімальна набліжанага і аддаленага, абстрагаванага прачытання, непарыўнасцю ўдумлівага, засяроджанага і ўзрушанага, напружанага пераасэнсавання мнагазначнасці сэнсаў і энергетычнага патэнцыялу спадчыны аўтараў, якія пры ўсёй маргінальнасці свайго горкага існавання імкнуліся патрапіць *у дзейсную і жывую гістарычную перспектыву сваёй нацыі, выкарыстоўваючы дзеля гэтага даўным-даўно выпрацаваныя формы міжчалавечага грамадскага паразумення і кантактаў* (135).

Небеспадстаўна пераканаўшыся ў тым, што *нашых інтарэсаў цалкам ніхто не рэпрэзентуе*, што *прыйшоў час рабіць сваё* (236), шматгадовы старшыня "Белавежы" яшчэ у 1998 годзе падрыхтаваў да друку бібліяграфічны

даведнік *Беларуская літаратура Польшчы.* У не меншай ступені гэткаю ж мэтаю – *Рабіць сваё* – абумоўлена з'яўленне кнігі *Па прызванні і абавязку.* І ў аднайменным інтэрв'ю з вядомым празаікам, эсэістам, публіцыстам Сакратам Яновічам, і ў артыкулах, прысвечаных агляду творчасці гэтага і іншых "белавежцаў", прадстаўнікоў беларускай і польскай літаратуры, даследчык настойліва ўздымае набалелыя пытанні мастацка-культурнага жыцця спецыфічнай па многіх паказчыках этнічнай прасторы беластоцкага краю. Па яго перакананні, *беларускія літаратары ў Польшчы сваёй прысутнасцю ў свеце адлюстроўваюць глыбокую духоўную жыватворчасць сваёй нацыі* (235).

Пры пераважна стрыманай манеры пісьма Ян Чыквін іншы раз дазваляе сабе выявіць надзвычайную ўзрушанасць, непрыхаванае захапленне мастацкімі наробкамі, дзейсным адраджэнскім і штодзённым, але ад гэтага не менш вартым, стваральным энтузіязмам таго ж першага рэдактара тыднёвіка "Ніва", *хроснага бацькі "Белавежы"* (201), аўтара нататкаў *Віры*, аўтабіяграфічных *Белай вязі*, *У каменным крузе* і іншых шматжанравых твораў Георгія Валкавыцкага. Прычым крытыку аднолькава цікавыя і маральна-духоўная сутнасць пісьменніка, *чалавека ўмудронага гадамі* (201), і яго адкрытасць у *новую грамадска-жыццёвую прастору*, і асветленасць яго таленту то *промнем лірызму*, то *лёгкай іроніяй*, а то *і сарказмам над вялікімі і малымі "ўладарамі свету", што безупынна імкнуцца ашчаслівіць "разгубленае" чалавецтва* (202).

Як старшыню БЛА Яна Чыквіна не можа не непакоіць праблема традыцый, плённага працягу і перспектыў развіцця літаратуры Беласточчыны ва ўсіх яе жанрава-відавых і стылёвых праяўленнях. Таму цалкам зразумела, чаму з такой пільнай увагай спыняецца даследчык на адметнай іроніка-псіхалагічнай прозе Міхася Андрасюка, аўтара зборнікаў *Фірма* і *Мясцовая гравітацыя.* Ім асабліва падкрэсліваюцца яго *фенаменальная назіральнасць і вобразная памяць* (226), адрознасць ад іншых творцаў *пераважна нелінейнай фабульнасцю, свежасцю ахопу супярэчлівасцей навейшых дзён, своеасаблівасцю мастакоўскай тыпізацыі* (226). Такая высокая ацэнка прозы аўтара з Гайнаўкі тым больш каштоўная, што ён ніколькі не страчвае ў характарыстыцы сваёй непаўторнай манеры па зместава-фармальных, вобразна-сістэмных, моўна-стылёвых, экспрэсіўна-эмацыянальных паказчыках побач з таленавітымі і блізкімі да яго па тыпу мыслення, сродках абагульнення, шматфарбнай палітры пісьма Алесем Асташонкам, Вінцесем Мудровым, Уладзімірам Арловым, Пятром Васючэнкам і іншымі вядомымі празаікамі сучаснасці.

Напэўна, адным з лепшых артыкулаў, што наогул прысвечаны разгляду творчасці вядомага пісьменніка Беласточчыны С. Яновіча, з'яўляецца чыквінскі *Шлях па крузе.* Прычына такога поспеху бачыцца ў смеласці даследчыка прызнаць першапачаткова немагчымасць усебаковага і вычарпальнага прачытання надзвычай адметнага і складанага творцы. *... кім жа з'яўляецца С. Яновіч як празаік? Пісьменнікам сучаснасці ці адлюстравальнікам мінулага? Літаратарам з зацятасцю публіцыста ці аўтарам сацыяльна-сентыментальных аповесцей? Лірыкам, які стварае легенду беларускай Ёкнапатафы-Крынак, а, можа, маралізатарам альбо стоікам местачкова-вясковага паходжання, які ведае цану ўсякай утопіі і кпіць у вочы з яе прыхільнікаў,*

з сябе самога ды з кожнага, бо ўсё на свеце адно горкага смеху варта?! (212). Але акрэсленасць непа- і аб-дымнасці задач зусім не азначала, што крытык абмяжуецца толькі асобнымі падыходамі, чарнавымі накідамі пры іх вырашэнні. З заўжды ўласцівай для яго ўдумлівай манеры скрупулёзнасцю, улікам прыёмаў псіхааналізу, сінтэзам біяграфічнага і кантэкстуальнага, літаратуразнаўчага і культуралагічнага прынцыпаў даследавання, дакладнай перадачай уласных уражанняў Ян Чыквін здолеў ахарактарызаваць канцэптуальна істотныя адметнасці творчай асобы Сакрата Яновіча. Больш дакладна: выключны, *нястрымны тэмперамент палеміста* (205) з Крынак, яго неадступную засяроджанасць на ідэях трагізму беларускага шляху, нацыянальнай прыніжанасці, гістарычнага бяспамяцтва, праблеме *"марнатраўнага" сына* (210). Не менш зважае, а то і адкрыта любуецца аўтар артыкула *мастацкай арыгінальнасцю стылю і светаўспрымання* (205) свайго візаві, яго шчырым слугаваннем літаратуры і мове, талентам *схапіць у лёце... хутказменлівую рэальнасць* (211).

Кожны, хто пазнаёміцца з кнігай Яна Чыквіна, без цяжкасцей заўважыць аднолькава плённую рэалізацыю ім намераў весці гаворку як пра асобных творцаў, так і цэлыя перыяды літаратурнага жыцця, як пра тэарэтычныя пытанні (*На скрыжаванні эпох*; *Збігнеў Гэрберт па-беларуску*), так і адметныя праблемна-тэматычныя аспекты мастацтва слова, патрэба ў грунтоўным асэнсаванні якіх абумоўлена яго набыткамі і самім часам (*Паэтычная тэтралогія*; *Матывы заходняга свету ў беларускай эміграцыйнай паэзіі*). Пэўна, што здольнасць успрымаць і асэнсоўваць праявы ўмоўнага мастацкага і рэальнага акаляючага свету на ўзроўнях **знутры**, **упоравень**, **па-над** можа быць прэрагатывай тых рэдкіх абраннікаў, якім дадзена ведаць: *...літаратура – гэта лёс чалавека* (200). І сярод іх, безумоўна, Ян Чыквін, шчаслівае, кажучы словамі беластоцкага Сакрата, *спалучэнне таленавітага мастака слова з строга лагічным навукоўцам* (231), рэдкі гарманічны саюз прызвання і абавязку.

Вольга Шынкарэнка
Гомель

М. Г. Яленскі, *Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка*, Мінск 2005, сс. 224

Пытанні моўнай адукацыі ў рэспубліцы заўсёды цікавяць усіх і кожнага: і тых, хто вучыцца і вучыць у школе, і тых, хто вучыцца і вучыць у вышэйшай навучальнай установе, і нават тых, хто не мае непарэднага дачынення да навучання, але якім не ўсё роўна, як вучаць, якія вынікі навучання мове, які ўзровень пісьменнасці, якія навыкі маўленчай дзейнасці набываюць нашы юныя грамадзяне краіны. Да таго ж кожны новы час ставіць новыя задачы перад усімі носьбітамі беларускай мовы і асабліва перад тымі, хто вучыць, і тымі, хто вучыцца, каб стаць настаўнікам беларускай мовы. Ужо толькі гэта вымушае да падрыхтоўкі новых падручнікаў, дапаможнікаў па методыцы выкладання беларускай мовы.

Неабходнасць падрыхтоўкі новых і разнастайных падручнікаў, дапаможнікаў па курсе “Методыка выкладання беларускай мовы ў школе” для філалагічных факультэтаў ВНУ вымагаецца яшчэ абмежаванай колькасцю падручнікаў, дапаможнікаў, метадычных распрацовак па методыцы выкладання беларускай мовы ў параўнанні, напрыклад, з методыкай выкладання рускай мовы. А тыя падручнікі, што ёсць – “Методыка выкладання беларускай мовы” З. Б. Варановіч (Мінск 1985; Мінск 1995) і “Выкладанне беларускай мовы ў школе” (Пад рэд. М. Г. Яленскага, Мінск 1994), проста знікаюць, фізічна старэюць, калі імі бясконца карыстаюцца студэнты, і далёка не ўсё ў іх адпавядае навейшым патрабаванням, сучасным дасягненням навукі, узроўню навучання. Методыка ж выкладання беларускай мовы як навука не стаіць на месцы, яна развіваецца, што абумоўлена пазітыўнымі зменамі ў нашым грамадстве ў апошні час увогуле і ў школе ў прыватнасці, найперш тымі зменамі ў падыходах да навучання, зменамі скіраванасці ад ведацэнтрызму да асобаснa арыентаванага навучання і выхавання моўнай асобы на ўроках беларускай мовы.

Усё адзначанае абумовіла актуальнасць вучэбнага дапаможніка М. Г. Яленскага, падрыхтаванага ў адпаведнасці з амаль усімі праграмамі курса “Методыка выкладання беларускай мовы ў сярэдняй школе” для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ, якія дзейнічалі раней і актуальныя зараз (Мінск 1975; Мінск 1997; Мінск 2000), таму што ўсе яны ўключаюць так званыя “Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы”, ці пытанні лінгвадыдактыкі, якія якраз і абраў аўтар зместам свайго дапаможніка.

Падручнік складаецца з 12 тэм, ці раздзелаў, якія прысвечаны асноўным пытанням лінгвадыдактыкі. Не ўсе пытанні асветлены аднолькава поўна і ўсебакова, што абумоўлена рознымі прычынамі: зместам самой праблемы, як, напрыклад, “Асаблівасці вывучэння беларускай мовы ў 11–12 класах сярэдняй агульнаадукацыйнай школы” (210–213 сс.), аб’ёмам пытання, як, напрыклад, “Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках мовы” (214–219 сс.), традыцыйнасцю асвятлення пытання, як, напрыклад, “Сучасны ўрок беларускай мовы: структура і тыпы” і інш. Праўда, тэма “Сучасны ўрок беларускай мовы: структура і тыпы” (161–209 сс.), з’яўляючыся адной з цэнтральных і важных для тэарэтычнага засваення з мэтай далейшай практычнай рэалізацыі магла б быць пашырана. Тут не трэба было баяцца паўтарэння, напрыклад, класіфікацыі ўрокаў, дадзенай у іншых падручніках, а таксама выдзялення і характарыстыкі самых розных структурных кампанентаў урока і асабліва ў залежнасці ад тыпу ўрока, паколькі гэта падручнік для будучых настаўнікаў, якія маюць патрэбу ў рэкамендацыях, накіраваннях для пабудовы ўрока, вызначэння часу і месца адведзенага на ім пэўнага структурнага элемента, нават выбару метадаў і прыёмаў, якія найбольш эфектыўныя, апрабаваныя часам і інш.

Асабліва важна падкрэсліць, што М. Г. Яленскі асвятляе пытанні лінгвадыдактыкі з пазіцый сучасных дасягненняў метадычнай навукі і ўзроўню яе развіцця. Пахвальна і тое, што ў дапаможніку распрацаваны і ўведзены пытанні, якія сталі аб’ектам і вынікам вывучэння методыкі як навукі апошня-

га часу і якія адпавядаюць патрэбам усяго грамадства, сучаснай школы адносна навучання беларускай мове ў прыватнасці. Выключна новым, свежым з'яўляецца раздзел "Лінгвадыдактычная кампаратывістыка", які дае магчымасць у выніку параўнання навучання беларускай мове ў нашай рэспубліцы і мовам у іншых краінах ацаніць на новым узроўні станоўчыя бакі, перавагу моўнай адукацыі на Беларусі, паразважаць і выявіць скрытыя патэнцыяльныя яе магчымасці і разам з тым скарыстаць штосьці з вопыту іншых адукацыйных сістэм.

Цікавасць выклікаюць пытанні аб выдзяленні моўнага ядра асобы вучня, аб нацыянальнай сітуацыі і ўплыве яе на засваенне беларускай мовы, на выбар прынцыпаў навучання.

Цудоўна, што ў дапаможніку маюцца асобныя раздзелы, прысвечаныя выяўленню ўплыву сацыяльнага асяроддзя на вывучэнне беларускай мовы, на фарміраванне моўнага ядра асобы вучня (гл. раздзелы "Аксіялагічныя асновы лінгвадыдактыкі", "Асяроддзе і школа – галоўныя фактары фарміравання моўнага ядра асобы вучня" і вызначэнню мэты і задач моўнай адукацыі, паняццяў 'адукацыйны стандарт', 'змест адукацыі'.

Новыя звесткі нясе дапаможнік аб дзесяцібальнай сістэме ацэнкі і квалiметрычным спосабе вызначэння ўзроўню дзейнасці вучняў, аб асобных новых сродках навучання, што з'явіліся за апошні час.

Аднак хацелася б бачыць больш поўную і стройную сістэму прынцыпаў навучання мове: для навучання важна выдзеліць агульнадыдактычныя, агульнаметадычныя і прыватнаметадычныя прынцыпы і ахарактарызаваць іх ролю і назначэнне ў практыцы навучання, асабліва з улікам узросту, падзелу вучняў пачатковай школы і базавай ці сярэдняй.

Не выклікае ніякага сумнення, што ўвесь дапаможнік падрыхтаваны з пазіцый выхавання ў будучага спецыяліста сярэдняй школы светапогляду, навуковых асноў арганізацыі навучання беларускай мове. Дапаможнік асвятляе міжпрадметныя сувязі методыкі з педагогікай, псіхалогіяй, логікай і іншымі дысцыплінамі. Зместу кожнага раздзела папярэднічае актуалізацыя ведаў па розных прадметах (на жаль, адсутнічае поўнасцю лінгвістыка), пастаноўка праблемных пытанняў, якія прыцягнуць увагу студэнтаў, выклічуць дыскусіі, актывізуюць мысленне студэнта. Падручнік можа быць скарыстаны для самастойнай працы студэнта, паколькі аўтар у канцы кожнай тэмы прапануе спіс літаратуры для дадатковага азнаямлення.

Вучэбны дапаможнік "Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка" М. Г. Яленскага сёння вітаюць не толькі студэнты філалагічных факультэтаў, якія амаль пазбаўлены падручнікаў па методыцы, але і выкладчыкі розных курсаў і дысцыплін на філалагічных факультэтах, і настаўнікі беларускай мовы сярэдніх школ, гімназій і ліцэяў, для якіх будзе карысным пазнаёміцца з новым асвятленнем многіх пытанняў лінгвадыдактыкі, атрымаць новыя звесткі аб тэарэтычных асновах навучання беларускай мовы ў школе.

Вольга Ляшчынская
Гомель

Ludwik Bazylow, Piotr Wieczorkiewicz, *Historia Rosji*, Wrocław 2005, ss. 631

Jak czytamy we wstępie do tego fundamentalnego dzieła profesora Ludwika Bazylowa, jednego z najwybitniejszych historyków polskich, „Historia Rosji" stanowi od lat pozycję klasyczną. Sam autor przygotowywał jej kolejne wydanie, do którego z powodu Jego śmierci, niestety, już nie doszło. Przemyślenia Profesora, a także upływ czasu, owocujący cennymi rozprawami, także polskich autorów, spowodował wprowadzenia do tekstu poprawek i uzupełnień. Dokonano ich częściowo na podstawie zachowanych notatek prof. Bazylowa. Uwzględniono również nowsze wyniki badań, zwłaszcza tam, gdzie były zgodne z poglądami Autora, który, przypomnijmy, „pisał swą książką w warunkach szczególnie wyczulonej na kwestie rosyjskie ideologicznej cenzury. Nowego ujęcia wymagała kwestia rozwoju ruchu robotniczego, zwłaszcza roli bolszewików i Lenina, oraz genezy rewolucji 1917 roku, a także niektóre zagadnienia związane ze stosunkami polsko-rosyjskimi" (s. 7).

Praca L. Bazylowa jeszcze w czasach mojej młodości i studiów na Uniwersytecie im. A. Mickiewicza w Poznaniu stanowiła podstawowe źródło wiedzy o historii Rosji. Jako studenci filologii rosyjskiej (a w programie tych studiów była historia Rosji) ubolewaliśmy, że prof. L. Bazylow skończył swoje rozważania na 1917 roku. Niestety, wtedy nie było w miarę obiektywnych źródeł na temat historii Związku Radzieckiego, a jeśli nawet były, to nas, młodych ludzi, raziły nasyceniem ideologii sowieckiej.

Nie jestem historykiem i oczywiście nie moją sprawą jest ocena tego, co dopisał P. Wieczorkiewicz do „Historii Rosji" L. Bazylowa. Ale w refleksjach profesora P. Wieczorkiewicza pojawiają się opinie o niektórych literatach okresu radzieckiego, z którymi nieskromnie popolemizuję (opiniami). Zacznijmy od Władimira Majakowskiego – przedstawiciela rosyjskiego futuryzmu, wybitnego poety, liryka, którego propaganda sowiecka uczyniła trybunem rewolucji, co w konsekwencji doprowadziło go do samobójczej śmierci. Niezwykle go ceniła wybitna poetka – emigrantka – Marina Cwietajewa, czym zresztą naraziła się rosyjskiej emigracji w Paryżu, gdy spotkała się tam z nim i napisała świetny esej o jego twórczości. Jego talent doceniał także Julian Tuwim, co zaowocowało znakomitymi (wręcz wzorcowymi) przekładami W. Majakowskiego na język polski. To prawda, że w latach dwudziestych W. Majakowski napisał poematy „W. I. Lenin", „Dobrze" („Хорошо"), że był jednym z filarów ugrupowania literackiego LEW (Левый фронт искусства), że był też uzależniony od RAPP (Российская Ассоциация Пролетарских Писателей) i że ta właśnie organizacja, pretendująca do podporządkowania swoim ideologicznym celom całej literatury rosyjskiej lat 20-tych, przyczyniła się do samobójczej śmierci poety. Jak słusznie zauważył Andrzej Drawicz, „droga od słów na wolności do „przydeptanej" pieśni to wymiar tragedii – także artystycznej – Majakowskiego (*Historia literatury rosyjskiej XX wieku*, pod red. A. Drawicza, Warszawa 1997, s. 129).

Niewątpliwie nie można tej twórczości tak skwitować, jak to napisał P. Wieczorkiewicz: „Majakowski, koniunkturalny skandalista, autor wielu sławiących „czerwoną Rosję" rewolucyjnych wierszy, skądinąd wysokiej próby i utalentowany, ironiczny dramaturg (Pluskwa 1928)" (s. 430). No właśnie, jednak wielki talent

i wcale nie jest wiadome, jak to podają źródła sowieckie, czy popełnił samobójstwo z powodu jakichś problemów miłosnych. Byłbym raczej skłonny twierdzić, że myśli samobójcze pojawiły się u poety w związku z rozczarowaniem do systemu sowieckiego.

A Siergiej Jesienin, o którym P. Wieczorkiewicz napisał: „subtelny liryk, zauroczony zrazu rewolucją, lecz wkrótce rozczarowany, popadł w alkoholizm i depresję i 4 lata później popełnił samobójstwo" (s. 430). No nie, to jednak nie było tak. Opublikowano już na ten temat wiele prac, wspomnień (także kolejnych żon poety, jego przyjaciół). Po pierwsze, Jesienin nigdy do końca nie był zauroczony rewolucją. Pamiętajmy, że przed 1917 rokiem zaistniał jako piewca starej, patriarchalnej Rusi, potem, jak większość pisarzy i poetów, próbował się odnaleźć w rzeczywistości radzieckiej (a przecież był to wtedy młody chłopiec, daleko przed trzydziestką). I na pewno nie alkoholizm był przyczyną jego samobójstwa. Złożyło się na to szereg powodów (nieudane życie osobiste, niefortunny związek z Isadorą Duncan i innymi kobietami, między innymi z wnuczką Lwa Tołstoja). Był wtedy poetą niezwykle kochanym przez publiczność (i do dziś tak jest). Nowa władza sowiecka w jakimś sensie na pewno go hołubiła, ale jego dość ekscentryczne życie osobiste na pewno nie mogło się podobać ówczesnym czynnikom oficjalnym. Jednym słowem, nie ulega wątpliwości, że zarówno Władimir Majakowski, jak i Siergiej Jesienin, niezwykle utalentowani i kochani przez publikę ówczesną poeci, stali się osobowościami tragicznymi i na pewno stłamszonymi przez sowieckie realia lat dwudziestych.

Apelowałbym, by nie osądzać tak łatwo Władimira Majakowskiego i Siergieja Jesienina. To wybitni poeci i na pewno ich tragedią było to, że się uwikłali w obowiązujące w latach 20-tych układy społeczno-polityczne. I jeszcze raz podkreślam, na temat tych poetów napisano wiele: Marina Cwietajewa, Lili Brik, Elza Triolet, Luis Aragon, Isadora Duncan i in., i obrazy wyłaniające się z tych wspomnień wcale nie są tak bardzo jednoznaczne. Byłbym zatem bardzo ostrożny i taką samą ostrożność sugerował badaczom dziejów Rosji i jej kultury. Podobnie byłbym ostrożny przy nadawaniu Władimirowi Maksimowowi aureoli bojownika z systemem sowieckim. Ten emigrant bowiem, twórca ciekawego pisma „Континент", z początku aprobujący „pieriestrojkę", stał się w końcówce swojego życia zaciekłym przeciwnikiem tzw. demokracji w wykonaniu Borysa Jelcyna, o czym świadczy jego publicystyka ostatnich lat, ale także bardzo krytyczne wypowiedzi np. dla „Gazety Wyborczej". O miejscu śmierci Osipa Mandelsztama do dziś nic nie wiadomo. Nie wiemy, czy zmarł on w Łagrze (s. 442), czy też w jakichś innych okolicznościach. Podobne uwagi można odnieść do zgonu Izaaka Babla i Borysa Pilniaka. Takie były czasy. Człowiek znikał i nawet najbliższa rodzina nie wiedziała, kiedy dokładnie zmarł. Nie można się też zgodzić z opinią P. Wieczorkiewicza, który wspominając rolę „Nowego Miru" w promowaniu literatury rosyjskiej po 1956 roku określa Aleksandra Twardowskiego jako „autora miernego, acz niezmiernie popularnego cyklu poetyckiego o Wasiliju Tiorkinie, który wojował z białofinami, a następnie z Niemcami" (s. 506). No nie, powiedzieć o Twardowskim, że jest to poeta „mierny", to ewidentna pomyłka. Niezależnie bowiem od pewnych „naleciałości" ideologicznych A. Twardowski był jednym z najwybitniejszych poetów lat 30–50-tych. Najpierw jako piewca wiejskiego pejzażu rosyjskiego, potem trudnych lat wojennych (do jego tekstu wybitni kompozytorzy rosyjscy pisali muzykę i następnie te pieśni stawały

się niemal częścią folkloru rosyjskiego), by wreszcie odegrać jako redaktor naczelny „Нового мира" znaczącą rolę w promocji poezji Anny Achmatowej, Mariny Cwietajewej, prozy Aleksandra Sołżenicyna i wielu innych ówczesnych poetów i prozaików. Na pewno nie był to „mierny" twórca, doskonale bowiem rozumiał, co w danym czasie jest ważne i wartościowe i godne propagowania.

Na miejscu P. Wieczorkiewicza nie zachwycałbym się też Aleksandrem Sołżenicynem. Jego poglądy bowiem od radykalnej krytyki systemu sowieckiego w ostatnich latach oscylują w stronę nacjonalizmu rosyjskiego, który niekoniecznie nas Polaków powinien fascynować. Po powrocie do Rosji A. Sołżenicyn zaczął wygłaszać bardzo kontrowersyjne opinie i do tych właśnie tekstów trzeba się odnosić bardzo ostrożnie.

P. Wieczorkiewicz omawiając okres „pieriestrojki" wymienia wielu autorów, którzy w tamtym czasie odgrywali znaczną rolę w formułowaniu opinii na temat zmieniających się układów społeczno-politycznych, Michaiła Szatrowa i jego sztuki „Dalej, dalej, dalej...", „Dzieci Arbatu" Anatolija Rybakowa, „Białe szaty" Dudincewa i in. Rzeczywiście, wszyscy oni swoimi utworami inspirowali do ogólnonarodowej dyskusji na temat historii Związku Radzieckiego, w tym także roli Lenina i Stalina. Zarówno M. Szatrow (autor tzw. sztuk publicystycznych), jak i inni twórcy po raz pierwszy w historii literatury rosyjskiej próbowali także odbrązowić postać Lenina, uchodzącego dotąd za niemal świętego w historiografii radzieckiej. Wtedy nie było innego forum do dyskusji. Jak się wydaje, literatura właśnie odgrywa w tym czasie rolę swoistej platformy do dyskusji na temat bolących i wtedy odkrywanych faktów z historii Rosji. I nie dziwi mnie to, że na sztuki Michała Szatrowa biegła cała Moskwa (a trzeba dodać, że jeden z najbardziej jego kontrowersyjnych utworów „Dalej, dalej, dalej..." w owym czasie w żadnym z teatrów moskiewskich nie był wystawiany. Dopiero wizyta teatru z Taszkientu w Moskwie zgromadziła tłumy na tym spektaklu (i ja tam byłem i spektakl obejrzałem, dzięki zresztą Michaiłowowi Szatrowowi, który po prostu wprowadził mnie na ten spektakl).

W czasach radzieckich (czy jak chce prof. P. Wieczorkiewicz „sowieckich") literatura oczywiście była sprowadzana do roli swoistego trybuna wiadomej ideologii, ale nie był to taki łatwy proces. Mimo nacisków, perswazji znajdowali się jednak pisarze, którzy usiłowali wyzwolić się z tego jarzma (Michał Bułgakow, Jewgienij Zamiatin, Anna Achmatowa, Borys Pilniak, Borys Pasternak, Nikołaj Erdman, także Aleksander Sołżenicyn, Władimir Maksimow, Władimir Wojnowicz i wielu, wielu innych). Jednakże, zwłaszcza po rozpadzie Związku Radzieckiego, ich poglądy antysowieckie często ulegały tak znacznym metamorfozom, że przestały nijak odnosić się do naszych (polskich) antyrosyjskich fobii. Więc trzeba tu zachować szczególną ostrożność mając na względzie i ten fakt, że nawet najbardziej antysowiecki pisarz pozostał jednak Rosjaninem i nigdy nie pozwoli na obrażanie jego rosyjskiej kultury, literatury, sztuki (a, niestety, my, Polacy, mamy czemuś ku temu szczególne skłonności).

Jeszcze raz zatem podkreślam, że podjęty przez P. Wieczorkiewicza trud „dopisania" historii Rosji Ludwika Bazylowa zasługuje na największe uznanie. Ale jeśli już mówi się o roli literatury radzieckiej (sowieckiej) w kształtowaniu określonych postaw, propagowaniu ideologii sowieckiej, lub jej negacji, to trzeba podchodzić do tego problemu z dużą ostrożnością. Radziecki (sowiecki) poeta, czy prozaik wcale

nie znaczy „mierny". Talenty bowiem prawdziwe ujawniają się nie tylko w dobie absolutnej wolności twórczej, one także realizują się w warunkach, jak to się okazało, totalitarnych represji i ideologicznych ograniczeń.

Walenty Piłat
Olsztyn

Галіна Твараовіч, *Пад небам Айчыны. Літаратурна-крытычныя артыкулы*, Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, Беласток 2005, cc. 281

Нягледзячы на ўсе складанасці развіцця ў Польшчы гуманістычных навук і асабліва славістыкі, польская беларусістыка ў апошнія паўтара-два дзесяцігоддзі, калі здавалася ўжо, што беларусістыка "выдыхаецца", набірае выразны разгон. Плённа працуюць беларусазнаўчыя асяродкі ў Варшаве, Вроцлаве, Любліне, Ольштыне, Аполе і, мабыць, асаблівай увагі заслугоўвае тут Беласток з яго спрадвечнымі беларускімі этнічнымі, культурна-духоўнымі традыцыямі. Дастаткова згадаць знакавыя для беларускага пісьменства і духоўнасці Супрасль, Заблудаў ці Бельск, у якім ладзіліся соймы Вялікага княства Літоўскага. На працягу ўсяго XX стагоддзя мелі месца спробы стварэння сур'ёзнага беларусазнаўчага цэнтра ў Беластоку. Ды, на жаль, толькі ў 1992 годзе нарэшце ўзнікла кафедра беларускай філалогіі ва універсітэце ў Беластоку. Напачатку пераважная ўвага аддавалася мовазнаўчай праблематыцы, аднак з прыходам на кафедру доктара габілітаванага Галіны Твараовіч належнае месца заняло і літаратуразнаўства.

Да 1999 года праф. Г. Твараовіч амаль дваццаць гадоў з'яўлялася навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры НАН Беларусі; даследавала ў асноўным беларускую і паўднёваславянскія літаратуры ў параўнальным аспекце. Аб чым і сведчаць яе манаграфіі: "Нравственный мир героя. Белорусская и югославская военная проза 60–70 годов", Минск 1986; "Пакутаю здабыты мір. Тыпалогія характару ў беларускай і славенскай прозе", Мінск 1991; "Беларуская літаратура: паўднёваславянскі кантэкст (Адзінства генезісу, тыпаў літаратур і характар узаемасувязей", Мінск 1996. Новая кніга Г. Твараовіч з'яўляецца вынікам надзвычай шырокага, паглыбленага вывучэння айчыннай літаратуры – ад старабеларускай праз XIX ст. да даследавання навейшых творчых з'яў і фактаў, якія ўзбагачаюць літаратурны працэс, прыдаюць яму дынаміку. Акрамя таго значную пазнавальна-інтэрпрэтацыйную цікавасць маюць у кнізе артыкулы, прысвечаныя важным з'явам сербскага пісьменства. Трэба падкрэсліць, што кніга гэта мае выразную светапоглядную дамінанту. Даследчыца, як адна з нешматлікіх навукоўцаў-гуманітарыяў, паслядоўна "вывярае" мастацкую значнасць як даўніх, так і сучасных твораў, не толькі з пункту погляду эстэтычных вартасцей, але і крытэрыем духоўных каштоўнасцей хрысціянскага вопыту. Бо, як лічыць Г. Твараовіч, *нічога* (...) *актуальней, універсальней за яшчэ старазапаветныя дзесяць за-*

паведзей, а таксама праграмы-поклічу да ўзрастання ў духоўных магчымасцях, выказанай у Нагорнай пропаведзі Хрыстом, чалавецтва дасюль не вынайшла (37).

Думаецца, цалкам невыпадкова тое, што кніга адкрываецца артыкуламі "Песня пра зубра" Міколы Гусоўскага і сучаснасць" і "Отечества и веры защитник. "Записки янычара" Константина Михайловича в польско-белорусском контексте (XV–XVI вв.)". Патрыятызм, любоў да Радзімы, вернасць этнічным і хрысціянскім ідэалам, уласцівыя гэтым творам, бачацца своеасаблівым ідэйна-пафасным ключом і да астатніх матэрыялаў. І, відаць, няма ў гэтым выпадковасці, бо, на жаль, галоўны пафас твораў Міколы Гусоўскага і Канстанціна Міхайловіча ў сацыяльна-палітычным плане застаецца актуальным да нашага часу. У гэтых творах канцэнтруюцца таксама шматлікія праблемы як бы чыста літаратуразнаўчага характару, якімі беларуская літаратура да канца XIX стагоддзя была шчодра "абдзелена" і якія даследчыкам да гэтага часу прыходзіцца вырашаць і даказваць, – найперш праблему паходжання аўтара ды пытанне пра сутнасны аспект нацыянальнага духу, выяўленага ў тых помніках культуры, не зважаючы на фактычную іх мову.

З гэтымі двума артыкуламі арганічна спалучаецца і яшчэ адзін, не менш важкі па пастаноўцы шырокага спектра не толькі літаратуразнаўчых праблем і іх высвятленню, заход даследчыцы ў даўно мінулае ("На шляхах даўняй беларускай літаратуры"). *З'яўляючыся неад'емнай часткаю агульнаеўрапейскага кантэксту*, – як вызначае Г. Твараповіч, – *беларуская літаратура ўзнікла ў рэчышчы славянскага культурна-гістарычнага тыпу, як своеасаблівай цэласнасці з унікальнымі творчымі, рэлігійнымі, сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі развіцця"* (47). Аднак зноў жа ў сілу неспрыяльных для беларусаў гістарычных абставін, як вынікае з прыведзенага матэрыялу, даводзіцца толькі цяпер як бы нанава вяртацца да таго часу, збіраць па крупіцы часткі вялікага беларускага пано, рэстаўрыраваць тую культурна-духоўную спадчыну, якая сваёй назапашанай, акумуляванай энергіяй даўно павінна сваім бляскам асвятляць шляхі развіцця беларускай нацыі.

Навейшая гісторыя беларускай літаратуры, пачатая на зломе XIX і XX стагоддзяў, пазначана драматычнымі падзеямі рэвалюцый, сталінскімі рэпрэсіямі, "тэорыяй" зліцця нацый, урэшце стратай свайго статусу тытульнай мовы і гістарычнай атрыбутыкі беларусаў. З гэтага фатальнага "фабульнага" шэрагу другая сусветная вайна пакінула ці не найглыбейшы след і доўга, відаць, яшчэ будзе прадметам навуковых спрэчак не толькі гісторыкаў, але і літаратуразнаўцаў. Г. Твараповіч прапануе свой падыход да асэнсавання беларускай літаратуры ваеннага часу ("Беларуская літаратура ваеннага часу. 1941–1945: новае прачытанне"). Канцэптуальная навізна заключаецца ў поглядзе, што айчынная вайна была на землях беларускіх у значнай ступені і вайной грамадзянскай. Проза і паэзія гэтага перыяду разглядаюцца даследчыцай менавіта ў гэтым ракурсе. Яскравым прыкладам новага погляду на падзеі вайны з'яўляецца ўласна ўпершыню праведзены аналіз паэмы Зм. Астапенкі "Эдэм".

У 30-х гадах мінулага стагоддзя пад прэтэкстам ідэйнага паяднання літаратурна-мастацкіх арганізацый у імя пабудовы новага грамадства і выхаван-

ня савецкага чалавека была створана, як вядома, адна для ўсіх пісьменніцкая іерархічная структура – з адным манапольным цэнтрам кіравання і падпарадкаванымі яму абласнымі (перыферыйнымі) асяродкамі. Канцэпцыя цэнтралізацыі творча-пісьменніцкай арганізацыі аказалася блізкай па духу і літары савецка-беларускаму літаратуразнаўству. "Перыферыйны" творца прынцыпова не мог быць таленавіцейшы за свайго "метрапольнага" сабрата, які хаця б па месцу жыхарства належаў да "цэнтра". Гэтая савецка-беларуская дыхатамія, на жаль, не выкаранена цалкам з ужытку і па сённяшні дзень.

Не ўваходзячы ў тэарэтычна-метадалагічныя спрэчкі з такой канцэпцыяй, Г. Твараовіч падымае ў сваёй кнізе ўсё яшчэ дастаткова плывучы, не ўгрунтаваны ў літаратурным працэсе якраз "перыферыйны" матэрыял – каб паказаць ягоную арганічную знітаванасць з перспектыўнымі шляхамі развіцця беларускага прыгожага пісьменства і выявіць прытым мастацкую самаіндэнтыфікацыю такіх "перыферыйных" твораў. Вось чаму значнае месца займае ў даследаваннях Г. Твараовіч шматбаковае асэнсаванне як творчасці, так і самой асобы аднаго з найталенавітых прадстаўнікоў беларускай эміграцыі Масея Сяднёва. Напрыканцы другой сусветнай вайны ён, як вядома, амаль год правёў на Беласточчыне, назваўшы яе і сваёй другой радзімай, і першай прапіскай на захадзе. Аб гэтым М. Сяднёў раскажа ў рэтраспектыўным "Беластоцкім сшытку" (1991 г.), значна актывізуючы гэтай публікацыяй развіццё аўтабіяграфічнага жанру на радзіме, выяўляючы – што падкрэслівае даследчыца – псіхалогію неагрэсіўнай распалавіненасці паміж дзвюма айчынамі той часткі беларускай эміграцыі, якая ў глыбінях душы засталася вернай свайму, карэннаму, праваслаўнаму ў атачэнні англасаксонскай культуры.

У артыкуле "Духоўная паэзія Масея Сяднёва", прысвечаным разгляду яго паэтычнай творчасці з выразнай дамінантай рэлігійнага светабачання, даследчыцца, зыходзячы, відаць, з тонкіх назіранняў багаслова У. Лоскага, сама выказвае філасофска-хрысціянскае меркаванне, што творы такога кшталту, такой тэматыкі "адрозніваюцца ад іншых паэтычных тэкстаў" (161); яны ўзнікаюць па прынцыпу жанра малення, калі на грунце перажытага, чалавечай жыццёвай вопытнасці ўзрастае "з цела душэўнага цела духоўнае" (Першае Пасл. Паўла Кар., 15:44).

І яшчэ ў адным, эсэістычным, матэрыяле ("У вогніве духу паэта") Г. Твараовіч характарызуе творчасць яркага беларускага паэта і празаіка. На гэты раз яго эстэтычна-літаратурныя погляды, філасофскія развагі аб жыцці наогул і ў прыватнасці аб сваім, як яму ўсё здавалася, далёка не ўладкаваным на эміграцыі, нейкае метафізічна-балючае шкадаванне непражытага, таго, што не адбылося; рэфлексіі аб дружбе, прыродзе, смерці і адначасова амаль рэальныя спробы дагнаць час здзяйсненняў на радзіме, уключыцца ў жывы літаратурны працэс – усё гэта паказана даследчыцай праз эпісталярную спадчыну, якая засталася ёй з доўгай перапіскі ў 90-х гадах з пісьменнікам.

Сёння беларуская эміграцыя ўраз з адыходам Н. Арсенневай (1997), М. Сяднёва (2001), Я. Юхнаўца (2004), а яшчэ раней і А. Салаўя (1978) страціла, здаецца, дарэшты свой творчы патэнцыял. Па-за межамі Беларусі застаўся адзін творчы асяродак менавіта на Беласточчыне, дзе – як трапна сцвярджае Г. Твараовіч – "Беларускі літаратурны час працягваецца" (281).

Тут менавіта працягваецца-прадаўжаецца разгортванне таго творчага патэнцыялу беларускай нацыі, які адным з першых буйна выявіў Мікола Гусоўскі, радавод якога некаторыя даследчыкі выводзяць з нашай "зубрынай" Беласточчыны.

І цалкам зразумела, чаму значнае месца ў кнізе Г. Тварановіч займае яшчэ адна нібы "перыферыйная" з'ява – "белавежская" тэматыка. Беларускія пісьменнікі Польшчы, згуртаваныя амаль паўвеку ў літаратурным аб'яднанні "Белавежа", як бы неўпрыкмет сабе і ўжо напэўна перамагаючы ўнутраныя і знешнія неспрыяльныя для нацыянальнай меншасці палітычна-грамадскія абставіны, сталі аўтарамі шэрагу арыгінальных твораў. У асобе Г. Тварановіч "Белавежа" мае аднаго са сваіх хранолагаў і гісторыкаў літаратуры. У артыкулах "Насуперак тузе, самоце", "Гісторыя любові да Радзімы", "Паэтыка верша Уладзіміра Гайдука", "Агульныя стылёва-эстэтычныя асаблівасці беларускай літаратуры ў Польшчы", "Мой твар запісаны кірыліцай" робіцца істотная спроба паглыбіцца ў нацыянальна-культуровы феномен "Белавежы", асэсавання яе месца ў агульным беларускім літаратурным працэсе. Даследчыца разглядае асобныя творчыя індывідуальнасці, у прыватнасці вылучае і аналізуе хрысціянскія акцэнты ў аўтабіяграфічнай аповесці Я. Жамойціна, дапамагае нам лепш зразумець структурныя адметнасці стылістыкі ў вершах У. Гайдука, Ю. Баены, а таксама Зніча і інш.

Асноўныя раздзелы кнігі Г. Тварановіч дапаўняюць і ўзбагачаюць субтэльныя літаратуразнаўчыя эцюды-рэцэнзіі.

Ян Чыкевін
Беласток

Irena Łukaszuk, *Rosyjskie nazwy kulinariów na tle języków słowiańskich*, Białystok 2005, ss. 231

W nazwach żywności znajduje odzwierciedlenie historia, kultura i byt narodu, dlatego też wzbudzają one zainteresowanie badaczy. Dotąd językoznawcy zajmowali się badaniami nazw kulinariów w konkretnych okresach historycznych. Można wymienić tu np. prace G. N. Łukinej, W. I. Niewojt, które zostały poświęcone nazwom żywności pochodzenia roślinnego i zwierzęcego w zabytkach piśmiennictwa języka staroruskiego, czy N. N. Polakowej, dotyczące historii nazw napojów w języku rosyjskim w XI–XVII w. Recenzowana pozycja jest pierwszą próbą kompleksowego opracowania nazw kulinariów funkcjonujących we współczesnym języku rosyjskim, stąd też inicjatywa podjęta przez Autorkę zasługuje na uznanie.

Monografia dr Ireny Łukaszuk jest poświęcona pochodzeniu i historii nazw żywności w rosyjskim języku literackim z odniesieniami do innych języków słowiańskich, przede wszystkim polskiego, z którym nazewnictwo rosyjskie ma wiele paraleli. Nazwy kulinariów, wyekscerpowane z *Wielkiego słownika rosyjsko-polskiego* A. Mirowicza, I. Dulewiczowej, I. Grek-Pabisowej, I. Maryniakowej (Moskwa – Warszawa 1986–1987), skonfrontowano z odpowiednim słownictwem z kilku naj-

większych słowników opisowych języka rosyjskiego, poczynając od słownika Dala, a kończąc na najnowszych pozycjach leksykograficznych. Taki zabieg daje rzetelne podstawy dla analizy etymologicznej, semantycznej i stylistycznej.

Słusznym wydaje się podział nazw żywności na trzy grupy: ogólne nazwy kulinariów, nazwy żywności pochodzenia roślinnego i nazwy żywności pochodzenia zwierzęcego.

Grupa ogólnych nazw żywności w języku rosyjskim jest licznie reprezentowana zarówno przez słownictwo ogólnosłowiańskie, jak i zapożyczenia. W skład tej grupy wchodzi wiele leksykalno-derywacyjnych wariantów, dubletów i form synonimicznych. Jej podstawowym neutralnym centrum jest leksem *пища* (jedzenie, pożywienie, pokarm, żywność, strawa), pochodzący od prasłowiańskiego czasownika **pitati*, który w takim samym znaczeniu funkcjonuje również w dialektach. Jak odnotowała Autorka, dużą grupę nazw ogólnych o znaczeniu 'żywność' stanowią nazwy z prasłowiańskim rdzeniem **ed-*, biorącym swój początek z epoki indoeuropejskiej i rekonstruowanym na poziomie nostratycznym. Wśród rosyjskich ogólnych nazw kulinariów występują również zapożyczenia, np. *трапеза*, *провизия*, *провиант*, *продукты*, a także wyrazy pospolite: *жратва* i przestarzałe: *кушанье.*

Pierwotni Słowianie w przeważającej większości byli rolnikami, stąd też typowym pożywieniem od najdawniejszych czasów był pokarm roślinny. Na tej podstawie Autorka wyróżniła kolejną grupę nazw kulinariów – nazwy żywności pochodzenia roślinnego. Najbardziej rozpowszechnionym i najstarszym pokarmem roślinnym była kasza. Współcześnie w językach słowiańskich (za wyjątkiem polskiego, kaszubskiego i dolnołużyckiego) funkcjonują dwa leksemy: *kaša* i *krupa*, które przy użyciu paralelnym tworzą wyrazy przeciwstawne semantycznie, tzn. różniące się cechą 'gotowany' i 'nie gotowany'. W języku potocznym występuje również nazwa *кашица*, której odpowiednikiem w języku polskim są: *kaszka*, *kleik*, *papka.* W języku rosyjskim wykorzystywane są też nazwy kasz określonego rodzaju: *манка*, *манная* (kasza manna), *пшено* (kasza jaglana), *греча*, *гречка* (kasza gryczana).

Wśród nazw żywności pochodzenia roślinnego nie mogło zabraknąć leksemów określających produkty i potrawy mączne, a także nazw chleba i produktów piekarniczych. Wyraz *mąka* występuje we wszystkich językach słowiańskich oprócz bułgarskiego. We współczesnym języku rosyjskim i polskim nazwy *mąki* funkcjonują jako zestawienia wyrazowe. Do tej grupy nazw należą również określenia makaronu: *лапша* (makaron [domowy], krajanka), *макароны* (makaron [rurki]), *вермишель* (makaron nitki), *рожки* (kolanka), a także nazwy gotowanych wyrobów mącznych: *галушки*, *клецки*, *вареники*, *пельмени*, *ушки*, *колдуны.* W tej części monografii Autorka przedstawia również etymologię oraz znaczenie semantyczne ogólnosłowiańskiego leksemu *хлеб*, który do dzisiaj wywołuje spory wśród etymologów i nazwy różnego rodzaju wypieków, np. *колобок*, *ситник*, *лепешка*, *коржик*, *плюшка*, *пирог*, *кекс*, *кулебяка*, *блин*, *пряник*, *бублик.*

Kolejną grupę nazw kulinariów pochodzenia roślinnego stanowią nazwy warzyw i potraw warzywnych. Autorka poddaje analizie zarówno nazwy ogólne, np.: *зелье* (w znaczeniu 'овощи'), *зелень* (zielenina), *овощи* (warzywa), nazwy poszczególnych warzyw: *капуста* (kapusta), *морковь* (marchew), *репа* (rzepa),

огурец (ogórek), *свекла* (buraki), *дыня* (dynia), *картофель* (ziemniaki), jak i nazwy przypraw, które od najdawniejszych czasów były wykorzystywane do poprawienia smaku na Rusi: *лук* (cebula), *чеснок* (czosnek), *укроп* (koper), *мята* (mięta) i in.

Dość dużą i różną genetycznie grupę stanowią nazwy o znaczeniu 'фрукты'. Należą do niej leksemy pochodzenia prasłowiańskiego: *яблоко* (jabłko), *черешня* (czereśnia), wyrazy utworzone na gruncie języka rosyjskiego: *клубника* (truskawki), *земляника* (poziomki) oraz liczne późniejsze zapożyczenia: *банан* (banan), *мандарин* (mandarynka), *авокадо* (awokado).

Ostatnią grupę nazw kulinariów stanowią nazwy żywności pochodzenia zwierzęcego. Wśród nich najliczniej reprezentowane są nazwy mięsa i potraw mięsnych, które często stanowią prasłowiańskie nazwy jednowyrazowe oraz zestawienia. Zestawienia w tej części monografii Autorka wykorzystała jako ilustracje analizowanych zjawisk leksykalnych. W tej grupie najszersze spektrum semantyczne posiada nazwa *мясо* – leksem ogólnosłowiański mający odpowiedniki w innych językach indoeuropejskich. Nazwa ta konkretyzuje się w zależności od rodzaju zwierzęcia, domowe, czy dzikie, np.: *свинина* (wieprzowina), *говядина* (wołowina), *телятина* (cielęcina), *цыпленок* (kurczak), *куропатка* (kuropatwa), *голубь* (gołąb). O tym, że mięso i potrawy mięsne odgrywały i odgrywają znaczącą rolę w żywieniu, świadczyć może bogactwo nazw potraw mięsnych, np.: *ветчина* (szynka), *карбонат* (schab pieczony, pieczeń schabowa), *эскалоп* (medalion), *фрикасе* (potrawka), *бекон* (bekon). Najstarszym leksemem, który wymieniają już staroruskie zabytki piśmiennictwa jest *колбаса* (kiełbasa).

W tej grupie nazw zostały zaprezentowane również nazwy mleka i jego przetworów, np.: *молоко* (mleko), *масло* (masło), *сыр* (ser), *творог* (twaróg), *простокваша* (zsiadłe mleko), *ряженка* (prażone zsiadłe mleko), *йогурт* (jogurt), *кумыс* (kumys), a także nazwy potraw z jajek: *яичница* (jajecznica), *болтушка* (jajecznica z maką i mlekiem), *гоголь-моголь* (kogel-mogel), *суфле* (suflet), *самбук* (suflet owocowy) i nazwy potraw z ryb, których najbardziej rozpowszechnionym sposobem tworzenia jest semantyczne przeniesienie 'produkt' → 'potrawa'.

Recenzowana monografia niewątpliwie stanowi doskonałą bazę źródłową dla osób zainteresowanych językiem rosyjskim, szczególnie studentów filologii rosyjskiej. Etymologiczna, semantyczna i stylistyczna analiza nazw kulinariów pozwala czytelnikowi uświadomić procesy zachodzące w języku na przestrzeni wieków i zapoznać się ze stanem współczesnego języka rosyjskiego.

Ujęcie kulturowe pozwoliło wyodrębnić w badanym zasobie nazw kulinariów potrawy charakterystyczne dla kultury materialnej Słowian wschodnich, Słowian zachodnich oraz potrawy typowe dla kultury narodów niesłowiańskich. Jest to dodatkowy walor recenzowanej książki.

Jolanta Chomko
Białystok

Bazyli Białokozowicz, *Мой путь к Толстоведению*, „Slawista". Biuletyn Informacyjny Instytutu Słowiańszczyzny Wschodniej Uniwersytetu Warmińsko-Mazurskiego w Olsztynie, nr 15 (2003), nr 16 (2003/2004), nr 17 (2004), nr 18 (2004/2005), nr 19 (2005), nr 20 (2006)

Радзіннае месца прафесара Базыля Белаказовіча – старажытны Бельск. У гэтым, цяпер ціхім павятовым горадзе, некалі, уласна пару стагоддзяў таму, вырашаліся справы дзяржаўнага значэння. Магдэбургскае права Бельску надаў яшчэ Аляксандр Ягелончык у 1495 годзе, аб чым нагадвае барочная ратуша з гадзіннікам у цэнтры горада. Праўда, яна заступіла сваю папярэдніцу ў XVII стагоддзі, таму не памятае ажыўлення, якое панавала ў Бельску падчас соймаў Вялікага княства Літоўскага. А менавіта ж у Бельску летам 1564 года быў прыняты адзін з юрыдычных актаў, што ўдасканальваў прававыя нормы Статута ВКЛ 1529 года. Надрукаваны ён у другой рэдакцыі гэтага важкага юрыдычнага зводу законаў і вядомы як Бельскі прывілей. Значнасць згаданага дакумента пацверджана і ў Статуце 1588 года ў Раздзеле чацвёртым – аб суддзях і судах – напамінам, каб свабодна выбіраемыя суддзі, падсудак і пісар, падлеглыя земскаму суду справы *разглядалі, як тое ім прывілеямі яго каралеўскай міласці,* ***у Бельску і ў Вільні*** *на той статут выдадзенымі, дастаткова замацавана.* Сапраўды, не выпадае здзіўляцца таму, што менавіта з Бельшчыны з яе слаўнай гісторыяй паходзіць (або тым ці іншым чынам звязаны) шэраг выдатных асоб, значным жыццёвым ўнёскам якіх трываліцца культурна-духоўная спадчына беларусаў.

Відавочна, Базылі Белаказовіч з'яўляецца прадаўжальнікам традыцый, распачатых яго папярэднікамі-землякамі. І, здаецца, няма буйнога славістычнага асяродка, як у Польшчы, так і за яе межамі, дзе б не ведалі, не лічыліся з даследаваннямі прафесара Б. Белаказовіча. Уражвае абсяг яго навуковых інтарэсаў: руская і беларуская літаратуры, культуралогія, літаратурная кампаратывістыка, пагранічча культур, культурны цэнтр і яго перыферыя, рэгіяналізм і малыя айчыны, краіна нараджэння як культурны чыннік творчасці, праблема асіміляцыі і захавання ўласнай тоеснасці ў літаратурах пагранічча, ідэалы этнічнай ментальнасці, стэрэатыпы і маргіналіі... Увогуле ж пачынаў Б. Белаказовіч з працы на адной з найспецыфічных, складаных дзялянак параўнальнага літаратуазнаўства. Маецца на ўвазе даследаванне дачыненняў таго ці іншага пісьменніка з пэўнай краінай, народам. Акрамя дасканалага ведання біяграфіі і творчасці разглядаемай творчай індывідуальнасці, тут навуковец мусіць свабодна валодаць методыкай, тэарэтычным інструментарыем кампаратывістыкі. Даследаванні такога кшталту належаць да сферы кантактных сувязей, аднак значную ролю адыгрываюць тут і разнастайныя тыпалагічныя аналогіі. І менавіта Б. Белаказовічу, выпускніку Ленінградскага універсітэта, аказалася пад сілу стварыць дастаткова вычарпальную панараму ўзаемадачыненняў Льва Талстога з Польшчай.

Не выклікае сумніву значэнне даследаванняў такога плану. Па-першае, новая інфармацыйная рэчаіснасць, узнікшая ў выніку арганічнага спалучэння асобных фактаў, ньюансаў, настрояў, уносіць істотныя карэктывы ў агульныя ўяўленні аб пісьменніку, садзейнічае паглыбленню інтэрпрэтацыі яго творчас-

ці. Па-другое, у дадзеным выпадку якраз рэалізуецца сацыяльна-грамадская функцыя кампаратывістыкі, асабліва калі гаворка ідзе пра выбітную, вехавую ў пэўным сэнсе асобу, якою і з'яўляецца Леў Талстой. Змяняюцца сацыяльна-грамадскія ўклады, адбываюцца сусветныя войны, рэвалюцыі, палітычныя і прыродныя катаклізмы, а сказанае Талстым пра чалавека і чалавецтва застаецца важным і актуальным. Леў Талстой і надалей – адзін з найдакладных маральна-этычных, эстэтычных камертонаў, прынамсі, для насельнікаў хрысціянскай айкумены. Гаспадар Яснай Паляны заўсёды чэрпаў добрасумленна глыбока, а па яго ж словах: *Чым глыбей зачарпнуць, тым агульней для ўсіх знаёмае і роднае.*

Грунтоўная манаграфія Б. Белаказовіча "Сувязі Льва Талстога з Польшчай" пабачыла свет у 1966 годзе. Пэўна, карпатлівая, настоўлівая праца над ёй была яшчэ адным своеасаблівым універсітэтам для вучонага. Увогуле, як не падзівіцца даследчыцкай смеласці маладога навукоўца! Выпрацоўка канцэпцыі даследавання, канкрэтных падыходаў вымагала дастатковай прафесійнай вопытнасці, сталасці, якія ў дадзеным выпадку мусілі набывацца ў самім працэсе асэнсавання надзвычай складанай філасофска-эстэтычнай, светапоглядной з'явы. Ды ёсць усе падставы сказаць, што Б. Белаказовічу "пашанцавала", што яго навуковыя магчымсці разгортваліся, умацоўваліся ў судакрананні, здавалася б, з якраз "непад'ёмнаю" для маладога даследчыка тэмаю. Вынікам усебаковага аналізу фарміравання поглядаў Льва Талстога на польскае пытанне, разгляду яго ў аспекце этыка-рэлігійнай сістэмы Талстога, перапіскі Льва Талстога з палякамі, рэцэпцыі Львом Талстым польскай культуры сталі высновы найперш светапогляднага характару. Ёсць удзячныя тэмы, праблемы, якія ад самага пачатку назаўсёды ўцягваюць даследчыка ў сваю плённую арбіту. Польскія сувязі Льва Талстога якраз належаць да іх ліку. І цалкам зразумела, чаму ў 1995 годзе пабачыла свет адна з чарговых манаграфій Б. Белаказовіча, у якой удакладняюцца, канкрэтызуюцца ўзаемадачыненні Льва Талстога і яго гарачага прыхільніка, выдатнага польскага славіста Марыяна Здзяхоўскага, між іншым, як і Б. Белаказовіч, выпускніка Пецярбургскага універсітэта. Істотна, што папярэднічаў гэтаму даследаванню скрупулёзны разгляд Б. Белаказовічам польска-рускіх узаемасувязей XIX стагоддзя.

Сапраўды, цалкам апраўдана, што Б. Белаказовіча – аўтара звыш тысячы прац па разнастайных пытаннях літаратуразнаўства, польска-балта-усходнеславянскай кампаратывістыкі – найперш называюць талставедам. Прынамсі, Павел Івінскі ў рэцэнзіі "Толстоведение профессора Базылия Бялокозовича" [часопіс "Литература", Вільнюс 2005, № 47(2)] якраз звяртае ўвагу на тое, што за паўвеку навуковай дзейнасці Б. Белаказовіч апублікаваў каля ста прац аб Л. М. Талстым. Шаноўны рэцэнзент слушна адзначае: *Как органическая часть науки о Толстом, работы Бялокозовича «пересекаются» с трудами известнейших толстоведов последнего полустолетия, его современников, со многими из которых он поддерживал и поддерживает творческие и личные связи.*

Невыпадкова свае ўспаміны "Мой путь к Толстоведению" Б. Белаказовіч прысвяціў прафесару, доктару філалагічных навук Георгію Васільевічу Краснову, некалі дэкану гісторыка-філалагічнага факультэта і загадчыку ка-

федры рускай літаратуры Горкаўскага (цяпер Ніжагародскі) універсітэта імя М. І. Лабачэўскага. Менавіта ў тагачасным Горкім распачаў вучобу ў 1951 годзе дапытлівы, добра падрыхтаваны выпускнік ліцэя імя Тадэуша Касцюшкі ў Бельску Падляскім Б. Белаказовіч. Захапленне творчасцю Л. Талстога ў значнай ступені было абумоўлена лекцыямі Г. В. Краснова, суправаджаемымі практычнымі заняткамі і семінарамі, а таксама яго ж спецкурсам, прысвечаным рускаму класіку. Аб адказных і сур'ёзных адносінах да вучобы, аб даследчыцкіх здольнасцях, урэшце, сталых навуковых прыярытэтах выразна засігналізавала ўжо курсавая работа студэнта Белаказовіча "Лев Толстой и Польша". Дзякуючы яе высокаму ўзроўню адбыўся навуковы дэбют аўтара ў зборніку артыкулаў аб Л. М. Талстым у рамках гісторыка-філалагічнай серыі "Ученых записок Горьковского государственного университета" (выпуск XXIX, 1956, с. 13–41). Амаль паралельна з філалагічнымі пачалі рэалізоўвацца і гістарычныя інтарэсы студэнта Белаказовіча. Ён ажыццявіў сваю *заветную мечту касательно истории,* вырашыўшы вывучаць яе экстэрнам, што ўвогуле не выклікае здзіўлення, бо немагчыма было яму, народжанаму ў старажытным Бельску, не прасякнуцца духам слаўнай мінуўшчыны, памкненнем спасцігнуць яе пакручастыя шляхі развіцця. Пашчасціла маладому бяльчаніну слухаць лекцыі вядомых гісторыкаў, гонару рускай гістарычнай навукі С. І. Архангельскага і М. П. Сокалава, асабіста пазнаёміцца з імі, здаваць залікі і экзамены, проста гутарыць з імі. Згадвае Б. Белаказовіч аб сваім захапленні і творчасцю Максіма Горкага, увогуле літаратурным жыццём якраз у той час, калі пасля смерці Сталіна пачаўся перыяд так званай "адлігі": адбывалася пераацэнка каштоўнасцей у культурна-літаратурным і грамадска-палітычным жыцці краіны. Пашанцавала студэнту чацвёртага курса Б. Белаказовічу праслухаць курс лекцый па рускай літаратуры савецкага часу, тады маладога шукальніка *своего места в литературоведении*, таленавітага вучонага І. К. Кузьмічова, займацца ў яго на практычных занятках і семінарах. Была выразная "спакуса" паглыбіцца ў сучасную перспектыўную тэматыку, аднак Б. Белаказовіч застаўся верным Л. М. Талстому: *И всё же могучее творчество Л. Н. Толстого превозмогло. Мой интерес к его наследию оказался не только постоянным, но и всё более возрастающим. Толстовский семинар Г. В. Краснова обладал чудодейственной силой и я себя ощущал великолепно в стихии художественного творчества автора «Войны и мира», подвергавшемуся целенаправленному изучению. Вспоминаю, с каким огромным душевным волнением я ждал появления каждого нового тома Юбилейного полного 90-томного издания сочинений Л. Н. Толстого. Любой том открывал новые проблемы в изучении наследия писателя, доставляя мне необыкновенную радость с одновременным чувством огромной личной ответственности за каждое исследовательское слово. Я всеми фибрами моей души почувствовал притягательность толстовского дарования, покоряющую увлекательность его таланта, магию яго гения.*

Студэнтам Ленінградскага універсітэта Б. Белаказовіч стаў у выніку таго, што горад на Волзе атрымаў новы статус, згодна з якім замежныя студэнты былі пераведзены сюды з Горкаўскага універсітэта, каб працягнуць вучобу. Побыт у рускай паўночнай сталіцы раскрыў новыя культур-

на-асветныя, даследчыцкія магчымасці, якія, зразумела, былі выкарыстаны студэнтам Б. Белаказовічам напоўніцу. Садзейнічала таму ў значнай ступені знаёмства і праца ў семінары вядомага вучонага Б. І. Бурсава. Увогуле сваімі ўспамінамі праф. Б. Белаказовіч удзячна аддае належнае многім асобам, якія тым ці іншым чынам паўплывалі на фарміраванне яго светабачання, жыццёвых прыярытэтаў, проста былі побач і не толькі ў маладыя гады, а і ўсё жыццё. Як напрыклад Эміль Нальборчык, вядомы біолаг, які, уражаны ведамі сябра, падчас гасцявання ў Бельску іх, яшчэ студэнтаў, прапанаваў яму пісаць успаміны. Меў рацыю, бо жыццёвы шлях прафесара Б. Белаказовіча, кампетэнтнасць і грунтоўнасць яго даследаванняў – сапраўды неацэнны вопыт-скарб, якім грэх не падзяліцца. Настаў час выступіць у новым жанры – успамінах вучонага. Глыбока сімвалічна, што гэты твор пабачыў свет найперш ў славістычным бюлетэню Інстытута Усходняй Славяншчыны Вармінска-Мазурскага універсітэта ў Ольштыне, дзе прафесар Б. Белаказовіч працаваў дзесяць гадоў і ўспаміны яго, па словах праф. Валенты Пілата, уяўляюць сабой *jakiś fragment i naszej historii.* Фрагмент, які ёсць пэўным узорам мэтанакіраванасці, паслядоўнасці ў здзясненні сваіх магчымасцей. Трэба спадзявацца, што ўспаміны Б. Белаказовіча будуць працягнуты і пабачаць свет асобнаю кнігаю.

Галіна Твараповіч
Беласток

Людміла Зарэмба, *Слова ў зменлівым свеце. Літаратурна-крытычныя артыкулы*, Бібліятэка Беларускага літаратурнага аб'яднання, Беласток 2005, сс. 173

Появление любой научной работы о *Слове о полку Игореве* – это всегда ожидание нового прочтения уникального древнего памятника. Книга Людмилы Ивановны Зарембо интересна прежде всего концепцией интертекстуального анализа творчества поэтов белорусского зарубежья (преимущественно представителей польского региона) в соотнесении с традицией *Слова о полку Игореве.* Ознакомление читателя, как филолога-специалиста, так и непрофессионала-любителя, с именами Яна Чиквина, Масея Седнёва, Владимира Гайдука, их поэтическим миром, соприкоснувшимся так или иначе с древней песнью, несомненно можно назвать новым словом о *Слове...* Полезным представляется и информативный материал о генетическом и художественно-эстетическом сопоставлении *слаўнай даўніны з бягучым днём*, поскольку, как нас убеждает исследовательница, *свой эстэтычны змест Слова аб палку Ігаравым раскрывае нам вельмі ж павольна, у выніку немалых намаганняў даследчыкаў самых розных перыядаў* (16). На вопрос, какую позицию в этом процессе занимает белорусская культура, даётся однозначный ответ: *больш значную і ўплывовую, чым мы прызвычаіліся ўсведамляць* (там же).

Рецензируемая книга представляет собой сборник литературно-крити-

